Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

№ 32 (2975)
10 жніўня 1979 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Выдаецца 1932 г.
Цана 8 кап.

ПАРА ЖНІЎНАЯ...

Фота Ул. КРУКА.

ПОСТУП ТЫДНЯ

У КАМІТЭЦЕ ПА ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЯХ БССР У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ, МАСТАЦТВА І АРХІТЭКТУРЫ

Камітэт па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры прымае для разгляду творы і работы, вылучаныя на атрыманне Дзяржаўных прэмій БССР 1980 года.

На атрыманне прэмій вылучаюцца высокаідэйныя і высокамастацкія творы і работы ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры, закончаныя на працягу чатырох апошніх гадоў, што папярэднічаюць году, у якім прысуджаюцца прэміі, але не раней, чым праз паўгода пасля іх апублікавання (паказу або выканання, будавання, уводу ў эксплуатацыю).

Прапановы аб вылучэнні на атрыманне Дзяржаўных прэмій БССР твораў і работ падаюцца прэзідыумам Акадэміі навук БССР, калегіямі міністэрстваў і ведамстваў, творчымі саюзамі і таварыствамі, прэзідыумам Беларускага рэспубліканскага савета і рэспубліканскімі камітэтамі прафесіянальных саюзаў, ЦК ЛКСМБ, канструктарскімі і праектнымі арганізацыямі, навукова-даследчымі інстытутамі, навучальнымі ўстановамі, выдавецтвамі, рэдакцыйнымі калегіямі газет і часопісаў, мастацкімі саветамі тэатраў і музычных калектываў, рэспубліканскімі і абласнымі бібліятэкамі, сходамі калектываў прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, калгасаў і саўгасаў.

Дакументы прымаюцца да 1 лютага 1980 года. Адрас: 220600, ГСП, Мінск, Акадэмічная, 15а, БелСЭ, пакой 559, камітэт па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

БЕЛТА.

«СЕЛЬСКАЯ НОВЬ» №8

Чарговы нумар грамадска-палітычнага і навукова-папулярнага часопіса адкрываецца артыкулам «Сацыяльнае развіццё вёскі». Яго аўтар — кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэраў расказвае аб усебаковым прагрэсе прадукцыйных сіл сучаснай вёскі, фарміраванні новага паселішча, далейшым паляпшэнні асяроддзя, жыцця, дзейнасці, быту, усяго жыццеўпарадкавання калгаснага сялянства, аграрнага рабочага класа, сельскай інтэлігенцыі. Гэтыя пытанні з'яўляюцца цяпер прадметам асаблівых клопатаў партыйнай арганізацыі Беларусі, прычым сацыяльныя праблемы вёскі вырашаюцца ў цеснай сувязі з паскораным развіццём сельскагаспадарчай вытворчасці на базе паглыблення яе спецыялізацыі і павышэння ўзроўню канцэнтрацыі пры дапамозе міжгаспадарчага кааперавання.

Усе гэтыя ключавыя праблемы, адзначае П. М. Машэраў, мы імкнёмся вырашаць комплексна, а комплексны падыход з'яўляецца вызначальнай рысай сучаснай аграрнай палітыкі нашай партыі, асновы якой заклаў сакавіцкі (1965 года) Пленум ЦК КПСС. Іменна такі падыход дае магчымасць у духу патрабаванняў XXV з'езда партыі на практыцы забяспечыць спрыяльныя перадумовы збліжэння матэрыяльных і культурна-бытавых умоў жыцця горада і вёскі.

Велізарную значнасць гэтага важнейшага напрамку сацыяльна-эканамічнага і духоўнага прагрэсу савецкага грамадства, неабходнасць сканцэнтраваць на ім намаганні партыйных, дзяржаўных і гаспадарчых органаў падкрэсліў Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, таварыш Л. І. Брэжнеў на ліпеньскім (1978 года) Пленуме ЦК КПСС.

ВЯЛІКАЕ СВЯТА

Шырокі экран, разгорнуты на фоне зямнога шара, — эмблема Маскоўскага міжнароднага фестывалю — упрыгожыў плошчы і праспекты Масквы. З 14 па 28 жніўня ў буйнейшых кінатэатрах савецкай сталіцы ў адзінаццаты раз пройдзе гэты агляд сусветнага прагрэсіўнага кінамастацтва.

— За два дзесяцігоддзі наш фестываль заваяваў шырокую папулярнасць і аўтарытэт, а яго дэвіз «За гуманізм кінамастацтва, за мір і дружбу паміж народамі!» знайшоў актыўную падтрымку ў майстроў экрана ўсёй планеты, — сказаў карэспандэнту ТАСС старшыня Дзяржкіно СССР П. Ц. Ермаш.— Вось і на гэты раз аб сваім жаданні ўдзельнічаць у фестывалі заявілі 97 краін, а таксама ААН, ЮНЕСКА, Арганізацыя вызвалення Палесціны і патрыятычныя сілы Чылі.

Для паказу на фестывалі атрымана каля 450 фільмаў, створаных кінематаграфістамі пяці кантынентаў. Лепшыя з гэтых работ будуць прадстаўлены на трох конкурсах — поўнаметражных мастацкіх, кароткаметражных і дзіцячых фільмаў. Савецкі Саюз прадставіў на конкурс поўнаметражных мастацкіх фільмаў кінастужку «Узлёт», пастаўленую на студыі «Масфільм» рэжысёрам С. Кулішам. На двух іншых творчых спаборніцтвах будуць прадстаўлены кінатворы, знятыя майстрамі экрана Расійскай Федэрацыі, Украіны і Туркменіі. Акрамя гэтых стужак, у Дзяржаўнай цэнтральнай канцэртнай зале ўпершыню будзе паказаны фільм «Няхай жыве Мексіка!» С. Эйзенштэйна, адноўлены па матэрыялах, запісах і распрацоўках аўтара яго саратнікам, народным артыстам СССР Р. Аляксандравым.

Створаны тры міжнародныя журы, у якія ўвайшлі вядомыя майстры экрана, літаратуры, грамадскія дзеячы многіх краін. Журы конкурсу поўнаметражных мастацкіх фільмаў узначальвае рэжысёр С. Растоцкі, кароткаметражных — рэжысёр А. Згурыдзі, дзіцячых — пісьменнік А. Алексін. Лепшыя стужкі будуць адзначаны прызамі журы, а таксама шэрагу дзяржаўных і грамадскіх арганізацый.

Каля 900 зарубежных кінематаграфістаў паведамілі ўжо аб сваім жаданні прыехаць на кінафорум. Сярод іх — рэжысёры З. Фабры (Венгрыя), І. Секвенс (ЧССР), С. Рэй (Індыя), Ф. Копала (ЗША), Ф. Розі (Італія), акцёры К. Кардынале (Італія), К. Курыхара (Японія), І. Папас (Грэцыя), Б. Брыльска і Д. Альбрыхскі (ПНР). У фестывалі прыме ўдзел прадстаўнічая дэлегацыя савецкіх кінематаграфістаў на чале з рэжысёрам Л. Куліджанавым.

Гэты фестываль праводзіцца ў год 60-годдзя савецкага кіно. У сувязі з гэтай датай мы збіраемся пазнаёміць гасцей з лепшымі творамі кінематаграфіі Краіны Саветаў, якія ўвайшлі ў залаты фонд кінамастацтва XX стагоддзя. Арганізуецца таксама сімпозіум, прысвечаны ўкладу нашага шматнацыянальнага кіно ў развіццё сусветнага кінематографа. Госці змогуць пабываць на выстаўцы, разгорнутай на ВДНГ СССР, якая прысвечана шляху, пройдзенаму кінематографам Краіны Саветаў за шэсць дзесяцігоддзяў.

Акрамя праглядаў і творчых сустрэч, удзельнікаў маскоўскага агляду чакаюць паездкі на прамысловыя прадпрыемствы Масквы і ў сельскія гаспадаркі Падмаскоўя, экскурсія ў Ленінград.

П. Ц. Ермаш выказаў упэўненасць, што фестываль будзе садзейнічаць умацаванню прагрэсіўных тэндэнцый у сусветным кінамастацтве, паслужыць справе дружбы і ўзаемаразумення паміж народамі.

ТАСС.

ГАСТРОЛІ АНСАМБЛЯ

З гастрольнай паездкі па Украіне вярнуўся Ансамбль песні і танца Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі.

— Нашы канцэрты і творчыя сустрэчы, — расказвае мастацкі кіраўнік ансамбля, народны артыст РСФСР маёр Л. Б. Мураная, — праходзілі ў асноўным у сельскай мясцовасці. Паўсюдна армейскаму творчаму калектыву з Беларусі аказвалі цёплы і сардэчны прыём.

За час гастроляў ансамбль аб'ездзіў амаль усю Чарнігаўшчыну. З мастацтвам славутага калектыву пазнаёміліся тысячы гледачоў многіх гарадоў, раённых цэнтраў і вёсак вобласці.

У канцэртах выконваліся песні, літаратурна-музычныя і харэаграфічныя кампазіцыі на гераіка-патрыятычную тэму, творы, якія ўслаўляюць партыю, народ, доблесныя Узброеныя Сілы, вечную і непарушную дружбу народаў СССР і краін сацыялістычнай садружнасці. Некаторыя творы выконваліся ўпершыню. Іх развучваў калектыў незадоўга да ад'езду на гастролі.

Гледачы доўга апладзіравалі лаўрэату рэспубліканскага конкурсу савецкай песні А. Купчанку, салісту Я. Еўдакімаву, вялікі поспех спадарожнічаў вакальнаму квартэту ў саставе Р. Блонскага, Ю. Чычкова, А. Яравога і А. Мультана, а таксама танцавальнаму калектыву ансамбля.

Гастролі ансамбля супалі з нарыхтоўкай кармоў у калгасах і саўгасах Чарнігаўшчыны. І калектыў армейскіх артыстаў справай адгукнуўся на заклік абласнога ўпраўлення культуры і філармоніі аб аказанні практычнай дапамогі працаўнікам вёскі. У адным толькі калгасе імя Шчорса Любецкага раёна артысты нарыхтавалі каля 300 тон сена і галіннавага корму.

Свае выступленні ансамбль песні і танца ЧВА завяршыў у Чарнігаве. Яго заключны канцэрт у зале абласной філармоніі прайшоў на высокім ідэйна-мастацкім узроўні, з вялікім поспехам.

Я. МАЛЫ.

У НАРОДНЫМ ТЭАТРЫ

Слонімскі народны тэатр у соты раз паказаў спектакль «Паўлінка». Гэтай падзеі быў прысвечаны вечар у гарадскім Доме культуры, дзе гледачы сказалі многа добрых слоў у адрас свайго народнага тэатра, яго ўдзельнікаў.

Калектыў у гэтым годзе адзначыў сваё трыццацігоддзе. За гэты час ім пастаўлена звыш васьмідзесяці спектакляў.

«ПЕЎНІКІ» НА ЎКРАІНЕ

Злёт юных спевакоў, прысвечаны Міжнароднаму году дзіцяці і 325-годдзю ўз'яднання Украіны з Расіяй, адбыўся ў Кіеве. У яго канцэртах выступалі хоры хлопчыкаў з Масквы, Ленінграда, Вільнюса і іншых гарадоў краіны.

Беларускія песні гучалі ў Кіеве ў выкананні брэсцкага хору хлопчыкаў «Пеўнікі». Калектыў удзельнічаў таксама ў канцэрце, які трансліраваўся па ўкраінскаму радыёвяшчанню.

СТАРОНКІ, АПАЛЕНЫЯ ВАЙНОЙ

Дзяржаўны рускі драматычны тэатр імя А. Пушкіна ў сталіцы Туркменіі пазнаёміў ашхабадцаў з прэм'ерай — спектаклем, пастаўленым паводле прозы В. Быкава «Сотнікаў» і «Круглянскі мост». Сцэнічнае відовішча мае назву «Скрыжаванне». Пастаноўку ажыццявіў галоўны рэжысёр тэатра Георгій Несцер, якога мы ведаем па яго ранейшых работах на сцэне Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі (Бабруйск). Гледачы Ашхабада цёпла сустрэлі хвалюючыя старонкі мастацкага даследавання характараў і ўчынкаў людзей, яніх звёў ваенны лёс. Сярод акцёрскіх удач — выступленні ў ролях артыстаў П. Гурніцкага, Э. Лявіцкага, А. Авецісава, А. Архангельскага, В. Ісмаілавай, В. Прудчанка, Ю. Свірыдавай, Г. Абрамава, Г. Карпава. Арыгінальная сцэнаграфія заслужанага дзеяча мастацтваў Туркменскай ССР Я. Бялова. У якасці музычнага суправаджэння выбрана сімфанічная паэма сучаснага польскага кампазітара К. Пандзярэцкага «Асвенцім».

На здымку: у ролях Сотнікава і Рыбака артысты П. Гурніцкі і Э. Лявіцкі.

Тэкст А. ЛІТВІНА,
фота І. АЗАРОНКА.

НАВІНЫ МАЛОГА ЭКРАНА

«Наш савецкі лад жыцця» — пад такім дэвізам праходзіў сёлета Усесаюзны фестываль тэлевізійных фільмаў, які адбыўся ва Уладзівастоку. Удзельнікі фестывалю, якія з'ехаліся з розных кутоў нашай краіны, а таксама жыхары Прыморскага краю мелі магчымасць праглядзець 27 дакументальных фільмаў, створаных на розных студыях тэлебачання. Усе гэтыя стужкі прысвечаны тэме сучаснасці, нашаму сучасніку.

Рэдакцыя «Тэлефільм» Беларускага тэлебачання прадставіла дакументальны фільм «Дзеці Брэсцкай крэпасці» (аўтары сцэнарыя М. Бярозка і К. Славін, рэжысёр В. Жыгалка, аператар С. Фрыдлянд, рэдактар Э. Мілова). З вялікай цікавасцю сустрэты тэлегледачамі, беларускі тэлевізійны фільм, узнагароджаны спецыяльным прызам Чырванасцяжнага Ціхаакіянскага флоту і дыпломам журы фестывалю.

СУСТРЭЧА Ў САЮЗЕ ПІСЬМЕННІКАЎ

Мінск наведала пісьменніца, член камісіі па гісторыі пры Дзяржаўным Савеце Кубы, начальнік аддзела Цэнтра па вывучэнні спадчыны Хасэ Марці пры Міністэрстве культуры Нідзія Сарабія. Госця азнаёмілася з выдатнасцямі сталіцы, наведала мемарыяльны комплекс «Хатынь». У Саюзе пісьменнікаў Беларусі Нідзія Сарабія мела сяброўскую гутарку з сакратаром праўлення СП А. Вярцінскім, намеснікам старшыні Беларускага аддзялення савецка-кубінскай дружбы драматургам М. Матукоўскім і літаратурным кансультантам А. Гардзіцкім. У гутарцы прыняў таксама ўдзел намеснік начальніка ўпраўлення культурна-асветных устаноў Міністэрства культуры БССР Э. Якімовіч.

«Рэвізор» на Мадагаскары

Прэм'ера новай пастаноўкі гогалеўскага «Рэвізора» з вялікім поспехам прайшла ў сталіцы Мадагаскара. Яе ажыццявіў вядомы драматычны калектыў «Антананарыву-тэатр», створаны ў 1945 годзе пад кіраўніцтвам малагасійскага драматурга, паэта, аўтара кнігі «Мадагаскар — наш свабодны востраў» Раманды. З 1959 года групу ўзначальвае Анры Рабарындзака — адзіны акцёр-прафесіянал. Астатнія артысты, акрамя тэатра, працуюць педагогамі, перакладчыкамі, служачымі. У вольны ад работы час яны перыядычна даюць спектаклі ў клубах, навучальных установах, а часцей за ўсё ў называемым па-даўнейшаму «Муніцыпальным тэатры», цяпер Доме культуры сталічнага раёна Ісутры.

Першую пастаноўку «Рэвізора» калектыў ажыццявіў у 1975 годзе. Работа над спектаклем разам з перакладам на малагасійскую мову заняла 7 месяцаў. П'еса была горача сустрэта на Мадагаскары. «Антананарыву-тэатр» паказаў неўміручую камедыю Гогаля 32 разы, у тым ліку ў Фіянаранцуа, Анцырабе і іншых гарадах рэспублікі.

«Мы звярнуліся да вялікага твора Гогаля па дзвюх прычынах, — расказвае Анры Рабарындзака. — У «Рэвізоры» пісьменнік выкрыў тых, з кім нам і сёння даводзіцца змагацца на Мадагаскары, — хабарнікаў, бюракратаў, падхалімаў. Па-другое, малагасійскія артысты хацелі бліжэй пазнаёміць з драматургіяй іншых краін і далучыць да культуры нашых далёкіх сяброў гледачоў Мадагаскара».

У новай пастаноўцы беражліва захаваны гогалеўскі тэкст, хоць і ўнесены некаторыя «набліжэнні» да малагасійскай рэчаіснасці, ад чаго п'еса жывей успрымаецца жыхарамі Мадагаскара. Так, руская капуста заменена на любімы малагасійцамі рыс, рублі — на мясцовыя «арыяры», а фінал славутай фразы Гараднічага, якога, дарэчы, выдатна іграе сам Анры Рабарындзака, гучыць «...Да нас едзе рэвізор з Антананарыву».

В. ЯУСЕЕУ.

АПЯВАЮЧЫ МУЖНАСЦЬ

Сорак гадоў назад на экраны краіны быў выпушчаны фільм «Вогненныя гады» вытворчасці Белдзяржкіно. Твор з'яўляўся працягам творчых пошукаў выдатнага рэжысёра Уладзіміра Корш-Сабліна ў галіне эпічнага паказу мужнасці і рэвалюцыйнай адданасці змагароў за народную справу, за ленінскія ідэі. Кінаэпапея апявала гераізм абаронцаў дзяржавы працоўных ад інтэрвентаў і здраднікаў. Сцэнарый належаў пяру І. Лукоўскага і С. Наўроцкага. Музыку да фільма напісаў заслужаны дзеяч мастацтваў БССР А. Туранкоў. Сярод выканаўцаў роляў былі выдатныя майстры К. Скарабагатаў, Б. Паслаўскі, І. Пельтцар, Л. Макар'еў, А. Райкін, К. Злобін, «Спяшайцеся ўбачыць новы кінабаявік Белдзяржкіно — эпапею «Вогненныя гады»!» — такія афішы абвяшчалі аб выхадзе гэтага гісторыка-рэвалюцыйнага экраннага твора ў 1939 годзе. Ён карыстаўся вялікім поспехам у гледачоў.

Л. ВАЛІГУРА.

У РЭДАКЦЫЮ ШТОТЫДНЁВІКА «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Паважаны таварыш рэдактар, прашу праз Вашу газету перадаць шчырую ўдзячнасць арганізацыям, калегам і сябрам, якія прывіталі мяне з нагоды 60-годдзя.

Павел АХРЫМЕНКА.

ПОСТУП ТЫДНЯ

ЭТАПЫ БЕЛАРУСКАГА КІНО

За гады свайго існавання беларускі кінематограф выпусціў каля 170 мастацкіх фільмаў, сотні дакументальных, навукова-папулярных карцін, кіначасопісаў, у якіх адлюстравана біяграфія рэспублікі, яе гісторыя і сённяшні дзень. Галоўныя этапы развіцця нацыянальнага кіно знайшлі сваё адлюстраванне на фотавыстаўцы, якая адкрылася ў рэспубліканскім Доме кіно і прысвечана 60-годдзю савецкага кіно.

Адкрывае экспазіцыю фотакопія пастановы Савета Народных Камісараў Беларусі «Аб урэгуляванні кінасправы БССР» ад 17 снежня 1924 года, у якой гаворыцца аб арганізацыі Упраўлення па справах кіно (Белдзяржкіно), якое будзе «дзейнічаць на пачатках гаспадарчага разліку з правамі юрыдычнай асобы». Тут жа — партрэты заслужаных дзеячаў мастацтваў БССР А. Вольнага, Р. Кобеца, народных артыстаў СССР У. Корш-Сабліна, В. Гардзіна, пісьменніка М. Чарота, партрэты тых, хто запаўняў першыя старонкі гісторыі беларускага кіно.

Ужо праз два гады пасля пастановы на экраны выходзіць першы нацыянальны фільм «Лясная быль», у якім аўтары яго (сцэнарысты М. Чарот і Ю. Тарыч, рэжысёр Ю. Тарыч) расказалі пра адзін з эпізодаў гераічнай барацьбы беларускага народа за ўладу Саветаў.

Жыццё народа, яго клопаты і праблемы, яго гістарычнае мінулае так ці інакш знаходзяць сваё адлюстраванне ў беларускім кінематографе. У дваццатыя гады, гады першых пяцігодак выходзяць фільмы «Кастусь Каліноўскі», «Хвоі гамоняць», «Шукальнікі шчасця», «Дзяўчына спяшаецца на спатканне» і многія іншыя, кадры з якіх прадстаўлены на выстаўцы і выклікаюць сёння павышаную цікавасць у наведвальнікаў.

Многія стэнды выстаўкі прысвечаны дзейнасці беларускага кіно ў пасляваенныя гады, калі ў творчасці многіх нашых вядучых майстроў кіно знаходзіць сваё месца тэма вайны, партызанскай барацьбы ў тыле ворага. Аб гэтым — фільмы «Канстанцін Заслонаў», «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Дзяўчынка шукае бацьку», «Трэцяя ракета»...

Разам з работамі пра сённяшні дзень нашай краіны звяртаюцца да ваеннай тэматыкі і рэжысёры сярэдняга і маладзейшага пакаленняў. Экспанаты выстаўкі знаёмяць наведвальнікаў з творчасцю такіх майстроў сучаснага беларускага кіно, як В. Тураў, І. Дабралюбаў, Б. Сцяпанаў, В. Нікіфараў, В. Чацверыкоў, В. Рубінчык, М. Пташук і многіх іншых.

Прыцягвае ўвагу стэнд пад рубрыкай: «Людзі, падзеі, факты». Ён прысвечаны вялікаму атраду летапісцаў сучаснасці — беларускім кінадакументалістам. Тут кадры з ваеннай кінахронікі, зробленыя ваеннымі аператарамі І. Вейняровічам, У. Цеслюком, М. Беравым, а таксама кадры, якія расказваюць пра творчасць дакументалістаў у нашы дні.

Фотавыстаўка, якая дзейнічае ў Доме кіно, а таксама тыя выстаўкі, што адкрываюцца зараз у многіх кінатэатрах рэспублікі, дадуць магчымасць паўней пазнаць гісторыю развіцця аднаго з самых папулярных відаў савецкага мастацтва — кіно.

АБ ЧЫМ ГАМОНІЦЬ ЛЕС

Кажуць, традыцыйнасць у мастацтве даволі часта набывае якасці наватарскія. У часе адкрыцця гастрольных выступленняў бранскіх артыстаў гэтая сентэнцыя прыгадвалася міжволі. Толькі раскрыецца заслона спектакля «Рэха Бранскага лесу» — апладысменты. На сцэне — ілюзія сапраўднай пушчы. І хвоі, здаецца, гамоняць. І святло месяца прабіваецца праз гушчар, каб «выхапіць» з паўзмроку твар героя. І ўсе прыгоды персанажаў пачынаюцца з экспазіцыі, калі гледачу даецца магчымасць пазнаёміцца, як кажуць, «хто ёсць хто» — не адразу, а спакваля, прыслухоўваючыся да «другога плана», да падтэкстаў. І ў сюжэтных сітуацыях драмы, напісанай ветэранам вайны, былым партызанам С. Шаровым, дасведчаны наведвальнік тэатра пазнае штосьці вядомае нам па «Рускіх людзях» К. Сіманава, «Леначцы» Л. Лявонава, «Канстанціне Заслонаве» А. Маўзона. І гэтыя знаёмыя, зробленыя фашыстамі амаль абавязковымі ўмовы чалавечага існавання, якія называліся «новым парадкам», — не паўтарэнне аднойчы і назаўсёды асэнсаванага мастацтвам. Гэта — бранскі спектакль. Пра бранскіх партызан. Сыграны землякамі герояў мінулых баёў і паядынкаў.

Пастаўлены дваццаць гадоў назад рэжысёрам М. Ляшэнкам у сцэнаграфіі заслужанага мастака РСФСР Л. Захарава, гэты сцэнічны твор захаваў шчыры напал выканаўцаў і непасрэднасць праўдзівых драматычных калізій. Жыццёвасць і жанравая сакавітасць вылучае акцёрскія работы К. Волагдзіна (Іван Хлебаў), М. Гермацкай (Еўдакія Хлебава), В. Багатырова (іх сын Андрэй). Рамантыкай подзвігу афарбаваны характары Міхаіла Дароніна і Мікалая Рабінцава, ролі якіх так кідка і эмацыянальна маляўніча выконваюць В. Мацапура і М. Чапайкін. Прываблiваюць стрыманым тэмпераментам жаночыя вобразы — Ані і Насці Хлебавай (артысткі Н. Аляксеева і І. Хацяноўская). Да гонару рэжысуры трэба аднесці арганічнае спалучэнне ў партытуры спектакля амаль хранікальнай дакладнасці ў абмалёўцы партызанскага побыту і высокай мастацкай сімволікі. Хай асобныя моманты, асабліва ў фінальным патэтычным відовішчы, вярталі нас да паэтыкі тэатра 40—50-ых гадоў, агульнае ўражанне «Рэха Бранскага лесу» хвалюючае і незабыўнае.

Пра гэта сказаў, вітаючы гасцей на прэм'еры, Герой Савецкага Саюза Р. Мачульскі. Ён прызнаўся, што і самаму выпрабаванаму ветэрану балюча ўспамінаць трагедыйныя перажыванні ваеннай пары. Ды жыць без удзячнай памяці тым, хто адстаяў заваёвы Кастрычніка, нашу сацыялістычную Радзіму, нельга. Нашчадкі павінны ведаць і сэрцам адчуваць, якой цаной здабыты мір на зямлі, каб шанаваць спадчыну і заваёвы бацькоў і дзядоў, памнажаючы славу Бацькаўшчыны. Беларускія партызаны заўсёды былі ў курсе спраў на Браншчыне, адчувалі плячо баявых пабрацімаў. Таму спектакль Бранскага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага драматычнага тэатра закрануў у мінчан нейкія запаветныя струны, і зала азвалася гарачымі апладысментамі. У чырвані кветак, якія былі ўручаны аўтару п'есы С. Шарову і выканаўцам роляў, здавалася, зіхацелі водбліскі ваеннага полымя, а ў воплесках соцень далоняў — рэха нашай гісторыі. Зала стоячы вітала тэатр, і доўга яны стаялі так — тварам у твар — жыхары горада-героя Мінска і героі мастацкага твора аб векапомных днях Вялікай Айчыннай...

Спектаклі гасцей выклікалі шырокую цікавасць. Тэатр дае прадстаўленні ў Мінску і на сцэнічных пляцоўках раённых цэнтраў сталічнай вобласці.

К. БУЛІЧ.

На здымку: сцэна са спектакля «Рэха Бранскага лесу».

Фота Ул. КРУКА.

ВАЧАМІ СЯБРОЎ

Абагульнены вобраз беларускага народа, народа-барацьбіта і працаўніка, балгарскі пісьменнік Стэфан Паптонеў стварыў у кнізе нарысаў «Беларусь — белая балада» і паэтычным зборніку «Бярозы, я ў палоне ў вас». Выдадзеныя ў Сафіі, яны атрымалі высокую ацэнку чытачоў і крытыкі НРБ.

Лепшыя раздзелы абедзвюх кніг увайшлі ў аднатомнік «Беларусь — белая балада», выпушчаны выдавецтвам «Мастацкая літаратура». Творы балгарскага друга пераклалі на беларускую мову Рыгор Барадулін і Ванкарэм Нікіфаровіч. Гэта кніга, як падкрэсліваецца ў прадмове народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі, «з'явіцца яшчэ адным каштоўным укладам у скарбніцу неўміручай савецка-балгарскай дружбы».

БЕЛТА.

ПАМЯЦЬ БУДЗЕ ЖЫЦЬ

Тысячы рабочых, калгаснікаў, служачых, студэнтаў і школьнікаў Брэстчыны знаёмяцца зараз са шматлікімі экспанатамі перасоўнай фотавыстаўкі, якую перадалі польскія сябры мемарыяльнаму комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Выстаўка працягвае падарожнічаць па раёнах вобласці.

Многія фотадакументы, прадстаўленыя тут, вяртаюць нас у страшнае і жорсткае мінулае, якое і сёння, і яшчэ праз многа-многа гадоў будзе паліць сэрцы людзей нечуваным болем. Экспанаты, якія расказваюць пра зверствы гітлераўскіх захопнікаў у лагеры смерці Майданек, не проста хвалююць, — яны заклікаюць усіх сумленных людзей свету берагчы мір, змагацца за мір, каб не паўтарыліся Майданекі, Асвенцімы, Бухенвальды...

КАСМІЧНАЕ БРАТЭРСТВА

«Вітае вас Польшча!» — такі тытул надалі польскія кінадакументалісты аб'яднання «Чалуўка» каляровай стужцы, якая расказвае пра подзвіг экіпажа касмічнага карабля «Саюз-30» Пятра Клімука і Міраслава Гермашэўскага. Сцэнарыст-рэжысёр Багдан Свёнткевіч, аператар Мечыслаў Іваніцкі і ўся здымачная група прыклалі творчыя намаганні, каб адлюстраваць выдатнае майстэрства касманаўтаў, іх узаемапаразуменне, працавітасць і шчырую дружбу. Кінакамера зафіксавала ўрачыстую патрыятычную маніфестацыю, у якую вылілася сустрэча П. Клімука і М. Гермашэўскага на польскай зямлі, на радзіме вялікага Каперніка. Надзвычай хвалююць эпізоды фільма, дзе аднаўляюцца кадры сумеснай барацьбы савецкіх і польскіх воінаў за вызваленне еўрапейскіх краін ад фашызму. Кранае эпізод наведвання П. Клімуком упершыню ў жыцці магілы ў горадзе Радоме, дзе пахаваны яго бацька гвардыі радавы Ільля Клімук, які загінуў у баі ў 1944 годзе ў гэтых мясцінах.

Грамадскасць і крытыка ПНР адзначаюць высокія якасці здымкаў і ўмелы рэжысёрскі мантаж дакументальнай стужкі. Штотыднёвік «Экран» у № 29 піша, што фільм «Вітае вас Польшча!» — гэта хвалюючы дакумент сучаснага разумення патрыятызму і братэрства народаў.

Р. КАЛЯДА.

ВЕРШЫ ПІША КАМПАЗІТАР...

«Ранак верасовы» — так называецца гэты паэтычны зборнік, які выдавецтва «Мастацкая літаратура» адрасуе дзецям малодшага школьнага ўзросту. Кніжка як кніжка... Прыгожыя малюнкі, дасціпныя, вясёлыя вершы, што суседнічаюць з творамі больш «сур'ёзнымі». І ўсё ж яна вызначаецца сярод іншых падобных выданняў. Справа ў тым, што аўтар яе Іван Юкляеўскі — кампазітар.

Жыве Іван Мяркур'евіч на Урале, напісаў нямала песень, якія вядомы далёка за межамі роднай яму Пярмі, а вершы, калі так можна сказаць, другое захапленне сямідзесяцігадовага кампазітара. Дагэтуль І. Юкляеўскі пісаў іх больш «для сябе», а цяпер вырашыў прапанаваць дзецям.

Падрыхтаваць кніжку «Ранак верасовы» дапамог яму паэт Міхась Стрыгалёў, які адрэдагаваў творы на грамадскіх пачатках.

Бацькі І. Юкляеўскага — беларусы і на Урал пераехалі яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Сын жа назаўсёды палюбіў мілагучную і напеўную матчыну мову і піша на ёй свае вершы.

М. ГЕЛЬСКІ.

ГУЧАЦЬ МЕЛОДЫІ

Мір, дружба, яднанне — такая галоўная тэма твораў, якія прагучалі ў праграме Першага ўсесаюзнага конкурсу на лепшае выкананне песень краін сацыялістычнай садружнасці. Ён 8 жніўня завяршыўся ў Ялце. Лаўрэатам стаў малады саліст Горкаўскай філармоніі Валерый Ляонцьеў. Выпускнік Усерасійскай творчай майстэрні эстраднага мастацтва, ён уключыў у конкурсны рэпертуар песні Д. Тухманава і польскіх кампазітараў С. Краеўскага і Я. Комана. Другой прэміі ўдастоены ўкраінскія спевакі Людміла Масквіціна з Сімферопаля і Ласла Габаш з Івана-Франкоўска, трэцяй — масквіч Уладзімір Кунвенка і Кызым Каюмаў з Ташкента. Сярод вакальна-інструментальных ансамбляў, лепшым прызнаны тбіліскі калектыў «ВІА-75».

ЧАСОПІСЫ Ў ЖНІЎНІ

«ПОЛЫМЯ»

Нумар адкрываецца вершамі з новай кнігі Х. Жычкі «Абавязак». Друкуюцца таксама вершы К. Цвіркі, Я. Янішчыц, С. Шушкевіча.

Проза прадстаўлена заканчэннем рамана А. Марціновіча «Не шукай слядоў сваіх» і апавяданнем Л. Калодзежнага «Трэція пеўні».

Вершы А. Блока на беларускую мову пераклаў С. Грахоўскі.

З публіцыстычным артыкулам «Важны фронт барацьбы за камунізм» выступае Я. Бабосаў.

«Каб бачыць сонца!» — чарговая публікацыя да Міжнароднага года дзіцяці. Аўтар яе — М. Карпенка.

Публікуецца пачатак нарыса І. Дуброўскага «Буйнець коласу».

«Тэатр без заслоны» — гэты артыкул К. Кузняцовай і Н. Фральцовай прапанаваны пад рубрыкай «Мастацтва».

«Летапіс змагання» П. Зялінскага — узноўленыя старонкі заходнебеларускага друку.

У раздзеле «Крытыка і літаратуразнаўства» — артыкулы М. Смолкіна «Пра аповесці Васіля Быкава», В. Коўтун «Святло народнага слова», а таксама ўспаміны В. Віткі пра М. Лынькова «За сталом памяці».

Новыя кнігі рэцэнзуюць Н. Тулупава, М. Лазарук, А. Верабей, Н. Мацяш і Г. Напрэеў.

«МАЛАДОСЦЬ»

Багата ў нумары паэзіі. З новымі вершамі выступаюць Я. Янішчыц, М. Маляўка, Т. Бондар, Н. Гальпяровіч, А. Ставер і С. Панізнік.

Друкуюцца апавяданні У. Саламахі і І. Кірэйчыка, працяг рамана У. Караткевіча «Чорны замак Альшанскі».

З першым сакратаром Вілейскага гаркома партыі В. Булгакам гутарыць В. Жарыкаў.

Змешчаны нарыс М. Рылко «Кіламетры мужнасці», праблемны артыкул Д. Манаевай «Ці цяжка стаць настаўнікам?».

Уражаннямі аб VII Усесаюзнай нарадзе маладых пісьменнікаў дзеляцца яе ўдзельнікі К. Жук, С. Законнікаў, М. Кацюшэнка, В. Коўтун і іншыя.

Я. Брыль успамінае пра І. Мележа — «Хоць і не ўсё...», Т. Мушынская піша пра балерыну Н. Паўлаву — «Вядзе чалавека мара», Я. Шпакоўскі — пра паэтэсу Р. Баравікову — «Гарачы подых пачуцця», рэцэнзуецца кніга В. Казько «Суд у Слабадзе».

Чытач пазнаёміцца таксама з выступленнем намесніка старшыні Дзяржаўнага камітэта па фізкультуры і спорце пры Савеце Міністраў БССР В. Пуцькова «Кроч, Спартакіяда!», нататкамі В. Целеша «Старыя паштоўкі» і іншымі матэрыяламі.

«БЕЛАРУСЬ»

На першых старонках змешчаны нарыс Я. Радкевіча «Імя высокае — хлеб», падборкі «Хада падзей» і «Будзень рэспублікі».

З літаратурных матэрыялаў друкуюцца вершы П. Пранузы, А. Вераб'я, М. Мятліцкага, С. Пацёмкіна, М. Сабалеўскага, А. Пісарыка, А. Ставера, апавяданне М. Гарулёва «Вяртанне».

З нарысам «Сіла залатога коласа» выступае М. Пятровіч.

«Ці шмат чалавеку трэба?» — так называецца гутарка, якую з прафесарам БДУ імя У. І. Леніна, доктарам філасофскіх навук Г. Давідзюком вядзе рэдактар аддзела публіцыстыкі часопіса «Беларусь» пісьменнік А. Шаўня. Матэрыял змешчаны пад рубрыкай «Дыялогі аб маралі».

Ёсць у нумары рубрыкі «У фотааб'ектыве — час», «Бацькі і дзеці», «Закон: правы і абавязкі».

«Зямныя арбіты «Саюза—9» — фотарэпартаж І. Калюты і В. Жука пра адзін з фізкультурна-спартыўных клубаў Мінска.

Новыя кнігі рэцэнзуюць Я. Хвалей, Ю. Свірка, А. Сачанка, А. Васільеў.

«НЕМАН»

Падборку твораў Я. Сіпакова «Шчодрая радасць» на рускую мову пераклаў А. Мікалаеў. Паэзія прадстаўлена таксама вершамі А. Ставера (пераклад Ф. Яфімава) і І. Бурсава.

З празаічных твораў чытач пазнаёміцца з апавяданнямі М. Зарэцкага (пераклад А. Барушкі), С. Кухарава (пераклад І. Клімашэўскай), В. Добкіна, а таксама з заканчэннем рамана У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха».

Праблемам сучаснай школы і выхавання падрастаючага пакалення прысвечаны артыкулы рэктара Мазырскага педагагічнага інстытута імя Н. Крупскай М. Дзмітрыева і дырэктара Ведрыцкай сярэдняй школы Рэчыцкага раёна У. Верамейчыка.

Пад рубрыкай «Запіскі, успаміны, дакументы» змешчана дакументальная аповесць Р. Ярохіна «Дзяўчаткі нашы за Вердэнам».

Штрыхі да творчага партрэта артыста П. Кармуніна напісала Л. Фёдарава — «...Даводзіць пачуцці да ўзрыву». Т. Калугіна расказвае аб сустрэчах са Святаславам Рэрыхам, сынам вядомага мастака.

Кнігі І. Чыгрынава «За сто кіламетраў на абед» і А. Карпюка «За кветкай папараці» рэцэнзуюць А. Лысенка і С. Лакішык.

НАДЗЕЙНАЯ СТАЛЬ

КАЛЯ ПРАХАДНОЙ мы ўліліся ў густы людскі паток, які хутка вынес нас на заводскую тэрыторыю. Там паток як бы разгаліноўваўся на паасобныя струмені. Адзін з іх падхапіў нас—і вось мы ўжо ў сталеліцейным. Я іду ўслед за брыгадзірам сталявараў Георгіем Іосіфавічам Шышко, кідаю насцярожана-разгублены позірк то направа, то налева, раз-пораз азіраюся—мне ўсё здаецца, што зусім побач тоіцца небяспека — так шмат вакол розных металічных канструкцый, рухомых і нерухомых механізмаў. Вочы слепяць матава-пунсовыя водбліскі плавак, слых прытупляе магутная сімфонія гукаў.

...Плавільны сустрэў нас гарачым дыханнем. Восем палаючых печаў выстраіліся, як на лінейцы—чакаюць другую змену. Шостую печ прымаў у Мікалая Арцюша Георгій Іосіфавіч. Сталявары зазіралі праз цёмныя шкельцы акуляраў у вогненнае чэрава і нешта тлумачылі адзін аднаму. Слоў нельга было разабраць. Не стрываў — глянуў, стаўшы побач са сталяварамі, праз адкрытае акенца ў печ і я. Што там тварылася? Агніста-белая лава булькала, варочалася, шыпела, булькала ўгору каскадам буйных, прамяністых пырскаў. Дыхала, па-драпежніцку захліпаючыся, раскаленая печ, цяжка было адчуваць сябе тут упэўненым, не разгубіцца.

«Сталяварамі не нараджаюцца, сталяварамі становяцца»,— нібы адгадаўшы мае думкі, пракрычаў мне ў вуха брыгадзір.

Я ведаў, што так можна было б сказаць і пра яго.

Дваццаць тры гады назад узнікла жаданне ў Георгія Шышко стаць сталяварам. Узнікла нечакана. Пасля службы ў арміі дачуўся юнак, што на Мінскім трактарным будуецца сталеліцейны цэх. Заманліва, падалося: чаму б не паспрабаваць сябе ў новай, незвычайнай прафесіі? У аддзеле кадраў, прыдзірліва змерыўшы хударлявую фігуру хлопца, запярэчылі: «Хочаш на электрыка вучыцца, калі ласка, а на сталявара?.. Не кожнаму гэта пад сілу». Але Георгій стаяў на сваім...

Семдзесят чалавек накіравалі на Харкаўскі трактарны вучыцца варыць сталь. У тым ліку і Георгія. Паставілі падручным да Анатоля Міхайлавіча Новікава. Прывёў ён хлопца ў сталеліцейны, паставіў каля плавільнай печы — назірай, маўляў, пакуль што, прыглядайся, а тлумачэнні будуць потым. Куды ні кіне позірк хлопец — полымя, іскры гудуць роем, шыпіць гарачы метал. А печ, здаецца яму, вось-вось скалане магутны выбух—столькі ў ёй сабралася энергіі! Хочацца збегчы адсюль, схавацца дзе-небудзь у зацішку, перачакаць. Ледзь вытрымаў да канца змены.

«Малайчына, — пахваліў у думках хлопца Анатоль Міхайлавіч, — выстаяў. Значыць, не слабак. Быць табе сталяварам. Першы крок — ужо дарога». Ведаў Новікаў, чаго каштавала хлопцу выстаяць змену, ды толькі выгляду не падаў.

На наступны дзень Георгій адчуў сябе больш упэўнена, а яшчэ праз некалькі дзён і зусім асвойтаўся. Нават жартаваць пачаў сам з сябе за свой былы страх. Смела паварочваўся тварам да агню, да расталенага металу. Ні на крок не адступаў ад Новікава. Цікаваў за кожным яго рухам. І ўсё заўважаў. І як сталь падагрэць, калі плаўка халодная, і як плаўку прытрымаць, каб не сутыкнуцца ў час разліўкі з другім сталяварам, або паскорыць, пакуль разліўшчык не заняты. Засыпаў настаўніка пытаннямі і радаваўся, калі ўдавалася зразумець яго тлумачэнні з першага разу.

Шэсць месяцаў прабеглі хутка. Чаму навучыўся, хлопец зразумеў пасля, калі пачаў самастойна весці плаўку. Не адзін раз добрым словам успомніў ён свайго першага настаўніка. Але вучыцца не пакідаў. Вечарамі падоўгу праседжваў над падручнікамі — хацелася набыць трывалыя тэарэтычныя веды: хутчэй прымяніць іх на практыцы. Нялёгка давалася майстэрства, не адразу прыйшоў вопыт...

Брыгада Георгія Іосіфавіча лічыцца скразной. Усе шэсць чалавек — трое сталявараў і трое падручных — працуюць па адным нарадзе. А раней як было: закончыць сталявар плаўку мінут за трыццаць да канца змены, а новую пачынаць не спяшаецца. Навошта, калі не паспее закончыць? Прастойвала абсталяванне, ахалоджвалася печ, зацягвалася перазменка. Цяпер жа шостая печ пераходзіць з рук у рукі гарачай, зменшчык не траціць марна часу — з ходу ўключаецца ў работу, працягвае пачатую плаўку.

Вось і зараз Георгій Іосіфавіч зліваe сталь, якую ён даварыў, змяніўшы Арцюша. Сталь бяжыць, бяжыць вогненным ручайком у коўш, слепячы вочы то матавым, то аранжавым, то асляпляльна - блакітным колерам. Кранаўшчыца, маладзенькая дзяўчына, весела ўсміхаецца Шышко.

«Зноў з апярэджаннем, — гаворыць выраз яе твару. — Віншую, віншую!».

Шышко ў адказ размашыстым жэстам рук чынна паказвае: «Коўш паўнюткі! Прымай!». Кранаўшчыца з той жа вясёлай усмешкай падхапіла коўш і панесла, панесла яго на суседні ўчастак да разліўшчыка. Той адразу ж пачынае разліваць сталь у формы, замацаваныя ў гнёздах рухомага кругавога канвеера. І паплывуць далей апокі з астылымі адліўкамі.

Спяшаецца Шышко. На ўліку кожная хвіліна. Бярэ шуфель, каб падкінуць пяску на падзіну печы, а яго падручны Юрый Галікаў ідзе на шыхтавы двор. Хутка адтуль прыбывае бодня з шыхтай. Кран падхоплівае яе і апаражняе над ваннай. Ледзь толькі ён адплывае — паяўляецца другі з пяцітоннай «бабай» для трамбоўкі шыхты. Дакладнасць работы падручнага дазволіла сталявару загрузіць печ за пяць мінут замест адпушчаных дзесяці.

На плаўку па тэхналогіі патрабуецца 70 мінут. У шостай печы гэтая аперацыя цягнецца не больш чым гадзіну. Зноў эканомія часу. Нездарма Георгія Іосіфавіча называюць майстрам хуткай плаўкі.

Распаленыя электроды павольна апускаюцца ў ванну з металам. Момант рашаючы. Прыборы, устаноўленыя на пульце, даюць дастатковае ўяўленне пра тое, што адбываецца ў чэраве печы. Самы час фарміраваць плаўку. Шышко ўключае трансфарматар на поўную магутнасць. Зараўло, шуганула напорыста ўверх, агінаючы электроды, полымя агню. У паветры павісла шэрапеністае дымнае воблака. Печ пранізліва застагнала, завохкала.

Высокая тэмпература—гэта жаданая хуткасць. Але яе трэба выкарыстоўваць асцярожна, умела, некалькі мінут — ні больш ні менш за норму. А вызначыць яе не так проста. Тут трэба асаблівая чуйнасць. Выгарае марганец, вуглярод, аднаўляецца крэмній. І трэба ўгадаць той рубеж, за якім пачынаецца рэгуляванне іх дазіровак, і паніжаць адпаведна напружанне. Твар Шышко пакрываецца буйнымі кроплямі поту. Ён змахвае яго ўжо добра змакрэлай хусцінкай, нахіляецца каля печы, зазірае ў яе чэрава. Там ён бачыць для сябе нешта такое, чаго неспрактыкаванаму воку ніколі не ўбачыць. Выпроставецца павольна — значыць, можна крыху счакаць. Печ будзе працаваць пакуль што на зададзеным рэжыме. Паварочваецца, прыўзнімае кепку, калматыя бровы — уразлёт, твар разгладжваецца, мякчэе, вочы адпачываюць.

Але вось у печы пачынаецца працэс акіслення і аднаўлення металу, ад якога шмат у чым залежыць якасць будучай сталі. Метал перамешваецца, бярэцца проба на экспрэс-аналіз. Шышко не чакае, пакуль яму паведамяць вынік аналізу з хімічнай лабараторыі. На паверхні расплаўленага металу ён заўважае нешта падобнае на густа пераплеценае павуцінне. Гэта прыкмета таго, што ў плаўцы лішкі марганцу. Яго трэба давесці да нормы. Хутчэй за справу...

Калі вынік аналізу паступіў з лабараторыі, ён пацвердзіў тое ж самае—у метале лішкі марганцу. Але справа ўжо зроблена. Цяпер яго засталося роўна столькі, колькі патрэбна — сталявар спадзяецца на свой вопыт.

У канцы так званага аднаўленчага перыяду сталь правяраецца на вуглярод. Пакуль робяць аналіз, Георгій Іосіфавіч рыхтуе печ да выпуску сталі. Ён ужо інтуітыўна ведае, што вуглероду ў метале якраз столькі, колькі трэба. Зноў рызыка? Як сказаць! Вопыт і майстэрства, а не рызыка. Калі сталь злілі ў коўш і праверылі на якасць—яна аказалася выдатнай. Такім чынам Георгій Іосіфавіч прыплюсаваў да сэканомленага часу яшчэ дванаццаць мінут. А гэта—дадатковыя тоны сталі.

Завіхаючыся каля печы, Георгій Іосіфавіч заўважыў, як некалькі разоў наважваўся падысці да яго сталявар Іван Жытко. «Няйнакш сорам чалавека стрымлівае», — падумаў Шышко і ўжо без ранейшай крыўды прыгадаў размову з майстрам змены Мікалаем Аляксеевічам Карніцкім.

— Калі не памыляюся, Георгій Іосіфавіч, праз два дні пачынаецца твой адпачынак. Рады, што менавіта цябе прэміравалі бясплатнай пуцёўкай на падарожжа па замежных краінах. Ты яе сумленна заслужыў. Усе так лічаць, акрамя... Прызнацца, не хацелася мне табе пра гэта расказваць напярэдадні твайго адпачынку. Ды, падумаў, не па-сяброўску атрымаецца. Паверыш, учора Жытко мне заявіў, што трансфарматар на тваёй печы магутнейшы, чым на іншых, таму ты і дамагаешся такіх высокіх рэкордаў. З ім, канечне, ніхто не пагадзіўся...

— Жытко, кажаш? Я цябе, Мікалай Аляксеевіч, вось аб чым папрасіў бы. Няхай ён, пакуль я буду ў адпачынку, папрацуе на маёй печы. Зрабі ласку...

Жытко ўрэшце падышоў.

— Прабач, — глухаватым голасам папрасіў ён.

Шышко скупа ўсміхнуўся, потым як бы між іншым спытаў:

— Як працавалася на маёй печы?

— Сорам прызнацца, Георгій Іосіфавіч. Стараўся з усіх сіл, а да твайго рэкорду не дацягнуў.

— І трансфарматар не дапамог?

— Не дапамог, — усміхнуўся Жытко. — Не крыўдуеш?

— Было, крыўдаваў. А цяпер, бачу, ты сам разумееш, чаго табе не хапае. Слухай, — нечакана весела прапанаваў Георгій Іосіфавіч, — хочаш, падвучу цябе?

— Я ж з другой брыгады! Якая табе карысць?

— Дзівак, чалавек!

Вопыт Шышко стаў набыткам іншых членаў брыгады. Хуткасць і якасць—стыль работы Уладзіміра Мухамендрыкава і Мікалая Арцюша, якія сталі сталяварамі высокага класа. Абодва яны—былыя падручныя Георгія Іосіфавіча, а зараз мала ў чым уступаюць яму. Шэсць месяцаў запар брыгада перамагала ў сацыялістычным спаборніцтве. Неаднаразова лепшымі па прафесіі называліся Георгій Шышко, Уладзімір Мухамендрыкаў, Мікалай Арцюш. Іх зараз называюць не інакш, як пераможнай тройкай.

Трактарабудаўнікі добра разумеюць, як гэта важна—даць у рукі земляробаў надзейную і высокапрадукцыйную тэхніку. Разумее гэта і Георгій Іосіфавіч Шышко. Ён таксама працуе з думай пра поле. Калі прыязджае ў родную вёску Шэні, што ў Пружанскім раёне, яму прыемна чуць ад землякоў добрыя словы пра трактар «Беларусь». Бо ёсць у ім і тая сталь, якую варыць ён—камуніст, ветэран сталеліцейнай вытворчасці, кавалер трох ордэнаў. Надзейная сталь!

П. САБІНА.

На пагрузачнай пляцоўцы МТЗ.

Фота А. КАЛЯДЫ.

СУД ПАМЯЦІ

Разважаючы над тым, як пачаць гаворку пра новую кнігу Віктара Казько «Суд у Слабадзе», хутка вызначыць у ёй самае істотнае і галоўнае, міжволі ловіш сябе на жаданні паддацца логіцы аўтарскіх разважанняў. Аднайменная аповесць, якая адкрывае зборнік, пачынаецца са знаёмства з не галоўным героем Колькам Лецечкам, выхаванцам Слабадзянскага дзіцячага дома, са знаёмства, што адбываецца на фоне сонечнай летняй раніцы:

«Неба плавілася. Неба гарэла і палала. Рушылася сонца. Агонь і спёка цяклі на зямлю, і вось агонь і спёка дасягнулі зямлі.

А сонца ляжала ў сажалцы, ля ног Лецечкі. Сонца купалася, умывалася вадой. І сажалка была ўся ружовая і прамяніста-залатая, аголеная...»

Заканчваецца твор апошняй сустрэчай з хлопчыкам. Зноў жа — сонечны, празрысты ранак:

«І памёр Колька Лецечка... на ўсходзе сонца. Калі дзетдом яшчэ спаў. Калі спаў яшчэ горад... У акно шэранню і чырванню зазіраў золак. У Лецечкі яшчэ хапіла сілы непаслухмянымі рукамі адчыніць дзверы і выйсці на ганак і там, на ганку, убачыць, як плавіцца, гарыць і палае неба, рушыцца сонца, надломваецца пластамі і пякуча навальваецца на парныя ўжо ад спёкі просіні».

Міжволі задумваешся: чаму вобраз дзіцяці і сонца займае такое значнае месца не толькі ў кнізе майго равесніка, а і ва ўсёй сучаснай савецкай прозе? Чаму ў творчасці тых, хто прыйшоў у літаратуру ў 60-ыя гады, матыў незваротнасці дзяцінства гучыць усё часцей і часцей і з такім непрытоеным болем? Відаць, таму, што крыніца гэтага болю — вайна, якая прайшлася па жыцці не толькі салдат, але і дзяцей.

Аповесць «Суд у Слабадзе» вяртае яшчэ раз нас да незабыўных падзей, да жахаў вайны, народнага гора, што раскрываюцца праз успрыманне падлетка-дзетдомаўца Колькі Лецечкі. І хоць аўтар даволі скупа расказвае аб яго жыцці ў час фашысцкай навалы (бацькі загінулі, сам Лецечка трапляе ў канцэнтрацыйны лагер, дзе ў іх, дзяцей, бралі кроў для фашысцкіх салдат і афіцэраў), але і гэтыя нешматлікія сцэны даволі пераканаўча напамінаюць аб тым, што перажылі яны, дачасна пасталелыя дзеці ваеннай пары. Адзін толькі Лецечка перажыў такое, чаго хапіла б на некалькі жыццяў. Памятае Колька «агромністыя, пад самае неба, штабелі сініх цел. І сярод гэтых штабеляў ён, Лецечка — голы, сіні, але жывы». Памятае, як «ад поезда, ад Рудабелкі, везлі людзей на машынах. Хворыя, абмарожаныя. Жахлівае відовішча... Машын на ўсіх не хапала. Ішлі пешшу. Падалі—прыстрэльвалі... На некалькі кіламетраў нагі не ўбіць — трупы, трупы...» Памятае, як кінулі яго, Лецечку, на стол, як пачалі выкручваць рукі і ногі, як бралі з яго маленькага цела гарачую чырвоную кроў, якую можна было «затапіць, запаліць увесь свет, ёю можна было захлынуцца ўсяму свету».

Гэта —вайна, вайна без лініі фронту, вайна вачамі падлеткаў, і таму яшчэ больш жудасная і страшная.

Пісьменнік па-мастацку пераканаўча і аб'ектыўна паказвае, як доўга і часам пакутліва жыве памяць вайны ў набалелых чалавечых сэрцах. Лецечка нічога не хоча забываць, гэтаксама як і дараваць забойцам. Суд над былымі паліцаямі — гэта і суд, які вершыць Колька. На дзіва цвяроза глядзіць ён у залу: «Паліцэйскіх было чалавек дзесяць. Лецечка пабаяўся палічыць, колькі іх дакладна: жахліва лічыць нябожчыкаў, мерцвякоў... Як здолее зямля спакойна прымаць усіх, як яна, не скалануўшыся нават, можа прыняць гэтых мерцвякоў... Што ж такое чалавек, ці ёсць мяжа яго брыдотам і мярзотнасцям? Як гэта магчыма: сёння, як і усе, п'е малако маці, а заўтра раздзявае маці, спакойна страляе ў чалавека, які нарадзіў яго...»

Так нечакана падзеі 35-гадовай даўнасці набываюць у аповесці надзвычай сучаснае гучанне і перарастаюць у своеасаблівы суд людской памяці, суд чалавечнасці. Менавіта яна, ПАМЯЦЬ, стала ў творы актыўнай, а магчыма, і галоўнай дзеючай асобай. Памяць-запавет перадаюць нам героі В. Казько, памяць-абавязак; памяць-суд праследуе забойцаў, здраднікаў народа. Аўтар прама перасцерагае нас ад забыцця і даравання, становячыся суровым абвінаваўцам.

Цікавае і апавяданне «Цвіце на Палессі груша», паэтычная атмасфера якога цесна звязана з прыродай, што не толькі прысутнічае як фон ці мікраасяроддзе, а выступае бы жывая асоба. І канава, і сажалка, і рака, і лес, і зацвітаючая груша, і возера, у якім разводзяць карпаў, — усё гэта даволі актыўна ўдзельнічае ў руху сюжэта і ў сістэме чалавечых узаемаадносін, займаючы вялікае (калі не вызначальнае) месца ва ўнутраным свеце галоўнага героя Яўмена Ярыгі.

Праўда, спачатку ўзнікае такое адчуванне, быццам асобныя часткі і эпізоды твора мала звязаны між сабой або нават зусім не звязаны. Але далей учытваешся ў апавяданне, тым больш пачынаеш адчуваць унутраную, арганічную сувязь паміж эпізодамі, знітаванымі адзінствам аўтарскай гуманістычнай канцэпцыі, аўтарскім поглядам на падзеі і героя.

Але, разам з тым, апавяданне гэтае не столькі аб ахове безабароннай прыроды, сапраўды чалавечых адносін да яе (хоць і гэтая праблема ўвесь час у цэнтры ўвагі аўтара, як актуальная праблема сучаснасці), колькі ізноў аб трывожнай памяці вайны. Хто павінен у тым, што Яўмен нарадзіўся нямым? Якая існуе ўзаемасувязь паміж віной і бядой яго маці, што нараджае нямых дзяцей? «Хіба ж гэта хто здольны пражыць жытку на зямлі і не пусціць караня, не даць парасткаў? Але што яна магла нарадзіць пасля таго, што ёй выпала, пасля таго, праз што яна прайшла. Яна ж і сама знямела пасля той вайны, пасля таго, як яе тры гады расстрэльвалі, палілі, выпалілі ўсё нутро. Як выжыла, і сама не ведае».

І ў гэтым творы аўтар пасвойму перажыў мінулае, і менавіта ў гэтым перажыванні (а не проста ў канстатацыі) засвоіў ісціну, што аб'ектыўна вайну можна асэнсаваць не праз смерць, а толькі праз жыццё. Паступова падыходзіць ён да спасціжэння праўды народнага жыцця, пераўтвараючыся з даследчыка ваеннай тэмы ў абаронцу пакалечаных маці і іх знявечаных дзяцей.

У наступным апавяданні «Літары на мармуры» матыў разбуранага і знявечанага чалавечага шчасця і надзей гучыць некалькі мацней, чым матыў жыцця. Аднак думка аб перамозе яго над смерцю, аб бессмяротнасці чалавечай працы застаецца дамінуючай, дзякуючы таму, што твор аб лёсе і пакутах старога Рыгора Вечкі, які страціў у вайну жонку і сына, стаў творам аб лёсе і мужнасці ўсяго народа.

Рыгор і яго другая жонка, з якой ён пражыў ужо каля 30 гадоў, вартая павагі, бо, нягледзячы на страчаную веру, на вялікае гора, знаходзяць у сабе сілы дараваць другім жыццё і радасць. Колькі часу ўжо мінула, а не забыў Рыгор першую жонку, помнік ёй заказаў, разам з сынамі едзе ў вёску, дзе пахаваны яны, яго родныя. Усяго некалькі гадзін да іх, але памяць мужа, які шукае на запушчаных лясных неабгароджаных могілках магілу жонкі, праходзіць за гэты час нялёгкімі дарогамі дзесяцігоддзяў, дарогай усяго жыцця. І сыну, які нарадзіўся ад другой жонкі і які не ведаў вайны, «здалося, што стаіць не летні мірны і цёплы дзень, а зноў студзень, той далёкі студзень 1944 года, і не помнік ставяць яны на даўняй магілцы, а толькі што выкапалі гэтую магілку, толькі што спусцілі ў яе труну».

З выключным майстэрствам, шчырасцю і глыбінёй пранікае В. Казько ў псіхалогію сваіх герояў. Пры гэтым у якасці галоўнага сродку раскрыцця іх думак і пачуццяў і ў аповесці, і ў апавяданнях выступаюць унутраны маналог і няўласна-простая мова. Назіраючы за героямі ў такія хвіліны, калі яны, як кажуць, застаюцца сам-насам са сваёй бядой, сваімі думкамі і пачуццямі, аўтар быццам пранікае ў «святая святых» свядомасці чалавека. І маналогі-ўспаміны Лецечкі, і роздумы-споведзь нямога Яўмена, і размова-прызнанне старога Рыгора перадаюцца пісьменнікам у форме першай-трэцяй асобы, калі гэтае «я» і «ён» пераплятаюцца, суіснуюць разам, дзякуючы чаму адбываецца «аб'ектывацыя» ад героя яго пачуццяў і думак і перавод іх у больш шырокі філасофскі план. Менавіта такі псіхалагічны аналіз, які быццам падводзіць вынік роздумам героя ў форме сцвярджэння ці адмаўлення, неяк непрыкметна выводзіць яго ў свет, уключае ў шырокія сувязі з рэчаіснасцю, у спрэчку з жыццём.

У новым зборніку адчувальна цесная сувязь В. Казько з жыццём вёскі, з прыродай і побытам Палесся, якія вызначаюць настрой герояў, іх перажыванні і светаадчуванні. Адметнасць пісьменніцкага стылю аўтара, яго індывідуальны почырк яскрава выявіліся і ў тым глыбокім лірызме, якім прасякнута кніга, і ў багацці яе моўнай палітры, умелае карыстанне якою дало магчымасць пераканаўча і проста, эмацыянальна глыбока і праўдзіва адлюстраваць рэчаіснасць, узнавіць складаныя перажыванні і пачуцці герояў.

Закрываючы апошнюю старонку зборніка, адчуваеш, як многа цікавага і хвалюючага адкрылася табе ў ім. Асвятляючы пэўны этап народнага жыцця не толькі водсветам вайны, але і сонечным святлом чалавечага абуджэння, святлом вялікіх надзей, пісьменнік стварыў гуманістычную песню аб прыгажосці савецкіх людзей, аб памяці сэрца, памяці перажытага.

«Людзі! Людзі! Беражыце, людзі, Сонца!» Звернутыя да сучаснікаў, да нашай моладзі, словы гэтыя, выказаныя Колькам Лецечкам, гучаць пераканаўчым, палымяным заклікам. Чалавек прыходзіць на зямлю, каб жыць па яе законах, быць свабодным, дарыць жыццё, тварыць дабро чысцінёй сваёй душы і светлымі справамі рук сваіх.

Валянціна СМЫКОЎСКАЯ.
г. Гомель.

В. Казько. Суд у Слабадзе. Аповесць і апавяданні. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1978.

ДОБРАЯ, БЯСКОНЦАЯ ДАРОГА

Апавяданні і аповесці, якія склалі змест двухтомніка Яўгена Васілёнка, што выйшаў праз некалькі гадоў пасля заўчаснай смерці празаіка, даюць правільнае ўяўленне аб творчым абліччы пісьменніка, аб тэматычным дыяпазоне яго мастацкіх інтарэсаў, яскрава вызначаюць галоўныя рысы яго эстэтычнага ідэалу, акрэсленага вельмі выразна, і асаблівасці яго ўвасаблення.

На працягу ўсёй творчай дзейнасці ў цэнтры ўвагі Я. Васілёнка быў радавы савецкі чалавек, звычайна някідкай, але вельмі неабходнай прафесіі: работніца пошты ці ашчаднай касы, трактарыст, токар, электразваршчык, а часцей за ўсё — прадстаўнікі чыгуначных прафесій, пастаяннай любові пісьменніка: ад пуцявога абходчыка да касіркі дэпоўскай сталоўкі і да машыніста паравоза альбо цеплавоза. Веліч пвўсядзённых спраў гэтых людзей, прыгажосць іх духоўнага жыцця, высакароднасць памкненняў аўтар заўсёды імкнуўся выявіць пераважна ў сферы працоўнай дзейнасці. Менавіта ў гэтым — асноўны сэнс і пафас творчасці пісьменніка, які нямала зрабіў у мастацкай распрацоўцы і асваенні так званай «вытворчай тэмы».

Для герояў Я. Васілёнка справа, якой яны служаць, праца з'яўляюцца вышэйшым крытэрыем чалавечых якасцей, духоўнай прыгажосці. У час выканання службовых абавязкаў людзі гэтыя раскрываюць свае характары, праяўляюць вытрымку, мужнасць, упартасць, сумленнасць, шчодрасць сэрцаў і дбайную чуласць у адносінах да іншых. Праз выяўленне сваёй асобы ў працы яны сцвярджаюць сваю чалавечую годнасць і дабіваюцца права на асабістае шчасце, на каханне («Сартавальная горка», «Будзьце знаёмы», «Туманнай раніцай», «Канец Белай магілы»).

Станоўчы герой пісьменніка не ведае ўнутраных кампрамісаў, нягледзячы на ваганні, нават у дробязях. Глыбока чалавечны па сваёй сутнасці, ён не паддаецца мінутнай слабасці, застаючыся ў любых абставінах чалавекам, праносячы чыстым сваё каханне, як, напрыклад, у апавяданні «У незнаёмым горадзе». Герой жа другога твора — «Успамін на вяселлі» — не пажадаў у лютую ваенную зіму ўкрасці два боханы хлеба, каб заплаціць спекулянту, прыстасаванцу за падвойную аконную раму (хаця такая мажлівасць была), хоць потым у халодным барачным пакойчыку і памерла ягоная хворая жонка.

Я. Васілёнак сваёй творчасцю сцвярджае, што самае нязначнае адступленне хоць адзін раз ад маральных норм сацыялістычнага ўкладу жыцця можа прывесці да душэўнай спустошанасці («Слота») і нават да здрады Радзіме («Вячэрняя размова», «Адзіночная камера»). Таму ён з вялікай любоўю малюе характары людзей, што без гучных слоў, сціпла робяць сваю справу і, аддаючы цеплыню сэрцаў і шчодрасць рук сваіх людзям, ззяюць непрыкметным сваім унутраным хараством («Нараджэнне чалавека», «Тэлеграма», «Семсот дваццаты кіламетр», «Дзяўчына і стэп», «Белы капялюшык», «Таццяна Ларына», «Звычайная ноч»). І з непрымірымасцю, нянавісцю ставіцца да ўсіх прыкрых праяў адмоўнага ў жыцці, у першую чаргу да мяшчанства, абыякавасці, духоўнай раўнадушнасці і заскарузласці («Сакрэт», «Сітуацыя»), карыстаючыся для выкрыцця агіднасці індывідуалістычных поглядаў і жыццёвых прынцыпаў шырокай палітрай мастацкіх сродкаў ад гумару («Не ашукай сябе») да з'едлівай сатыры («Госці»).

Рамантыка як мастацкі сродак дапамагла яму больш выразна акрэсліць грыгожае ў паўсядзённай прозе жыцця, вылучыць яго з прывычна-шэрай будзённасці, не супрацьпастаўляючы адно аднаму, а паказваючы яго непадзельнасць, узаемаабумоўленасць. Такое імкненне ўбачыць і перадаць звычайнае як незвычайнае ўласціва рамантычнаўзнёсламу светаўспрыняццю не аднаго савецкага пісьменніка і вынікае, перш за ўсё, з сутнасці самой сацыялістычнай рэчаіснасці. Асвятляючы магічным святлом звычайнае, як бы выхопліваючы з паўсядзённасці цудоўныя рухі чалавечай душы, за сціпласцю адшукваючы шчырую любоў да жыцця, да людзей, яна не парушае агульнага рэалістычнага адлюстравання рэчаіснасці, пакідае прыгожае ў гушчы штодзённага побыту і спраў і разам з тым дапамагае пісьменніку актыўна сцвярджаць свае грамадска-этычныя і эстэтычныя ідэалы.

У адным з апавяданняў Я. Васілёнка «Забыты вензель» стары пуцявы абходчык гаворыць: «Так і трэба; калі сам выправіўся ў дарогу, дык і другіх заві. Калі ў добрую, вядома, дарогу. Заві і вядзі!». Словы гэтыя поўнасцю стасуюцца да самога аўтара. Бо менавіта так рабіў ён у сваім жыцці, творчасці, у меру свайго таленту і сіл аздабляючы жыццё светлым роздумам аб чалавеку і супярэчнасцях яго існавання, клічачы чытача ў «добрую дарогу».

Эдуард САДАЎНІЧЫ.

Я. Васілёнак. Збор твораў у двух тамах. Мінск, «Мастацкая літаратура».

КНІГАПІС

Е. ЛОСЬ. Птушка шчасця. Вершы і паэмы. Аўтарызаваны пераклад з беларускай С. Кузняцовай. М., «Советский писатель», 1979.

Яна вельмі любіла паэзію. Не менш — жыццё. Таму і ўся творчасць яе такая жыццярадасная і аптымістычная, светлая і мілагучная па сваім гучанні. Яе лепшыя вершы — гэта выяўленне душы лірычнай гераіні, што заўсёды знаходзілася на пярэднім краі жыцця — у маленстве перанесла вайну, спазнала горыч цяжкіх пасляваенных гадоў, знайшла сваё месца і прызванне сярод людзей. Яе паэмы — трывалы сплаў асабістага і агульначалавечага, зліццё тонкага лірызму і глыбокага філасофскага роздуму над часам.

«У кожным імгненні паэзія ёсць, у кожным здзяйсненні — яе прыгажосць»,— сказала паэтэса ў адным са сваіх вершаў, тым самым вызначыўшы сутнасць паэзіі як найвышэйшае праяўленне паўсядзённасці, самога быцця. Што гэта сапраўды так, добра пераконвае кніга «Птушка шчасця», змест якой склалі творы, напісаныя Е. Лось у апошнія гады жыцця.

І ў вершах, і ў паэмах «Мая Хатынь», «Гараджанка» і іншых прыкметна жаданне паэтэсы суаднесці сённяшняе з учарашнім, праз сувязь часоў адчуць саму дыялектыку жыцця, узаемасувязь ягоных працэсаў. Звяртаючыся да сучасніка, Е. Лось заклікае любіць Радзіму, народ, быць верным ідэалам рэвалюцыі і справе партыі. Разам з тым у гэтым зборніку, як і ў іншых, што выходзілі на рускай мове, яна хораша апявае каханне, сяброўства, харство роднай прыроды.

В. САЕНКА.

М. МАТУКОЎСКІ. П'есы. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1979.

Кніга прыцягне да сябе ўвагу тых, хто любіць чытаць драматургічныя творы, і тых, хто раней бачыў гэтыя п'есы на сцэне. Іх папулярнасць — невыпадковая, бо М. Матукоўскі па-журналісцку назіральна, з публіцыстычным пафасам раскрывае надзённыя канфлікты рэальнага жыцця і выводзіць вобразы нашых сучаснікаў. Асабліва вялікі поспех мелі камедыя «Амністыя» і драма «Апошняя інстанцыя». Жанравая разнастайнасць п'ес спалучаецца з добрым матэрыялам роляў, прыдатных для акцёраў розных пакаленняў. На беларускай сцэне арыгінальныя партрэты сучаснікаў стваралі народныя артысты СССР Л. Рахленка, Ф. Шмакаў і А. Клімава, народныя артысты БССР З. Браварская, С. Бірыла, А. Трус, В. Тарасаў, Г. Маркіна, заслужаныя артысты БССР Г. Арлова, І. Лакштанава, Г. Кокштыс. Дзесяткі тэатраў краіны звярталіся і звяртаюцца да лепшых твораў М. Матукоўскага, знаходзячы ў іх жыццёвыя гісторыі, праз якія мастацтва далучае гледачоў да актуальнай праблематыкі сённяшняга дня.

М. МІХАЛЕНКА.

СВЕТ ДАЛЁКІ І БЛІЗКІ

Адной з важнейшых прыкмет пасталення і ўзбагачэння сучаснай беларускай літаратуры з'яўляецца развіццё ў ёй жанру гістарычнага рамана. І што асабліва важна, на гэтай удзячнай цалінгай ніве разам з Уладзімірам Караткевічам, творы якога набылі шырокую папулярнасць і ўсеагульнае прызнанне, паспяхова пачалі працаваць іншыя пісьменнікі. Удалым і шматабяцаючым быў дэбют у гэтай галіне Барыса Сачанкі. А ў канцы мінулага года выйшла ў свет другім выданнем гістарычная аповесць Эрнеста Ялугіна пра Пятра Мсціслаўца.

Я рызыкую паказацца чалавекам устарэлых уяўленняў, нагадаўшы пра тое, што яшчэ не так даўно знаходзіліся людзі, якія з важным выглядам знаўцаў заяўлялі, быццам праца пісьменніка ці нават вучонага ў галіне гісторыі ні што іншае, як ухіленне ад надзённых задач сучаснасці. Самую ж сучаснасць і надзённасць яны разумелі надзвычай звужана і прымітыўна.

Сучасным жа з'яўляецца той твор літаратуры і мастацтва, які ідэйна ўзбройвае чалавека нашага часу, будаўніка камуністычнага грамадства, садзейнічае выпрацоўцы ў яго ўзвышаных грамадзянскіх ідэалаў і патрыятычных пачуццяў, узбагачае і робіць больш прыгожым яго духоўны свет, дапамагае выпрацоўцы прынцыпаў высакародства і сумленнасці, дружбы і таварыскасці, узаемапавагі і вернасці грамадскаму і проста чалавечаму абавязку. Вось таму, напрыклад, я не ведаю больш сучасных па сваёй актуальнасці і надзённасці твораў мастацтва, чым карціны лагернага цыкла М. Савіцкага, ваенныя аповесці і раманы В. Быкава, Я. Брыля, І. Шамякіна, А. Адамовіча, А. Кулакоўскага, І. Пташнікава, творы пра першыя гады станаўлення нашага грамадства і рэвалюцыйную барацьбу працоўных Заходняй Беларусі І. Мележа, А. Чарнышэвіча, М. Лобана, М. Танка, П. Пестрака, В. Адамчыка.

Праўда, той-сёй можа сказаць, што творы прыгаданых пісьменнікаў уваскрашаюць карціны зусім нядаўняга мінулага. Старэйшыя з нас былі самі актыўнымі ўдзельнікамі тых незабыўных падзей. Важна, аднак, не адлегласць у часе, а сам прынцып. Наш сучаснік — гэта законны наследнік не толькі недалёкага, але і даўняга мінулага свайго народа. Мінулае трэба не забываць, а ведаць. Гістарычная памяць чалавецтва з'яўляецца адной з рухаючых спружын яго інтэлектуальнага развіцця. І не выпадкова таму, калі той ці іншы народ становіцца перад вырашэннем вялікіх і адказных гістарычных задач, ён абавязкова звяртаецца да свайго мінулага, кліча яго на дапамогу. Гісторыя заўсёды надзейна служыць і павінна служыць сучаснасці.

У плане сказанага паспрабуем прааналізаваць прыгаданую вышэй аповесць Э. Ялугіна «Мсціслаўцаў кій». Апісаныя тут падзеі адносяцца да першай палавіны XVI стагоддзя. Гэта быў надзвычай складаны, супярэчлівы перыяд у гісторыі беларускага народа. І чым больш упэўненымі становяцца нашы крокі па шляху гістарычнага прагрэсу, тым з пільнейшай увагай скіроўваем мы свой погляд да той пары, імкнучыся разгадаць шматлікія загадкі, што паставіла перад намі гісторыя. Пісьменніку вядомы ўяўленні і меркаванні сучасных гісторыкаў, даследчыкаў літаратуры, мастацтва і грамадскай думкі, але ён нібыта ўхіляецца ад дыскусій вучоных і абірае знешне нейтральную пазіцыю. У аповесці зусім адсутнічаюць карціны гістарычнага фону, аднак гісторыя складае яе сутнасць і пафас. Паказаныя ў ёй падзеі адбываюцца на самай ускраіне Вялікага княства Літоўскага, у прыгранічным з Расіяй удзельным княстве Мсціслаўскім, дзе гаспадарыць нашчадак некалі слаўнага роду рурыкавічаў князь Міхайла Іванавіч. Падаюцца падзеі так і ў такім аспекце, што чытач выразна адчувае пульс эпохі і праз узаемаадносіны герояў бачыць глыбінныя сацыяльныя і рэлігійныя супярэчнасці таго часу, асновы міждзяржаўных канфліктаў і, самае важнае, духоўныя імкненні і пошукі лепшых прадстаўнікоў беларускага народа.

Замак пануе над горадам і вялікай тэрыторыяй княства, над лёсам яго насельніцтва. Кожны, хто тут жыве, залежыць ад волі князя непасрэдна або ад волі падпарадкаванага яму шляхецтва і розных прыганятых ці ад манастыроў і цэркваў, якія на першы погляд здаюцца самастойнымі, хаця гэта самастойнасць уяўная.

Сярэднявечча з яго неабмежаванай уладай аднаго і поўным бяспраўем ўсіх, казачнай раскошай нямногіх і здзіўляючай беднасцю народных мас, з гвалтам і прымусам, а адначасова і сапраўды рэнесанснай мэтанакіраванасцю таленавітых прадстаўнікоў краіны да вялікай справы служэння свайму народу паўстае ў форме не нудных пераказаў вядомых з падручнікаў звестак, а ў маляўнічых карцінах тагачаснага жыцця і побыту прыдворных баяр і гарадскіх рамеснікаў, купцоў і запрыгоненых сялян, шляхты і духавенства. І карціны гэтыя падаюцца ў строгай паслядоўнасці і лагічнай адпаведнасці законам развіцця сюжэта аповесці і неабходнасці раскрыцця характараў яе дзеючых асоб.

У сутыкненнях герояў выяўляюцца важнейшыя супярэчнасці эпохі. Малодшы княжыч Фёдар нарадзіўся якраз у той час, калі князь Міхайла Іванавіч хадзіў з войскам на крымскіх татар, а таму і быў абдзелены бацькоўскай ласкай. Старэйшага Аляксея бацька браў заўсёды з сабой на паляванне і ў госці, а меншага нібы не заўважаў, хоць у сваіх граматах і на людзях прызнаваў за сына.

Здавалася, што ў замку цячэ жыццё па спрадвеку ўстаноўленых законах і звычаях, а на самай справе тут віруюць бурныя чалавечыя страсці. Дробязныя падазрэнні штурхаюць самога заканадаўца ў княстве Міхайлу Іванавіча парушаць законы свайго часу і ўрэшце прыводзяць да таго, што ён робіць роднага сына згоем, становячыся, такім чынам, апошнім мсціслаўскім князем.

Асабістыя непаразуменні ў княскім замку ўрэшце набываюць агульнаграмадскі сэнс і значэнне. Чалавечыя страсці штучна падагравацьць тыя сілы, якім былі выгадныя і патрэбныя спрэчкі паміж бацькам і сынам. Княжыч Фёдар скіроўваў свае погляды на ўсход, пераходзіць служыць Маскоўскаму князю, а іезуіты дамагаюцца таго, што хворы і душэўна надломлены Міхайла Іванавіч завяшчае сваё княства наследніку польскага караля.

Праз малое і, здавалася б, зусім нязначнае ў аповесці выяўляецца вялікае і рашаючае. Праваслаўнае духавенства для ўмацавання свайго ўплыву вырашыла пабудаваць новую царкву, даручыўшы гэту справу таленавітаму заслаўскаму

Э. Ялугін. Мсціслаўцаў кій. Аповесць. На рускай мове. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1978.

БУДАВАЛІ НА ПАЛЕССІ...

За апошнія пяць гадоў выйшла ў свет ёмістая абойма змястоўных і багатых на фактычны матэрыял манаграфій, прысвечаных гісторыі беларускай народнай архітэктонікі, народнага мастацтва. Сюды неабходна ў першую чаргу аднесці «Беларускае народнае жыллё», «Беларускае народнае адзенне», «Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў», напісаных калектывамі аўтараў сектара этнаграфіі ІМЭФ АН БССР, «Замкі Беларусі» і «Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі» М. Ткачова, «Беларускае мастацкае шкло» М. Яніцкай, «Народная разьба па дрэве» Я. Сахуты, «Беларуская кніжная графіка В. Церашчатавай, «Народная деревянная скульптура Белоруссии» А. Лявонавай і інш.

Нядаўна бібліятэчка згаданых вышэй выданняў папоўнілася кніжкай Ю. А. Якімовіча «Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся». Ці здолеў ён пасеяць нешта новае, сваё на той ніве народнай архітэктуры і мастацтва, якую ўжо даўно спрабуюць узняць даследчыкі? Аўтар не пайшоў па працярэбленай сцежцы, дзе, між іншым, яшчэ можна многае зрабіць, а абраў сваю дарогу, звярнуўшыся да той праблемы дойлідства, да таго яго аспекта, які раней ніколі не выступаў у якасці прадмета адмысловага даследавання.

Аўтар манаграфіі «Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся» выступае адначасова ў дзвюх іпастасях — даследчыка гісторыі і тэорыі архітэктуры і даследчыка-мастацтвазнаўца. Такое спалучэнне мае сваю логіку: аб'ектыўнае раскрыццё сутнасці і тэндэнцый развіцця драўлянага дойлідства ў цэлым і на паасобных этапах патрабуе мастацкага асэнсавання, бо тэхнічныя і мастацкія прыёмы выспяваюць паралельна на аснове захавання мясцовых традыцый.

Зварот да гэтай праблемы мае не толькі чыста навуковае, што ўжо важна само па сабе, але і вялікае практычнае значэнне, бо дазваляе распрацаваць шэраг актуальных пытанняў, звязаных з засваеннем прагрэсіўных народных традыцый у галіне дойлідства. Многія архітэктары паспяхова звяртаюцца да архітэктурна-будаўнічай спадчыны і з густам спалучаюць вопыт народных дойлідаў з лепшымі дасягненнямі сучаснай архітэктуры. У традыцыях народнага дойлідства пабудаваны дамы ў пасёлку Верцялішкі Гродзенскай вобласці, у пасёлку Мышкавічы Магілёўскай вобласці, у вёсцы Расна Брэсцкай вобласці. Яны вызначаюцца выразнасцю галоўных фасадаў, мяккай пластычнасцю драўляных элементаў.

Храналагічна «Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся» ахоплівае XVII—XIX стагоддзі, вялікі перыяд, які вызначаецца найбольшым яго росквітам. Кнігу, калі не лічыць уступ і заключэнне, складаюць тры ўнутрана аб'яднаныя раздзелы, якія па сутнасці можна было б разгарнуць у самастойныя даследаванні, прысвечаныя адпаведна: вытокам драўлянага дойлідства, грамадзянскаму дойлідству і культаваму дойлідству. У сукупнасці яны складаюць суцэльную карціну архітэктурна-мастацкага развіцця Беларускага Палесся. Станоўчай рысай даследавання з'яўляецца і тое, што аўтар не абмежаваўся разглядам толькі грамадзянскага дойлідства. Параўнальны аналіз дазволіў яму раскрыць асаблівасці выкарыстання і трансфармацыі традыцыйных канструкцыйна-мастацкіх прыёмаў у культавай архітэктуры, або, інакш кажучы, прасачыў іх здольнасць да трансплатацыі і іх паводзіны ў новым архітэктурна-будаўнічым асяроддзі. Менавіта гэтая праблема сёння з'яўляецца найбольш актуальнай і вынікова, калі падыходзіць да вывучэння народнага дойлідства з пункту погляду практыкі. З другога боку, майстэрства народных дойлідаў было даведзена да пластычнай дасканаласці толькі ў манументальным будаўніцтве, бо нястача матэрыяльных сродкаў у большасці дарэвалюцыйнага сялянства не дазваляла дойліду разгарнуць свой талент у сціплым народным будаўніцтве.

Аўтар пераканаўча і доказна даводзіць, і з гэтым нельга не пагадзіцца, што асноўныя канструкцыйныя прыёмы манументальнага дойлідства зарадзіліся ў народным жыллі і гаспадарчых пабудовах, там жа адбыўся і складаны працэс мастацкага вытлумачэння рацыянальных канструкцый і аб'ёмаў.

Не засталося па-за ўвагай даследчыка і такое малараспрацаванае дагэтуль пытанне, як ступень уплыву каменнага дойлідства на драўлянае і характар яго ўзаемасувязі з такімі стылямі мураванай архітэктуры, як візантыка, готыка, рэнесанс, барока, класіцызм. Аўтар пры гэтым не абмяжоўваецца канстатацыяй фактаў, іх пералікам, а пераканаўча, часам нават з празмернай скрупулёзнасцю, ілюструе кожны з іх канкрэтным прыкладам.

Пры разглядзе мастацка-дэкаратыўных прынцыпаў аздаб-

Ю. Якімовіч. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся. Мінск. «Навука і тэхніка», 1978.

дойліду Васілю Пакладу, які даўно набыў шырокую вядомасць выдатнага майстра свецкіх і культавых пабудоў.

У маладосці Васіль шмат вандраваў па чужых землях, быў у Германіі, Чэхіі, Італіі, вучыўся дойлідскаму майстэрству ў замежных майстроў, пазнаў навуку ва універсітэтах тых краін, дзе давялося быць, і вярнуўся дадому, каб рупнай сваёй працай, сваімі справамі ўзвялічваць славу роднай краіны. Будаўніцтва царквы з'яўлялася для яго адным з важных крокаў на шляху здзяйснення запаветнай мары. Але тут славутага дойліда налучыла вялікае няшчасце. Калі царква была зусім блізка да завяршэння, падкупленыя іезуітамі купец - падрадчык Апанас Белы і арцельшчык Амелька ўзарвалі будынак.

Вялікая мастацкая вартасць аповесці заключаецца ў шырокіх мастацкіх абагульненнях. Праз нагаданыя прыклады ўзаемаадносін герояў яўна прасвечваецца эпоха. Мы бачым, што аб'яднанне Вялікага княства Літоўскага з Польшчай у адзінай дзяржаве Рэчы Паспалітай і заключэнне Брэсцкай уніі адкрылі магчымасці для экспансіі на беларускія землі польскіх феадальных колаў і каталіцтва, узмацнілі намаганні іезуітаў падпарадкаваць духоўна народныя масы ідэалагічнаму ўплыву свецкіх і духоўных магнатаў Польшчы. У тых гістарычных умовах і абставінах змаганне праваслаўных народных мас за захаванне сваёй рэлігіі з'яўлялася ў сваёй аснове барацьбой за захаванне ўласнай народнасці супраць прыгнёту іншаземных феадалаў.

Расстаўленыя пісьменнікам класавыя і ідэалагічныя акцэнты выразна перадаюць складанасць і мнагастайнасць жыцця таго часу. Э. Ялугін не сацыялагізуе, не падганяе пад схему ствараемыя ім карціны, а імкнецца да большай мастацкай выразнасці, а таму і дасягае гістарычнай адпаведнасці і праўдзівасці.

Аповесць «Мсціслаўцаў кій» прысвечана аднаму з пачынальнікаў рускага кнігадрукавання, таленавітаму паплечніку Івана Фёдарава Пятру Мсціслаўцу. На першы погляд, такое вызначэнне можа паказацца не зусім адпаведным сапраўднасці, таму што галоўны герой твора нібыта зацямняецца іншымі персанажамі, адсоўваецца імі на задні план. Сапраўды, падлетак Пятрок знаходзіцца недзе каля падножжа грамадскага жыцця Мсціслаўскага княства. Бацька яго — майстаравы горада — пачаў выбівацца ў купцы, стаў ездзіць у іншыя гарады з таварамі, але аднойчы загінуў пры загадкавых абставінах, а тое, што было на яго вазах, невядома дзе падзелася. Астаўся толькі вялікі доўг Апанасу Беламу, які настойліва дамагаецца ўзяць юнака на некалькі год у кабалу.

Не займаючы колькі-небудзь віднага і ўплывовага месца ў жыцці горада, Пятрок вылучаецца сярод іншых сваёй упартасцю і настойлівасцю ў імкненні авалодаць пісьменнасцю, сваёй таленавітасцю. Намаляваныя ім іконы сустракаліся прыхільна, а выстаўленая карціна пра пакуты грэшнікаў на тым свеце выклікала бурны гнеў, таму што ў вобразах грэшнікаў пазналі сябе некаторыя мсціслаўцы. Асабліва люцтаваў купецкі стараста Апанас Белы, бо ён быў паказаны ў найцяжэйшых пакутах.

Чытаючы аповесць, мы нават не заўважаем, як нейкая падспудная плынь сюжэта прымушае нас пільна і ўважліва сачыць за жыццёвым лёсам Петрака, радавацца яго ўдачам і смуткаваць з прычыны няўдач і толькі здагадвацца (прама пісьменнік пра гэта не гаворыць), што юнака магутнай сілай вабіць друкарская справа, якую распачаў Францыск Скарына. Нарэшце Пятрок разам з Ціханам, які прыбыў з Масквы ў Рэч Паспалітую спецыяльна дзеля таго, каб навучыцца кнігадрукарскаму майстэрству, ідзе ў Вільню. Але якраз у той дзень, калі падарожнікі, здавалася, дасягнулі жаданай мэты, горад гарэў, пажар пачаўся з друкарні Скарыны.

Думаецца, тут дапускаецца змяшчэнне дзеяння ў часе. Амаль паўстагоддзя падзяляе пачатак кнігадрукавання ў Вільні і ў Маскве, хаця зусім верагодна, што справа беларускага асветніка і першадрукара выклікала магутны духоўны ўздым і вялікія спадзяванні ў асяроддзі культурных дзеячаў славянства, прагнае жаданне працягнуць яе далей на карысць сваіх народаў. Гісторыку вельмі важна было б устанавіць факт сустрэчы Пятра Мсціслаўца з Францыскам Скарынам, а мастак слова мае права дапусціць верагоднасць гэтага.

Прасочваючы жыццёвы шлях галоўнага героя аповесці, мы наглядна бачым вялікую таленавітасць народных мас. Феадальны ўціск і бяспраўе не маглі закаваць у жалезныя ланцугі іх інтэлектуальныя сілы. Шматлікія народныя ўмельцы адпраўляліся ў нялёгкія падарожжы ў чужыя краіны з прагным жаданнем пазнаць таямніцы майстэрства абранай спецыяльнасці і вярталіся ўзбагачаныя вопытам і ведамі іншых народаў. Тым самым развейваецца міф пра духоўную ізаляванасць Беларусі ад перадавых еўрапейскіх краін. Вялікія ідэі Адраджэння не абміналі Беларусь, а пранікалі сюды, уздымаючы да актыўнага жыцця такія таленты з народа, якія, паводле слоў славутага акадэміка Карскага, ні па сваім розуме, ні па размаху дзейнасці, ні па ўзвышаных гістарычных ідэалах не ўступалі заходнееўрапейскім дзеячам эпохі Адраджэння. У адлюстраванні гэтых важных працэсаў у гісторыі духоўнага жыцця нашага народа мне бачыцца вялікая заслуга Э. Ялугіна. Далёкае падаецца як блізкае і дарагое нам; імкненне продкаў да ўзвелічэння славы роднага краю і паляпшэння дабрабыту свайго люду будзе натхняць падрастаючае пакаленне на самаадданую працу ў імя росквіту Айчыны і шчасця савецкага народа.

Аповесць вабіць сваімі высокімі мастацкімі вартасцямі — займальнасцю сюжэта, жывасцю апавядання, яркасцю і пластычнасцю намаляваных карцін, майстэрствам характарыстыкі вобразаў.

Юльян ПШЫРКОЎ.

лення жылых будынкаў і манументальных збудаванняў Ю. Якімовіч слушна адзначае адсутнасць у палескім дойлідстве аўтаномных ад канструкцыйных сістэм мастацка-выяўленчых сродкаў. Яны, як правіла, былі заснаваны на кампазіцыі пабудовы, выразнасці сілуэта, тэктанічнасці форм, лагічнасці аб'ёмаў і чляненняў, прапарцыянальнасці часткі і цэлага, маштабнасці і адзінстве з асяроддзем.

Драўляныя пабудовы ва ўмовах вільготнага клімату Палесся параўнаўча недаўгавечныя. Жылыя будынкі рэдка захоўваліся без значных пераробак больш стагоддзя, культавыя збудаванні, пабудаваныя з лепшых гатункаў лесу і неацяпляемыя, маглі стаяць даўжэй. Пажары, шляхецкія звады, войны — усё гэта спрычынілася да знішчэння вялікай колькасці архітэктурных помнікаў XV—XVIII стагоддзяў. Выкарыстанне шматлікіх і раней невядомых матэрыялаў дзяржаўных архіваў Беларусі, Украіны і Літвы дазволіла аўтару ўзнавіць кампазіцыйна - канструкцыйныя асаблівасці шмат якіх тыпаў знікшых пабудоў. Знаёмства з пажоўклымі архіўнымі паперамі, асабліва інвентарнымі, дазволіла перагледзець асобныя нашы ўяўленні і ўдакладніць некаторыя палажэнні і дацыроўкі. Возьмем толькі адзін прыклад. Дагэтуль лічылася, што ветракі пачалі распаўсюджвацца на Беларусі толькі ў XVIII стагоддзі. Між тым, у Заходняй Еўропе ветраныя млыны былі вядомы ў XIII, у Польшчы — у XIV, у Маскоўскім княстве — у XV стагоддзях. Аўтар слушна ставіць пытанне: якім чынам распаўсюджанне ветракоў з захаду на ўсход абмінула Беларусь? І вось знаходка: у інвентары Кобрынскага замка ідзе гаворка пра «вежу млыновую».

Фактаграфічная ёмістасць — адметная рыса кніжкі Якімовіча. Шмат якія ўзнятыя ім пытанні закрануты павярхоўна, у той меры, як гэта вымагала даследаванне асноўнай тэмы. Аднак адно з іх — узаемаўплыў і ўзаемаўзбагачэнне культур, у першую чаргу беларускай, украінскай, рускай, літоўскай і польскай, г. зн. тых культур, што маюць агульнае мінулае, — неабходна было, на наш погляд, разгледзець больш грунтоўна, асабліва калі ўлічыць, што першы раздзел цалкам прысвечаны вытокам драўлянага дойлідства Палесся. Варта было выйсці за межы традыцыйнай канстатацыі паралелей і фіксацыі агульных рыс у драўляным дойлідстве народаў-пабрацімаў і народаў-суседзяў.

Аднак, зразумела, у адны рэзгіны стог сена не ўвамнеш. Непакоіць іншае — тыя хібы, што, хаця і не ўплываюць на агульны навуковы ўзровень працы, але выклікаюць здзіўленне і прыкрасць самі па сабе, а яшчэ больш — недарэчнасцю свайго паходжання: паспешлівасцю аўтара і няўважлівасцю тых, хто меў дачыненне да выдання кніжкі. Чамусьці такія агрэхі лічаць дробяззю і ставяцца да іх звычайна з паблажлівай спагадлівасцю, як быццам ужо загадзя праграміруюць пэўны працэнт памылак такога роду.

Ёсць яны, на жаль, і ў манаграфіі Ю. Якімовіча. Звычайна для паказу знаходжання таго ці іншага населенага пункту прытрымліваюцца сучаснага адміністрацыйна - тэрытарыяльнага падзелу. У кніжцы мы сустракаем і паветы, і спасылкі на адміністрацыйна - тэрытарыяльны падзел, які ўжо даўно зменены. Ёсць і недакладнае напісанне назваў вёсак (у Петрыкаўскім раёне Гомельскай вобласці, скажам, ёсць вёска Грабаў, а не Грабава).

Не зроблена дакладная дыферэнцыяцыя нарматыўных і дыялектных назваў некаторых гаспадарчых пабудоў: «Традыцыйнымі гаспадарчымі збудаваннямі сялянскага двара з'яўляліся клеці, свірны...», «...блізка да клецяў стаялі істопкі і варыўні», «Асобную групу складалі пабудовы для абмалоту і захавання збожжа: гумны, стадолы, клуні». Атрымалася, што клець і свіран, істопка і варыўня, гумно, стадола і клуня — гэта розныя пабудовы, а ў сапраўднасці «клець» і «свіран», напрыклад, гэта розныя назвы адной і той жа гаспадарчай пабудовы.

Знайшла свой адбітак у манаграфіі і нераспрацаванасць будаўнічай тэрміналогіі.

У. ГУРКОЎ,
кандыдат гістарычных навук.

ЮРКА — СЫН КАМАНДЗІРА

Нашу літаратуру папракаюць і, прызнаемся шчыра, правільна за тое, што ў нас мала твораў, у якіх цікава, праўдзіва і пераканаўча было б расказана аб мірных буднях савецкіх воінаў, аб іх нялёгкай і разам з тым поўнай своеасаблівай рамантыкі армейскай службе. Падобны недахоп асабліва адчувальны ў дзіцячай літаратуры, а між тым яна здольна і павінна выхоўваць з сённяшніх школьнікаў будучых воінаў, хто, не задумваючыся, у патрэбны момант гатовы будзе стаць на абарону заваёў Радзімы. Тым больш радасна, калі сустракаеш твор, аўтар якога шчыра і захапляюча гаворыць аб сённяшняй арміі, аб тых, хто з'яўляецца верным прадаўжальнікам баявых традыцый сваіх бацькоў, старэйшых таварышаў і братоў. Менавіта такую кнігу і напісаў Мікалай Кругавых, пісьменнік, які сам аддаў доўгія гады службе ў арміі, добра ведае яе жыццё, добра разбіраецца ў псіхалогіі сённяшняга салдата.

Аповесць «Юрка — сын камандзіра», якая, дарэчы, на Рэспубліканскім конкурсе на лепшы твор для дзяцей і юнацтва, што праводзіўся ў 1974—1976 гадах, адзначана першай прэміяй, расказвае пра некалькі месяцаў з жыцця Юркі, сына камандзіра ракетнага дывізіёна. Аўтар не вышуквае нейкія незвычайныя сітуацыі ў жыцці свайго героя, а імкнецца паказаць, як фарміруецца яго характар, як вучыцца хлопчык пазнаваць людзей, як адкрываецца для яго прывабнасць сапраўднага сяброўства.

М. Кругавых любіць свайго героя. Адчуваецца гэта з першых старонак аповесці, бачыцца па той уважлівасці, з якой пісьменнік імкнецца адразу ж засяродзіць увагу на многім, што крыху пазней дасць мажлівасць лепш і паўней зразумець асаблівасці характару Юркі, вылучыць у ягоных паводзінах галоўнае. Першае, што кідаецца ў вочы, гэта — таварыскасць хлопчыка, яго ўменне знайсці кантакт з сябрамі, прыслухацца да іх меркаванняў. Юрка—з тых дзяцей, якія, можна сказаць, свецяцца сваёй дабратой, і галоўная задача дарослых заключаецца ў тым, каб ні ў якім разе не паслабіць у іхняй душы святла шчодрасці. Наадварот, важна ўсялякім чынам падтрымліваць гэтае добрае, тактоўна заўважаючы яго.

Аднак таварыскасць Юркі не выключае і імкнення хлопчыка любым спосабам самасцвердзіцца, адчуць сябе дарослым. Тут аўтар таксама, думаецца, не адыходзіць ад жыццёвай праўды, а якраз добра адчувае псіхалогію свайго героя, які знаходзіцца ў тым узросце (Юрка перайшоў у трэці клас), калі асабліва хочацца самастойнасці ва ўчынках, калі празмерная бацькоўская апека, як і ўвогуле залішні «кантроль» дарослых, не заўсёды прыносяць патрэбную карысць, а часам, наадварот, выклікаюць у дзіцяці жаданне не слухацца, рабіць усё па-свойму.

У жыцці Юркі шмат ёсць таго, чаго не бачаць многія яго равеснікі. Гэта — пастаянная магчымасць сустракацца з салдатамі, бачыць, як нясуць яны сваю нялёгкую службу, самому далучацца да няпростага армейскага распарадку. А яшчэ— частыя пераезды разам з бацькамі з месца на месца. І цяпер таксама. Жыў Юрка некаторы час на адной з застаў у Сібіры, сябраваў з Кешам і Славікам, а раптам апынуўся за тысячы кіламетраў—у Беларусі.

З гэтага прыезду, па сутнасці, і пачынаецца асноўнае дзеянне ў аповесці. Прыходзяць да хлопчыка новыя радасці і клопаты, знаходзяцца новыя добрыя сябры і асабліва салдат Шахназараў, што застанецца для Юркі на ўсё жыццё добрым Шахам.

З душэўнай цеплынёй пранікае М. Кругавых ва ўнутраны свет свайго героя, падрабязна імкнецца зразумець і адчуць усе тыя змены, што адбываюцца ў ягоным характары. Аповесць перш-наперш і значная сваёй праўдзівасцю. Праўда, месцамі ў творы ўсё ж адчувальна жаданне аўтара заінтрыгаваць юнага чытача. Гэта, безумоўна, у дзіцячым творы таксама патрэбна. Іншая справа, што займальнасць не павінна шкодзіць праўдзівасці. Расказ жа пра чалавека са шрамам, з якім Юрка пазнаёміўся на заставе, потым сустрэўся ў самалёце і, нарэшце, непадалёк ад размяшчэння ракетнага дывізіёна, не ўпісваецца арганічна ў аповесць, ён здаецца ў ёй лішнім. Тым больш зусім нечаканае і незразумелае завяршэнне гэтай сюжэтнай лініі...

Радуе ж у аповесці іншая займальнасць, якая ідзе ад добрага аўтарскага ведання армейскага жыцця і побыту, ад яго сапраўднай захопленасці тым, пра што ён расказвае. Хіба не цікава будзе даведацца дзецям, як нясуць службу ракетчыкі, як ходзяць яны ў нарады, як рыхтуюць і выхоўваюць службовых сабак? А вучэнні, якія праводзіць дывізіён? Наведванне салдацкай сталовай? Магчымасць самім прысутнічаць на пастраенні салдат і сяржантаў? Падобная пазнавальнасць — добрая і неабходная.

Пазнавальны і выхаваўчы аспекты ў творы існуюць не ізалявана, не асобна, а добра дапаўняюць адзін аднаго. У дзяцей узнікае жаданне як мага хутчэй пабольш даведацца пра Юрку і яго старэйшага таварыша Шаха. М. Кругавых не паслабляе сваёй увагі да псіхалагічных момантаў у паводзінах хлопчыка. Асэнсоўваючы яго ўчынкі, даючы ім пэўную маральна-этычную ацэнку, ён тым самым дазваляе чытачу задумацца, а ці ўсё правільна робіць Юрка, ці ўлічвае ён, як да яго паводзін паставяцца дарослыя.

Лепшыя старонкі твора тыя, дзе расказваецца аб сяброўстве Юркі і салдата Шахназарава. Шах вучыць хлопчыка быць чэсным, смелым, слухацца старэйшых. А яшчэ Шах (нават у большай ступені, чым бацька Юркі, падпалкоўнік, камандзір ракетнага дывізіёна) штодня далучае яго да армейскай службы. Ёсць нешта сімвалічнае ў тым, што малы Юрка носіць сапраўдную салдацкую форму, прысутнічае на занятках... Ён паступова адкрывае для сябе той дзіўны свет, у якім строгасць і патрабавальнасць спалучаюцца з увагай да кожнага чалавека, з уменнем знайсці падыход да яго сэрца. Юрка любіць армію, любіць яе так, як можа любіць чалавек, што ўжо пэўным чынам адчуў неабходнасць і патрэбнасць дысцыпліны, умення «хачу» і «не жадаю» падпарадкаваць аднаму слову — «трэба».

Святлана ХОРСУН.

М. Кругавых. Юрка — сын камандзіра. Аповесць. На рускай мове. Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1979.

Іван РАЛЬКО

Хатынь

Між гоману задумных дрэў
І пошуму вятроў і красак:—
Граніту чорнага зняменне
І скрухі горкае маўчанне
Слязой пякучай росіць вочы...
Былыя дні. Былыя ночы.
Былога вогненная замець
Гарачым болем працінае памяць...
Спрадвек гасціннае жытло,
Жывое чалавечае цяпло,
Вачэй дапытлівых святло,
Пашану спрацаваных рук,
Пяшчоту слоў, раскошу гукаў,
І мудрую паважнасць рухаў,
І сэрцы, шчодрыя на ласку і дабро,—
Усё крыжакі загубілі,
Ператварылі ў тло
Без літасці, без жалю, без спагады!..
Бацькоў, і матак, і дзяцей,
Іх спадзяванні і надзеі,
Іх будні, святы і нядзелі
У дзень адзін, пачварны дзень,
У чырвоным полымі і дыме
Без літасці вандалы спапялілі,
Ператварылі ў тло!..
Былой трагедыі пасля
Ляжыць удзірванелая зямля,
Гаротная і мужная зямля Хатыні!
Дзе некалі буяла жыта
І песня жніўная гайдала каласы,
Дзе травы пахлі сырадоем,
Настоем медуніцы і кахання,
Дзе одум светлы вечаровы
Гаворкаю няспешнай цешыў душы
Спакойных дзедаўскіх сяліб,
На месцы тым, —
На котлішчы святым Хатыні,
Як непазбыўны боль,
Ляжыць удзірванелая ралля,
Забыўшая на ласку рук і зерня,
На дотык лёгкіх ног дзіцячых,
Ружовых, як зара, ад ранішняй расы...
Ляжыць удзірванелая зямля
Былой трагедыі пасля.
А над зямлёю — коміны-званы,
Нямоўчныя хатынскія званы,
І дзень і ноч,
І дзень і ноч
У жальбе несуцешнай звоняць, звоняць...
Дзе б ні былі, трывожны звон дагоніць,
У памяці балюча адаб'ецца...
Па ўсёй зямлі трывожны звон нясецца;
Па ўсёй зямлі — Хатынскія званы,
Хатынскія званы — абвугленыя сэрцы
Мільёнаў,
адышоўшых у бяссмерце.

Над Нараччу

1. РАНІЦА. СОНЦА

Купаецца сонца, як сон, у вадзе,
А ў сонцы — купаюцца сонныя сосны.
І цені ад соснаў, як цені на сонцы,
Гайдаюцца ў белай, як сон, вадзе.
І чорная лодка, як здань, па вадзе
Цень белы, як дзень, за сабою вядзе.
А белая чайка, што мчыць нада мной,
Цень чорны вядзе па вадзе за сабой.
За ўсім, што вакола, сачу я паглядам
І Нарач здаецца мне белай баладай,
Дзе ў белым зіхценні жывой нематы
У вечным маўчанні стаяць чараты.

2. РАНІЦА. ТУМАН

Над возерам —
Туман густы, як хмара.
Над возерам —
Трымценне палахлівых крыл.
Над возерам —
Пануе чуйны слых,
А пільны зрок —
Не давярае ўласнаму пагляду

Сцяпан КУХАРАЎ

Тое лета было надта ж ягаднае. Малін, буякоў, чарніц набіралі нават там, дзе даўно іх не бачылі ў вочы. А што ўжо суніцы ўрадзіліся — як ніводзін год. Завідлівыя жанчыны-ягадніцы аж апрагаліся, тралюючы з-пад Блужы і Французскай Грэблі кашы з коптурам. Ды яшчэ неслі і ў прыполе.

У Балочы, лясной вёсачцы, да каго ні заглянь у хату, збанкі і вёдры, міскі і бітончыкі былі аж ліпкія ад ягаднага соку. У сенечках, на дварах і ў стопках-паграбках плаваў, гусцеючы, спакусліва-церпкі ягадны пах, змешваючыся з водарам кропу і агурэчнага цвету.

Не дзіва, што і балачанцы гэтак жа, як і ўсе жыхары лясных селішчаў, як не захварэлі на «ягадную ліхаманку». Ледзь выдасца якая вольная часіна, тарабанілі як не на перагонкі і малеча, і дарослыя; цялепкаліся з усімі і жвавыя, выпетраныя бабулькі, і сонныя ад самоты дзяды-дамаседы...

З рання на падворках, каля студняў замест звычайнага «дзень добры» чуеш: «Кажуць, суніцы паспелі?..», «Ото ж Жлобічы ўжо цэбрык награблі, вараць варэнне!..».

Дагэтуль ціхія, сонныя дарогі ў Балачанскі бор аж застагналі ад вуркатання матораў. Паўз Балочу валам валяць гарадскія аматары-нарыхтоўшчыкі. На матацыклах, мапедах, легкавіках яны забіраліся ў самыя глухія мясціны, пёрліся ў балоты, лезлі ў «чортавы ямы», туды, куды нават самыя спрактыкаваныя і заядлыя пракуды не маглі дапяць, хаця добра ведалі свой лес, свае балоты і гушчарнікі.

Гул машын, які мацнеў ужо з ночы, пазбаўляў спакойнага жыцця, выводзіў з прывычнага рытму нават самых раўнадушных і спакайнякоў.

Яшчэ тыя гады, як была жывая-здаровая Аксінька і гэтак жа пачынаўся ягадны і грыбны сезон, Зміцер Альховік сам падхопліваўся рана, да сонца, і спрабаваў усхатурхаць сваю палавіну: «Ты во кешкаешся, крэкчаш, як тая квочка на седале, а людзі даўно ўжо ў лесе — першую ягаду бяруць...» — «Ат, няхай ім, неўталоннікам, добра ікнецца, хай жаднічаюць, — звычайна адбівалася Аксіння-спакайняка. — Маё ад мяне не ўцячэ...».

А гэта во ўжо ад Васілля — помняць, што было такое старое свята на стыку зімы і вясны — чацвёрты год, як Аксінька пакінула бедалагу Зміцера на гэтым свеце аднаго, і яму ўжо не да ягад, хапае клопату і без гэтага. Нябожчыца, бывала, усё непакоілася, хвалявалася, што Зміцер першы знябудзецца. А бачыш, сама першай адышла. У іх, Альховікаў, канечне, ёсць сын, але што з таго: сын жыве ў горадзе, мае сваю сям'ю, выбіўся ў людзі. У Балочы баяць, што славутым вучоным стаў, лазеры выдумляе, то нават у члены-акадэмікі Віктара Альховіка выбралі. Праўда, бацькоў Віцька не забываў і не забывае. А яшчэ, калі вучыўся ва універсітэце, а пасля ў аспірантуру паступіў, то цэлыя леты жыў у вёсцы, з вясковымі аднагодкамі хаўрусаваў, і на поле, і на луг хадзіў у гурце — весялей тады бацькам жылося. Радаваліся за Віцьку, а не думалі, не верылі, што наогул Віцька жывы застанецца, ды яшчэ і такім чалавекам стане...

...Гэта ж, дай ты рады, як усё было тое. Радзіўся ж Віцька ў жудасныя блакадныя дні сорак трэцяга, у самыя калядныя маразы. Неяк уранні карнікі аблажылі лясную Балочу з трох бакоў, і нейкім цудам уратаваліся, выскачылі з засады колькі сем'яў. Аксінька мелася абрадзіцца. Дзіўна, як гэта выжыў, не акалеў іх першынец. У Альховіка не было дзяцей ад першай жонкі. Яна памерла перад вайной. Зміцер пабраўся з адзінокай дзяўчынай-перастаркай, хаця і сам быў не маладзён, пад пяцьдзесят гадоў меў. Нарадзіўся Віцька ў блакаду, калі балацянцы хаваліся на выспе, што за балотамі ў кірунку Французскай Грэблі. Аксінька абрадзілася, то нехта раіў ёй ціхенька прысыпаць снегам малога і папрасіць прабачэння ў бога. Дзе вы бачылі, каб Аксінька пайшла на такое — яна і слухаць не захацела. Рашыла, што будзе, тое й будзе, не ўзяла на сябе грэх. Сама сяк-так акрыяўшы, выкараскаўшыся з гэтага бярэмя, захутала малога ў ручнікі-пялёнкі, акрыла кажушком, які знайшоўся ў клунку, і гэтак у лясёнцы за плячамі і насіла з сабою; як ні млела ад страху і холаду, бо адзін час карнікі шасталі проста ў колькіх кроках ад іх лежбішча. Страшней за ўсё, калі малое пачынала кугекаць, падаваць голас, і ёй, Аксіньцы, а разам і Зміцеру (бацькава радасць была пякучая: на старасці ды сынок!), хоць ты лажыся ды памірай. Свае ж, некаторыя ледзь не кідаліся з кулакамі: «Праз твайго пісклёнка ўсе можам тутака загінуць!..» «Але дзіўная рэч, усе, хто тады паспеў уцячы з жытла, прайшлі і голад, і холад, і ўсе, нават гэтае малое пісклянё, засталіся жывыя. Хлопчык Альховікаў здаровенькі ацалеў, нават не кашлянуў голасна ні разу. І там, у Заблужскім бары, яго назвалі Віцькам. Нехта сказаў з мужчын, што яму трэба такое імя даць, бо Віцька — значыць пераможца. А што ж, і праўда, калі падумаеш...

Стары ўжо, нездаляшчы Зміцер з саменькае раніцы прымасціўся на лавачцы, перад гародчыкам. Нешта не спалася ўначы, не ляжалася. Мо таму, што амаль усю ноч вуркаталі машыны, чулася гамана непадалёк, за хатай, а гэта з дасвецця і свае ягаднікі спяшаюцца.

Навідавоку, во за хатай Альховіка — Заблужскі бор. Адразу ж за Балачанкай, рэчкай.

Зміцер ведае, як ніхто іншы ў Балочы, і ягадныя, і грыбныя мясціны. Спачатку за Балачанкай будзе густы, непралазны хвойнік, дзе іншы раз пад восень маслякоў і ваўнянак хоць касой касі, а пасля пойдзе падлесак-соснік, а далей ужо чысты, светлы бор; сасна ў сасну, высозныя, залаціста-чырвоныя ствалы, а вяршыні бы на сваіх шапках неба трымаюць, і ўсюды баравіны, чыста зялёны дыван хто разаслаў у бары. А між кварталаў баравых то ўзгорыстыя, то нізінныя палянкі, скрозь прагрэтыя сонцам, і на іх у цёплае і сухое лета, на самым яго ўзлёце высыпае самая далікатная і смачная лясная ягада — суніцы. Сунічнік выбірае сабе месца прынаднае, каб і бліжэй да сонца, і каб глеба была ўвільготненая, каб не адзін пясочак, а з зёмам напапалам. Бываюць такія лагчынкі ў прасеках, між супесяў, зёмныя астраўкі, дзе сунічнік засяваецца цэлымі зараснікамі...

Некалі і Зміцер любіў збіраць суніцы, але тое было даўно. Што для яго, старога, тая сунічка — адно балаўство. Варэнне? Дык ён, калі шчыра, не гоніцца за салодкім. Ды і рабіць тое варэнне няма каму.

Пацепваецца на лавачцы Зміцер, і думкі яго плывуць ціха, марудліва, як тыя воблакі, што нібы пасталі ў чыстых сініх прагалах, як усё адно гурбы свежага снегу. Не даюць яму спакою гэтыя суніцы. Хай свае, вяскоўцы. Дык з горада, за сто вёрстаў, пруцца ў лес, як на злом галавы. Едуць, як той казаў, хто на чым. Мабыць, каб можна было, дык іншы і да чамадана прыладзіў бы матор і на чамадане ехаў бы. Абы не адстаць ад суседа, бо сусед едзе, а чаму ён будзе сядзець, хіба ён горшы?...

Усё вышэй узбіраецца, па небе плыве сонца, зазіраючы промнямі і сюды, у агародчык, прашывае як не навылёт ярка-зялёную крону высокага, стройнага ясеня, які Зміцер пасадзіў у дзень Перамогі, калі ўзяўся будаваць замест той, што згарэла ў вайну, новую хату.

Час ідзе, хаця іншы раз Зміцеру здаецца, што ён, час, стаіць, застаяўшыся. Але ж во нават дрэвы выраслі, во ўжо і ясень вымахаў, высока ўзняўшы кучаравую зялёную кучомку над страхой. Ужо і яго Віцька мужчына, гады ўжо такія, што і сваіх бы дзяцей мець пара, мог бы мець. Ажаніўся Віцька парою, узяў спраўную дзяўчыну, таксама вучоная, жывуць як бы і ў згодзе, і ўсяго хапае, а дзетак няма. Хто там у іх вінаваты, адзін бог ведае. Мабыць, і Віцьку выпала такая «планіда», як і яму, Зміцеру. Дае бог чалавеку адно, на другое скупіца....

Стары выцірае дрыжачай рукою спацелы твар, адварочвае аблыселую галаву ад сонца і раптам хапаецца за кішэні, а тады, як спахапіўшыся, сам з сябе пасміхаецца. Ужо з год, як Зміцер не курыць, дактары наадрэз забаранілі. Галоўны доктар, да якога ў горад вазіў Зміцера Віцька, сказаў: «Дзядуля, калі хочаце яшчэ пажыць крыху, то кіньце цыгарку. У вашым жа горле спрэс задымлена, не раўнуючы, як у тым коміне».

Пабыў гэтым прадвеснем Зміцер у сына. Кватэра ў Альховіка-малодшага ў горадзе, лічы, у самым цэнтры, на галоўным праспекце, на чацвёртым паверсе. Чатыры хаты-пакоі. «Можна гуляць, як у клубе», — сказаў Зміцер, аглядаючы сынавы апартаменты. Віцькам сына называць Зміцер не адважваецца, асабліва ў прысутнасці Адзелаіды. Дужа ўжо інтэлігентная кабеціна, трапілася Віцьку ў жонкі. Зміцер гэта даўно адчуў. Усё хадзіла следам і, як Зміцер да чаго дакранецца, то адразу з анучкай, праўда, анучка белая-белая, як марлечка, спяшае, каб не наслядзіў. Мэбля ў сына ўся дарагая, замежная. Зміцер не вытрымаў і сказаў пра гэта. Віцька засмяяўся і сказаў: «Што вы, тата, у нас робяць не горш усё гэта. У Рызе прыдбаў па спецзаказе...» Зміцеру карцела спытаць, што гэта азначае той заказ, але Адзелаіда неяк нядобра паглядзела на яго, і Зміцер прамаўчаў.

Сын тады ж прапанаваў, каб бацька пераязджаў да яго на жытло. Хто ведае, можа, было сказана і шчыра, а можа, дзеля прыліку. Ды Зміцер таксама далікатна, але рашуча адмовіўся. Зміцер падумаў тады так. Дзе ты ўжывеш тут пры гэтай Адзелаідзе, калі яна во, як застаўся быў Зміцер на начлег, то забрала ад яго ўсё ягонае сподняе адзенне, а яго прымусіла лезці ў карыта, якое яны, гарадскія, называюць ваннай; яму, мабыць, дала сынавы споднікі і кашулю, а тое ўсё яго скруціла ў скрутак і выкінула ў сметніцу. На яго вачах. А ён жа, як збіраўся да сына, то і ў лазню схадзіў, і апрануў бялізну свежую, чыстую...

Пасядзелі яны з сынам тады добра, у смак. Каньяку бутэльку сын паставіў. Адзелаіда і тут паказала сябе: «Навошта, — сказала яна рашуча, як не са злосцю, — пачынаць цэлую. Вунь бутэлька пачатая ёсць. Хапіла б вам на дваіх...» Але Віцька малайчына, не песлухаўся. Сказаў: «Нічога, і з гэтай не зашко-

І разрывае што ні крок
Тумана шчыльную асаду.
Я крочу берагам туманным.
Я белым берагам іду.
Маё жывое прадчуванне
Плыве ў дрыготкую ваду.
Нібы ў бяздонную жуду.

Але раптоўна белы вецер
Загаманіў у белым вецці
Ўзбярэжных верб і чаратоў,
Рвануў нястрымна — і ачысціў даль,
Адкрыўшы зроку — белы ветразь
паміж белых хваль.

О, белы ветразь, белы ветразь!..
Ты — як асколак Белай Русі,
Як чайкі белае крыло
Ў блакіце вечнасці спрадвечнай.
Гайдаешся, мой белы ветразь,
На ўлонні роўнядзі азёрнай,
Як прадчуванне штармавых вятроў,
Як прага вандравання,
Што бунтуе кроў
У белых, як Надзея, аблакоў.

3. ДЗЕНЬ. СВЯТЛО І ЦЕНЬ

Абсяг жыцця — то блізкі, то далёкі.
Бацькоўскі дом, а потым — цэлы свет...
Як шчасце — белыя аблокі.
Як гора — чорнай ночы цвет.
Як белы ветразь пад навалай ветру
Змагаецца аж да знямогі сіл,
Змагаемся з жыццём за кіламетры
Гадоў, якія коціць небасхіл.

Што прынясе упартае змаганне:—
Трымценне крыл ці нямату магіл?
Што б ні было: — любое вандраванне
На голаў асыпае зорны пыл...

І нам жыцця кароткае імгненне
Адкрыла рух загадкавых свяціл,
І падарыла — шчодрае натхненне,
І нарадзіла — адчуванне крыл...

Запалавела над зямлёю лета...
Ах, самы час для спорнай пробы сіл.
Ты нам прабач — дасягнутая мэта.
Ты нас прымі — далёкі небасхіл.

4. НОЧ. РОЗДУМ

Чорная на беразе, як здань,
Светлая, як месяц, над вадой,
Ноч і ноч —куды ні глянь,
Ноч і зоры нада мной.

Адчуваю часу бег
Гэтак востра уначы,
Як дзявочы звонкі смех
Адчувае далячынь.

О, як многа адцвіло
Запаветных дум і слоў...
Толькі што ж — было, сплыло.
Ну, а час — далей пайшоў.

Я за часам — след у след,
Як і ўвесь радзімы край:—
Бараню яго ад бед,
Берагу ад лютых зграй.

Я сачу, як час ідзе,
Я гляджу — гадоў парад:
Многа велічных падзей,
Векапомных многа дат.

А сярод высокіх дат
Дзесьці дні майго жыцця:
На адных — ухвалы шмат,
На другіх — цень забыцця.

Дні, як людзі, маюць лёс —
Вечнасць альбо толькі міг:
Зыркі след сярод нябёс,
Гук, нявымаўлены ўслых.

Разважаю сам з сабой...
Зоры спеляць воблік дня.
Першы промень над вадой.
Ці-шы-ня.

5. БЕЗНАЗОЎНАЕ

Жыццё маё — лодка.
Душа мая — ветразь,
Што б'ецца і рвецца
Пад ярасным ветрам.

Ах, лодка — патоне,
А ветразь — парвецца.
А песня, а песня...
Ці след застанецца?

Трыялет

Плывуць высокія аблокі
І клічуць, клічуць за сабой.
У свет шырокі і далёкі
Плывуць высокія аблокі,
А ў сэрцы — вечны неспакой
І прад вачыма — шлях далёкі...
Плывуць высокія аблокі
І клічуць, клічуць за сабой.

дзіць». А тады дадаў: «Раднейшага за бацьку чалавека ў мяне няма...» Якой жонцы такое спадабаецца, калі пры ёй сын свайго бацьку хваліць. Адзелаіда, мабыць, не выключэнне...

Зміцер сядзіць, любуецца хараством летняй раніцы і ўспамінае. Ахоплівае одум старога. Во ўжо лета набірае размах і ўбіраецца ў сілу. Харашэ, маладзее ўсё на зямлі. Во ўжо цёплыя, уліўныя дажджы ўдосталь напаілі расліннасць. Мабыць, настае прыпар. І суніцы завязаліся. Мабыць, на ўгрэве, на санцапёку і паспелі ўжо. Памроілася, быццам з'явіўся іх кволы, тонкі пах у паветры. Прыгадалася старому апошняя сустрэча з сынам у горадзе, на новай сынавай кватэры. Разгаварыўшыся, Віктар прызнаўся бацьку, што апошнім часам яму не добрыцца, стала блага. Здаецца, нічога не баліць, а апаноўвае нейкая, не чуваная дагэтуль слабасць, бываюць часіны, што трываць нельга. Худнець пачаў. Няма апетыту. Дактары раяць больш бываць на свежым паветры. Прадвеснем сын адпачыў у санаторыі, але, бачыш, не памагае. Здаецца, крыху палепшала, але пачувае сябе не дужа.

— Трэба неяк ратавацца, — сказаў Зміцер і доўга маўчаў.

Маўчаў і сын. А тады Зміцер і кажа сыну:

— Кідай ты, Віцька, усе свае бальніцы ды курорты. Прыязджай на лета дамоў, у Балочу. Свой лес. Тревы розныя. Ягады... Ды на сваёй зямельцы і вёдзіца сілы дасць. Наша смачнейшая, чым гэта, што ў водаправодзе. Помніш, сыне, крынічку, што пад Дзятлікавым дубам? Яшчэ цячэ, не змялела. Яна тож паможа. Няма, сыне, такой хваробы, каб мы яе не адужалі. Ты ж — партызан. У блакаду радзіўся. Зімою, на калядным марозе. Ля вогнішча, якое распалілі, калі карнікаў адагналі далей, за Пціч-раку, твае нарадзіны справілі. Гарэлкі, праўда, не было, то чаем з малінніку адзначылі твой дзень нараджэння. Пад посвіст куль, пад гупканне снарадаў. А тады, як учуялі брэх аўчарак і галёканне немчуры то сарваліся з котлішча. Цябе, Віцька, маці загарнула ў дзедаў кажух і ўпіхнула ў мяшок, і ў тым мяшку несла за плячамі, калі беглі за Французскую Грэблю, у балота, і сядзелі там ні жывыя ні мёртвыя. А табе, Віцька, было ўсяго тыдзень ад роду. І ты, сыне, маўчаў, заціснуты ў пялёнкі. Дрыжэлі ўсе ад холаду і страху. Глядзі, якую блакаду ты з усімі перажыў. І во вырас, выгадаваўся, ніякая хвароба цябе не ведала. Як і ў школе вучыўся, і ў горадзе, то быў хлопец-крапак. А тут, глядзі, нейкая хвароба надарылася. Што ты скажаш?..

Зміцер тады яшчэ прыгадваў, як Аксінька, маці, радавалася, нябожчыца сына вельмі любіла. Бывала, як пахваліцца Віцька, што пяцёрку са школы прынёс, то яна не ведала, куды сына і пасадзіць, чым частаваць. Усё радавалася: «Мой партызанчык. Мой рыжык!..» Віця ўрадзіўся, быў малы надта ж рыжы, не падобны ні на маці, ні на бацьку. Спамінае цяпер тое Зміцер і дзівіцца з сябе, з свае тае дзівацкасці. Яго тады часта браў одум-непакой: «Дзіўна, у каго б ён, Віцька, мог пайсці?» Часам і касавурыўся на жонку: «Мо не мой гэта?..» А тады разважаў сам сабе: «Альховік жа. Значыць, недзе ў нашай пародзе былі рыжыя...».

Цяпер Віцька ўжо не такі і рыжы, як некалі, у маленстве. Зміцер часам, прыгадваючы тое, пачынаў у думках смяяцца, дакараць сябе: «Ну й дзівак жа ты, чалавеча». А калі прыгледзеўся, то Віцька нечым і падобны на яго, бацьку, — такі ж мажны ў плячах, галава вялікая і залысіны, як у бацькі, а на скронях валасы як прыпылены шэранню-імжою, і вочы шэрыя, як не сіняватыя, з асаблівым, мабыць, дзедаўскім прыжмурам, а жэсты зусім, як у яго, Зміцера. Калі гаворыць, то памагае ў гаворцы рукамі і ўсё, калі задумаецца, пачэсвае, без патрэбы, патыліцу...

Думаючы пра сябе, пра свой лёс, сваё адзіноцтва, Зміцер усё часцей чамусьці скіроўваўся ў думках да сына. Яго напамін пра хворасць, пра недамаганне ўсё больш непакоіў бацьку, асабліва тое, што Віцька сказаў на развітанне: «Ведаеш, баця, мабыць, мне не вылузацца ад гэтай немачы. А ўсё праз сваю дурасць. Малады быў — усё ні па чым, трын-трава. Настаўнік — кіраўнік дысертацыі — папярэджваў, каб у лабараторыі лішне не заседжваўся, а галоўнае, захоўвае меры перасцярогі. А мы—нуль увагі. Бывала, займаемся, а тады і пасля паложанага часу сядзім, гаворым, а іншы раз за шахматнай дошкай засядзімся. Мабыць, і прыхапіў лішне таго, чаго не трэба было, тых промняў...

— Не бядуй, сынку, усё гэта глупства! — падвясельваў сына Зміцер, а сам не-не ды і паглядзіць крадком на сына і заўважыць нешта такое ў твары і ў вачах, чаго раней як бы і не было. Нейкая стомленасць і сум — у вачах; рухі і хада не тыя, што раней; дачасна старэе сын. Гэта ж яшчэ да сарака далёка, а ён выдае залішне сталым, стомленым, як за спінаю нейкую ношку нясе.

— От, прыязджай, Віцька, — на развітанне цалуючыся з сынам, казаў Зміцер. — Па ўсіх маіх прыкметах сёлета ягадаў будзе процьма. Я цябе вылечу. Чуў я, што ад усякай немачы суніцы дужа велькую помач маюць. Кажуць, сунічка — ягада вельмі пальзіцельная, кроў жвавіць, абнаўляе!...

Віцька ўздыхнуў, стомлена ўсміхнуўся:

— Каб толькі суніцы памаглі, то іх тут во хутка прынясуць поўныя вёдры на Камароўскі рынак. Глядзі, бацька, сябе, бо бачу я, што і ты ўжо добра-такі падбіўся...

Жонка маўчала. А калі стары заспяшаўся, весела сказала:

— Прыедзем, Зміцер Паўлавіч, прыедзем, — замітусілася Адзелаіда, прыгаворваючы. — Вы, бацька, Віцьку не слухайце. Свая ягада ці, скажам, цыбулька, агурочак — не тое, што з рынку... Кісляціна! Прыедзем, а вы там не празявайце — першая ягада — гэта ж цуд, лекі, якіх ні на якім рынку не дастанеш. Ды хіба ягад тых дакупішся? За якую шклянку яшчэ зеленаватых суніц рубель здзяруць!..

— Ну, Ада, і скажаш! — засмяяўся Віктар. — Жонка доктара навук, а выдае, чыста камароўская скупярдзяйка!..

— Добра, ты ўжо мне такі багацей, ліхвяр! — аж зачырванелася Адзелаіда. — Затое я ад зарплаты да зарплаты выкручваюся. Гэта не тое, што ў вёсцы ўсё сваё, дармовае... А тут цяпер і табе трэба ўсё свежанькае, лёгкае. Яшчэ й суніц нейкіх во бацька нараіў. Па мне тых суніц хоць бы і век не было. Знайшлі лекі — суніцы!...

— Ну добра, дачка, — перапыніў нявестку Зміцер, насупіўшыся. — Мне пара ўжо. Трэба паспець на электрычку. Будзь ласка, падай мой бітончык...

Адзелаіда неахвотна пайшла на кухню, загрымела посудам. Мабыць, ёй не хацелася пераліваць прывезенае бацькам малако, а яшчэ больш апаласнуць бітончык.

— То будзьце здаровенькі, — заспяшаўся Зміцер. — Прыязджайце ж, суніцы, кажуць, ужо спеюць...

— Да свідання, — пазяхнула Адзелаіда.

...Аціхла ўжо трохі дарога, якая во з начы, з дасвецця грымела і стагнала. Усталёўвалася сонная цішыня. Ужо на затравелай вуліцы корпаліся заўсёды клопатныя куры ды ля плоту часам падхопліваўся чый-небудзь сабака і спрасоння пачынаў брахаць...

Як бы дрэмле сабе і Зміцер на выбеленай дажджамі і сонцам лавачцы. Тады раптам, як чаго спахапіўшыся, ён падхопліваецца, паспешліва калывае ў двор, здымае з палка алюміневы двухлітровік-бітончык, бярэ ў рукі кавеньку, сынаў падарунак, прытрымліваючы шыракаватыя ў поясе штаны, кіруецца на аселіцу.

Выходзіць, не ўтрымаўся і стары ад спакусы, і яго пацягнула нейкая невядомая сіла сунічнага паху, які наплываў хвалямі адтуль, з баравін, куды ўсё ранне ішлі машыны, спяшаліся свае і гарадскія жыхары.

Першыя ягадніцы ўжо вярталіся з поўнымі збанкамі і кошыкамі, і Зміцер пашкадаваў, што засядзеўся, не прыйшла яму ў галаву раней гэтая думка — набраць першых суніц, — Віцька і Ада абяцалі прыехаць у гэтую нядзелю. «Во сын будзе рады, — разважаў сам з сабою Зміцер, — як убачыць свежыя суніцы. Гэта не тое, што з базару, з Камароўкі. Свае, на сваёй глебе параслі, то і мацунак будзе ад іх інакшы. Няма нічога смачнейшага, што ні вазьмі: ці яблычак, ці гурочак, як тое, што ўрадзілася на той зямлі, якая і табе дала жыццё і моц!..»

Спяшаўся Зміцер на свае, знаёмыя з маленства мясціны, дзе некалі з сябрукамі набіраў поўныя латкі. Тады ягаднікі рабілі з маладой бярозавай ці асінавай кары карцы-конаўкі, куды збіралі суніцы. Даўно тое было. Як пачаў прыгадваць ідучы Зміцер, то атрымлівалася, больш як семдзесят гадоў. Уга, якая фатыга! Каб сказалі Зміцеру, вярніся, пачні спачатку, то, можа, і адмовіўся б. «Не дай бог, каб усё тое, што перажыта, тая вайна, а цяпер гэтая, апошняя, колькі сілачкі адняла, а будаванне пасля гэтага ліхалецця, а пасляваенная галадуха-нястача...» За сваё жыццё два разы будаваўся, два разы жаніўся. Такое нікому не параіць Зміцер.

Ідзе, спяшае Зміцер, а сонца смаліць, пячэ нясцерпна. Добра, што капялюшык выцвілы, зморшчаны і шырокі (такія цяпер не модныя, і Адзелаіда падаравала свёкру разам з іншымі, як Зміцер казаў, неданоскамі). Пах суніц, які, здаецца, аж дзярэ ў носе, бы падганяе старога, і ён не адчувае ні болю ў грудзях, на які жаліўся сам сабе апошнім часам, ні адышкі, якая пачала была памалу ўтаймоўвацца, затухаць, як кінуў курыць. Кінуў і табаку сеяць Зміцер на градах, хаця гэта каштавала вялікага намагання. Бадай што, ён адзін у Балочы і вырошчваў такі мультан, пра які казалі, што ў Альховіка махорка, як самая што ні ёсць «Герцагіня Флор». Але што не зробіць хвароба — нават з «Герцагіняй Флор» мусіш развітацца...

У бары яму сустракаліся зноў ягаднікі, свае і чужыя, і гэта паддавала ахвоты, нават нейкага маладога азарту, і Зміцер, цяжка сапучы, амаль трушком праставаў далей і далей, да тых мясцін, якія, калі ніхто не апярэдзіў, павінны даць яму добры ўзятак.

Зміцер увішна адолеў адзін і другі пагоркі, на якіх спрэс, нібы медна-чырвоныя калоны, сцяною стаялі высозныя, без адзінага сучка, сосны і, нібы даўнія лясныя пабрацімы-партызаны, віталі Зміцера лёгкім пагойдваннем цёмна-зялёных галін у вяршынях. А доле калючы ядловец, што ўвесь час праводзіў яго, кратаючы то за штаніны, то за ступакі, абутыя ў вельветавыя сынавы басаножкі, нібы гаварыў, наказваў: «Не спяшайся, бацька, адпачні, агледзься, паглядзі, якое хараство вакол!..».

А во ўжо і той запаветны Дзямянаў грудок, густа зарослы ажыннікам і крушынай. Тут была тая крынічка, што ратавала іх у блакадныя дні. А далей, на санцапёку, высечкі і прасека, а ўсцяж яе падлесак-соснік, светлы, аж свіціцца ў сонечны дзень ад сунічніку. Укленчыўшы і ўзіраючыся ў зеляніну, Зміцер аж быў усклікнуў ад нечаканай радасці. Вакол старых, тоўстых пнёў і між даўняга, ўжо добра выпетранага і струхлелага ламачча — густа-зялёныя кусты сунічніку.

Зміцер, скінуўшы капялюш, бо ўжо добра-такі ўгрэлася лысіна, пачаў абіраць суніцы. Яны былі буйныя, пахучыя, духавітыя, аж водарам ударыла ў голаў...

Похапкам, з імпэтам заядлага ягадніка, Зміцер, шчыраваў, укленчыўшы, абіраў ягаду за ягадай. Бітончык быў тут жа, ля ног, і Зміцер кідаў і кідаў суніцы ў бітончык, баючыся раструшчыць хаця б адну ягадку. Рукі яго дрыжэлі, не слухаліся вузлаватыя, нягнуткія пальцы. Неўзабаве густа акрапіліся ліпкім сунічным сокам, які аж казытаў у носе, будзіў амаль што пусты страўнік. І нават захацелася ўкінуць у рот, замарыць чарвячка, бо суніцы як ні самі прасіліся ў рот, але Зміцер і не падумаў, каб спакусіцца і зжаваць хаця б адну ягадку, паспытаць, якая яна на смак. Змалку і дагэтуль ён трымаўся яшчэ матчынага наказу: «Гэта не ягаднік, што адну ў рот, а другую ў кошык. Не спакушайся, то і рабіцьмеш хутчэй, і спакойна будзе на душы...»

Зміцер увішна пасоўваўся збоч сасонніку, і чым далей, узбіраючыся на пагорак, дзе сонца ўжо раскашавалася ва ўсю моц, тым сунічніку было болей і суніцы аж ільсніліся між светлых, цеплаватых лісцяў, чырванеліся, бы кропелькі свежай крыві, якую нехта распырскаў вакол, не ашчаджаючыся, як не чуючы болю.

Сонца нясцерпна пякло, смаліла няшчадна, бо было ўжо над галавою, і промні аж калолі, але Зміцер не зважаў на тое, што ўжо і твар, і плечы пакрыліся потам. Ён не адчуваў ні стомы, ні болю ў грудзях, ні шуму ў галаве. Перад вачамі быў чырвоны россып суніц, спелых і сакаўных, якія ён набіраў як не аберуч, стараўся напоўніць бітончык, той, у якім ранняй вясною вазіў сыну ў горад малако...

«У гэтую нядзелю» Віцька і Ада не прыехалі. Не прыехалі яны і ў наступную.

САВЕЦКАЙ КІНЕМАТАГРАФІІ — 60 ГАДОЎ

ЭКРАН, ЯКІ НЕ ГАСНЕ

Калі мы пачынаем гаварыць аб экранным мастацтве, міжволі думка сягае да пачатку, да вытокаў таго, што гэта мастацтва сёння мае ў якасці несумненных здабыткаў. Магчыма, такі зварот тлумачыцца маладосцю самога нашага кіно — усяго шэсцьдзесят гадоў...

Значнасць створанага ў дакументальным жанры, здаецца, выяўляецца больш зрокава ў параўнанні з мастацкім кінематографам. Чым далей адыходзім мы ад тых падзей, якія трапілі аднойчы ў аб'ектыў здымачнай камеры, тым больш узрастае каштоўнасць гэтых кадраў. Мы ведаем, што часам прахадны, выпадковы кінакадр здольны набываць праз дзесяткі гадоў вялізную сілу эмацыянальнага ўздзеяння на гледача. Прыкладаў таму мноства. І якасць плёнкі, і адсутнасць гуку або тэхнічная недасканаласць яго запісу тут не перашкода. Мы з хваляваннем глядзім сёння стужкі аб святочнай дэманстрацыі ў Віцебску ў першыя паслярэвалюцыйныя гады, выступленні будучага маршала М. Тухачэўскага на пасяджэнні ЦВК рэспублікі ў Мінску, індустрыяльнага будаўніцтва ў Віцебску, сустрэчы ў сталіцы рэспублікі М. І. Калініна, вуліцы даваеннага Мінска... Цікава адзначыць, што першая гукавая падзейная здымка ў савецкім дакументальным кіно была праведзена на станцыі Негарэлае, дзе з акна вагона гучаў жывы голас А. М. Горкага. На нашых вачах ажывае ўжо далёкае мінулае, і трэба быць вельмі сухім і чэрствым чалавекам, каб раўнадушна глядзець у гэтыя хвіліны на тое, што адбываецца на экране. Што такое, напрыклад, ваенная кінахроніка, якая адлюстравала і «галоўнае», і «другаснае», больш чым яскрава паказала эпапея «Вялікая Айчынная», якая толькі што прайшла па тэлебачанні. У вялікім спісе франтавых аператараў, якім завяршаецца фільм, пазначаны і тыя, хто ў апошнія гады працаваў або працуе на «Беларусьфільме»— М. Бераў, Г. Удавенкаў, І. Вейняровіч, У. Цяслюк...

Пераважная большасць мастацкіх карцін мінулых гадоў не мае такіх шырокіх магчымасцей выхаду да сучаснага гледача, як кадры кінахронікі. У лепшым выпадку іх зрэдку дэманструюць па тэлебачанні (прычым часта не ўвесь фільм, а асобныя фрагменты) у адпаведных спецыяльных перадачах. Аднак гэтыя абставіны не перашкаджаюць вылучыць любімыя тагачасным гледачом фільмы, тыя, якія адыгралі немалаважную ролю ў далучэнні мільёнаў да кінамастацтва, прыцягнулі глядацкую ўвагу высокай ідэйна-мастацкай дасканаласцю.

Тыя, хто пісалі пра першы беларускі мастацкі фільм «Лясная быль», звычайна суадносяць яго з вядомай прыгодніцкай стужкай 20-ых гадоў «Чырвоныя чарцяняты». Параўнанне гэтае невыпадковае. У названых кінатворах ёсць блізкасць тэматычная і жанравая. Іх рэжысёры І. Перасціані («Чырвоныя чарцяняты») і Ю. Тарыч («Лясная быль») выступілі таленавітымі інтэрпрэтатарамі аповесцей П. Бляхіна і Міхася Чарота. Аддаючы належнае дасягненням таго і другога фільмаў, трэба не выпусціць з-пад увагі адзін вельмі істотны аспект самога факта іх з'яўлення. Ён не можа не прыцягнуць увагу ў нашы дні, калі так актыўна дыскутуецца праблема «кіно і глядач». Дэбаты гэтыя, як вядома, выкліканы зусім не акадэмічнай цікавасцю да праблемы, а практычнай неабходнасцю — многія сучасныя фільмы не карыстаюцца поспехам у аўдыторыі гледачоў.

У сярэдзіне 20-ых гадоў, калі адбывалася ідэйна-творчае станаўленне савецкага кінематографа, на экранах кінатэатраў яшчэ дэманстравалася нізкапробная прадукцыя замежных кінафірм. І перад маладым савецкім кіно, натуральна, паўстала праблема заваявання гледача, прыцягнення яго цікавасці да фільмаў нашай вытворчасці. Гэта надзённая задача хвалявала кінематаграфістаў. «Чырвоныя чарцяняты» і «Лясная быль» якраз і з'явіліся, каб пераключыць увагу гледачоў на прыгодніцкія творы новага зместу і новых ідэй.

Відаць, менавіта ў гэтым трэба шукаць адну з галоўных прычын таго, што першым беларускім фільмам наогул была ўласціва фабульная вастрыня, што вырашыліся яны ў асноўным у прыгодніцкім жанры. Кінематаграфісты, улічваючы запатрабаванні мільёнаў тагачасных гледачоў, шукалі займальную форму паказу чалавека і падзей. Кінематографу наканавана быць зразумелым і даходлівым. Спашлёмся на выказванне Ю. Тарыча ў «Киножурнале АРК». Гаворачы пра фільмы на «вясковую» тэму ён пісаў: «Мы ўсё яшчэ стаім перад нявырашанымі пытаннямі аб метражы вясковага фільма. Мы не ведаем, як сялянскі глядач успрымае нашу доўгаметражнасць. Ці даходзяць да яго буйныя планы, які тэмп у змене асобных кавалкаў даступны... Мантаж нашых карцін мы будуем, што называецца, на вока: а раптам дойдзе? А калі не дойдзе?.. Толькі старанная праверка на вопыце дэманстрацый новых карцін перад сялянскай аўдыторыяй дасць пажаданыя вынікі... Дэтальныя ўказанні—як і ў якіх месцах рэагуе глядач, дзе ён раўнадушны, дзе смяецца, дзе кашляе і дзе глядзіць з напружаннем і ўвагай, — дадуць нам, рэжысёрам, той матэрыял, на аснове якога мы здолеем выправіць нашы памылкі...»

Канечне, сёння глядач ужо далёка не той, у яго іншая культура, іншы глядацкі вопыт. Пытання, зразумее ці не зразумее ён спецыфіку кінематаграфічнай мовы, у наш час няма. Але, разам з тым, і цяпер наўрад ці варта сумняваецца ў плённе сацыялагічнага і эстэтычнага «вывучэння гледача». Факт застаецца фактам: у нас гэтым пытанням пакуль што не надаецца належнай увагі. У размовах пра вялікае мастацтва, бывае, не ўлічваецца спажывец гэтага самага мастацтва. Хоць мы, здаецца, ужо прайшлі тую стадыю ў развіцці нашага кіно, калі асобныя карціны рабіліся з яўным намерам здзівіць і нават эпаціраваць калег ды сталых наведвальнікаў Дома кіно рознымі фармальнымі фокусамі. «З чаго будзе складацца поспех новага фільма?»— адказ на гэтае пытанне кінематаграфісты даюць не заўсёды зразумелы. У выніку пракатны лёс карцін амаль немагчыма прадугледзець.

Горкі і павучальны ўрок атрымаў наш кінематограф у пачатку 30-ых гадоў. Тады і на беларускай, і на іншых студыях быў створаны шэраг мастацкіх фільмаў так званай «вытворчай кінапубліцыстыкі». Аўтары іх закраналі надзённыя пытанні сучаснага жыцця — ролі друку ў мабілізацыі рабочых на выкананне планаў, перавагі калектыўнага гаспадарання, барацьбы з адмоўнымі з'явамі ў быце і г. д. Аднак некаторыя фільмы, нягледзячы на іх тэматычную актуальнасць, не карысталіся поспехам у гледача, бо мастацкае іх вырашэнне было плоскім, ілюстрацыйным, а характары персанажаў —адназначныя. Натуральна, кінематаграфістам давялося шукаць новыя вырашэнні новых тэм, больш уражлівыя і пераканаўчыя мастацкія сродкі.

Сёння мы з'яўляемся сведкамі таго, якой цікавай для гледача можа быць вытворчая тэма ў кінематографе. Майстры экрана падыходзяць да яе не з пазіцый ілюстратараў нейкіх агульнавядомых палажэнняў, а займаюцца мастацкім даследаваннем сапраўды рэальных праблем жыцця. У беларускім кіно, праўда, пакуль не з'явілася фільмаў на сучасную тэматыку, якія мелі б такі шырокі грамадскі рэзананс, як, скажам, «Прэмія». Творы апошніх гадоў, якія закранаюць надзённыя праблемы сённяшняга быцця — «Час яе сыноў», «Нядзельная ноч», «Сын старшыні»,— сведчаць аб плённасці творчых пошукаў кінематаграфістаў рэспублікі ў галіне сучаснай тэматыкі.

Вядома, гэта не азначае, што цікавыя і вартыя ўхвалы работы пра сучаснасць у беларускім кіно з'явіліся толькі сёння. Як не ўспомніць тут такую яркую і своеасаблівую карціну, як «Двойчы народжаны», пастаўленую Э. Аршанскім паводле сцэнарыя Р. Кобеца. Фільм расказваў аб тым, як рэвалюцыя, вялікія сацыяльныя змены нараджалі і зрухі псіхалагічныя, дапамагалі людзям знайсці сябе, вызначыць сваё сапраўднае чалавечае прызванне і месца ў грамадстве. Асноўная драматычная калізія твора — складаныя перыпетыі лёсу селяніна, пастаўленага перад неабходнасцю выбару новых шляхоў у жыцці — адлюстроўвала тыповую сітуацыю часу карэнных змен у вёсцы. У маладых кінематаграфіях саюзных рэспублік тых гадоў няцяжка знайсці фільмы з падобнымі сюжэтамі. Гэта было заканамерна. Такія сюжэты дыктавала само жыццё. Мастака ў першую чаргу і цікавілі суадносіны асобнага чалавечага лёсу з лёсам краіны, народа. У самой назве — «Двойчы народжаны»— адкрываецца задума гэтай сацыяльна змястоўнай стужкі. «У карціне,— пісала тады «Литературная газета» — ёсць штосьці незвычайна цікавае і прыгожае. Гэтая цікавасць нагадвае мяккую ўсмешку, якая асвятляе твар добрага чалавека». У газеце «Известия» адзначалася, што беларуская студыя стварыла фільм, «...з'яўленне якога на экранах Масквы трэба вітаць. Тыпы, выведзеныя ў фільме,— жывыя, сённяшнія людзі».

Глядзець гэты фільм у нашы дні, магчыма, не так лёгка — якасць плёнкі і гуку, шчыра скажам, зусім не выдатныя. Ды «матэрыяльны» бок фільма, яго тэхнічная састарэласць не перашкаджаюць убачыць сапраўды цудоўную ігру выканаўцы галоўнай ролі выдатнага беларускага артыста Уладзіміра Крыловіча. Наўрад ці я перабольшу, калі скажу — такога глыбокага пранікнення ў нацыянальны характар у нашым кінамастацтве даўно не было.

Калі мы ўжо звярнуліся да работы ў кіно артыстаў тэатра, нельга не сказаць аб значным укладзе ў развіццё кінамастацтва рэспублікі, які ўнесла такая самабытная актрыса, як Любоў Мазалеўская. Яна вельмі тонка адчувала прыроду нацыянальнага мастацтва, стыхію народнага характару. Увасобленыя ёю вобразы сялянак у фільмах «Баям насустрач», «Жанчына», «Адзінаццатага ліпеня» падкупляюць дзівоснай праўдзівасцю, гранічнай арганічнасцю паводзін яе персанажаў на экране.

У Саюзе кінематаграфістаў БССР і на мастацкіх саветах студыі часта ўзнікаюць размовы аб прычынах творчых прастояў акцёраў студыі, аб больш актыўным прыцягненні ў кіно артыстаў тэатральных калектываў рэспублікі. Гэта заклапочанасць мае сур'ёзныя падставы. Была яна і ў тыя — даваенныя гады, пра якія ідзе гаворка. Тады, як вядома, студыя знаходзілася ў асаблівых умовах, яна працавала ў Ленінградзе, кантакты з беларускім тэатрам, само сабой зразумела, у тых умовах падтрымліваць было не проста. І ў той жа час у студыі тых гадоў ёсць станоўчы «акцёрскі» вопыт. Мабыць, не ўсе ведаюць, што такія знакамітыя акцёры савецкага кінематографа, як Б. Бабачкін і Л. Кміт (у будучым вядомыя выканаўцы галоўных роляў у класічным «Чапаеве»), на працягу шэрагу гадоў з'яўляліся штатнымі акцёрамі студыі «Савецкая Беларусь». Яны былі акцёрамі, якія не марнелі ў чаканні прахадных роляў (хоць, калі ў гэтым была неабходнасць, яны не цураліся здымацца і ў эпізодах), а выступалі як акцёры-мастакі са сваёй тэмай, сваім бачаннем жыцця. Дарэчы, напэўна, не ўсе ведаюць, што Пётр Алейнікаў, сапраўды народны артыст таго часу, не па званню, а па прызнанню, — наш зямляк, магіляўчанін...

Не сакрэт, што ў нас ёсць рэжысёры, якія ўмеюць знаходзіць дзесяткі прычын, каб не ісці па шляху пошукаў новых акцёрскіх імёнаў, аддаюць перавагу выканаўцам, якія заявілі аб сабе ў карцінах іншых студый. Міма якіх бліскучых акцёраў прайшоў наш кінематограф! Амаль не здымаліся Б. Платонаў, У. Дзядзюшка, значна больш мог зрабіць у кіно Г. Глебаў... Імёнаў можна называць многа. Сутнасць у дадзеным выпадку не ў пераліку, а ў неабходнасці памятаць, што своеасаблівасць дадзенага кінематографа ўключае ў сябе і ўменне адкрываць новыя акцёрскія імёны. Творчае аблічча кінематографа, як вядома, вызначаюць і акцёры. Менавіта аб гэтым сведчыць ужо названая намі работа ў кіно ў 30-ыя гады У. Крыловіча і Л. Мазалеўскай. Аб гэтым жа сведчыць і вопыт, набыты ў наступныя гады, у прыватнасці, стваральнікамі такіх фільмаў, як «Гадзіннік спыніўся апоўначы» і «Руіны страляюць...» — Мікалая Фігуроўскага і Віталя Чацверыкова. Але, відаць, ужо даўно наступіў час, калі нельга абмяжоўвацца асобнымі ўдачамі, трэба мэтанакіравана і сістэматычна ствараць «акцёрскае аблічча» нашай студыі.

Звяртаючыся да гадоў станаўлення нашага кіно, нельга не адзначыць інтэнсіўныя тэматычныя і жанравыя пошукі кінематаграфістаў. Сцэнарыстам А. Вольным і рэжысёрам У. Корш-Саблініым быў створаны фільм-эпапея «У агні народжаная», у якім дадзена абагульненая паэтычная і філасофская карціна гістарычных шляхоў рэспублікі. Стваралися сатырычныя камедыі «Джэнтльмен і певень», «Паручык Кіжэ», лірычныя, музычныя — «Дзяўчына спяшаецца на спатканне», «Маё каханне», «Шукальнікі шчасця». З'явіліся новыя карціны, адрасаваныя дзіцячай аўдыторыі. З эпічным размахам былі паказаны на экране падзеі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны ў фільмах «Першы ўзвод», «Адзінаццатага ліпеня», «Балтыйцы», «Вогненныя гады». Некаторыя гісторыка-рэвалюцыйныя карціны ў той перыяд называлі «абарончымі». Расказваючы аб героіцы мінулага, яны былі звернуты ў сённяшняе служылі справе мабілізацыі маральных сіл народа перад пагрозай фашысцкага нападу. Менавіта з гэтым прыцэлам Ю. Тарыч і У. Корш-Саблін на студыі «Савецкая Беларусь», здымалі фільмы «Адзінаццатага ліпеня» і «Вогненныя гады», С. Эйзенштэйн і У. Пудоўкін на «Масфільме» — «Аляксандра Неўскага» і «Мініна і Пажарскага», А. Даўжэнка на Кіеўскай студыі — «Шчорса». Шматнацыянальнае савецкае кінамастацтва напярэдадні вайны цалкам жыло справамі і клопатамі народа.

Кінамастацтва нашай рэспублікі ўзнікла на аснове сцвярджэння гераічнай асобы, якая падпарадкавала сваё жыццё ідэалам рэвалюцыйнай перабудовы свету. Менавіта гэтая тэндэнцыя стала вызначальнай у далейшых творчых пошуках кінематаграфістаў. З ёй звязаны дасягненні нашага кінамастацтва і ў адлюстраванні падзей мінулай вайны, і ў мастацкім даследаванні сучаснасці. Гэтым каштоўны ўклад майстроў беларускага кіно ў кінематограф Краіны Саветаў.

Анатоль КРАСІНСКІ.

«Лясная быль» (1926).

ВОГНЕННЫЯ АФОРТЫ

НАПЯРЭДАДНІ АБАРОНЫ дыпломнай работы Анатоль Александровіч хваляваўся. Дыплом — крэда на этапе юнацтва, упершыню і на поўную сілу, на якую толькі здольны, выказанае.

«Босыя на вогнішчы» М. Чарота — першая беларуская рэвалюцыйная паэма, твор зусім новы для мастака кнігі і надзвычай складаны. Патрэбна была вялікая творчая смеласць, каб абраць яе тэмай сваёй работы. Анатоль адважыўся...

З самазабыццём і прафесійнай настойлівасцю пранік ён у экспрэсіўна - эмацыянальную тканіну паэмы, зразумеў цэласнасць яе дынамікі ў развіцці падзей ад цемры да прасвятлення і веры. Менавіта гэтая, напружаная, як электрычнае поле, канва паэмы перадала свой зарад уяўленню і фантазіі маладога мастака.

З першага позірку цяжка паверыць, аднак у гэтых лістах — не свавольная фантазія, а дакладнае следаванне тэксту паэмы. Адпаведна ўнутранай структуры Александровіч аб'яднаў афорты ў пяць тэматычных цыклаў, па тры ў кожным.

Над палямі Белай Русі
Стогне віхор, бура...

—так вызначана першая тэма.

Другая — выходзіць з яе. З халоднай цемры ўзнікае

Вайна і пажар.
На вогнішчы людзі
Жывуць босымі...

Гэты змрочны агонь разгараецца ў полымя рэвалюцыйнай барацьбы.

Змагаюцца: праца з багаццем,
Свет нова жыццё утварае,
Сышліся дзве моцныя раці,
І праўда няпраўду змагае.

Чацвёртая тэма — крах старога свету, ломка свядомасці, укладу жыцця:

Усё, што збіралі вякамі,
Сёння марнее ў агні...

І, нарэшце, — тэма азоранай надзеі:

Мы на прадвечных руінах
Працы палац пабудуем.

У паэме гэтыя тэмы своеасабліва сплецены. Паэт вяртаецца да створаных вобразаў і паўтарае іх з новай эмацыянальнай афарбоўкай. Так рытмічна паўтараюцца сімвалічныя вобразы буры, вайны, пажару, разарванага двухгаловага арла. Ад паўтору дзеянне рухаецца далей. Такі ж прынцып лёг у аснову пабудовы серыі: у кожным трохчасткавым цыкле ёсць зварот да папярэдняй тэмы, і праз яго — да развіцця дзеяння. Атрымалася надзвычай дакладная схема пабудовы вобраза серыі ў цэлым. Цэласнасць гэтага падкрэслена і агульным танальным рухам ад цёмнага да светлага, якое праходзіць праз усе афорты.

Зрокавасць колеравых вобразаў паэмы прымусіла мастака сплавіць у кожным лістку тры тэхнікі: афорт класічны (глыбокі друк), афорт негатыўны (высокі друк) і траўленне. Участкі розных тэхнік добра праглядваюцца. Халодны чорны колер негатыўнага друку — гэта колер бяды. У паэме — дарогі заносіць не белы, а чорны снег, арол малюе ўзоры ў «небе чорнаснежным». Карычневы колер па кантрасту здаецца гарачым. Ён у кантэксце лістоў спачатку слаба ўспыхвае, затым разгараецца ў вогненную буру. І хоць серыя надрукавана ўсяго дзвюма фарбамі, колькасць цёплых таноў, якія паступова выцясняюць халодныя, стварае ўнутраную дынаміку каларыту.

Адухоўленасць, то лёгкая гнуткасць, то драматычны злом і бесперапынны бег ліній, чорных на светлым фоне і мігценне светлых на цёмным, тонкасць лепкі форм дакладнымі штрыхамі — усё гэта нараджалася прама на метале, без пераводу папярэдніх малюнкаў. Для Александровіча выраб формы — сугуба творчы працэс. А значыць — немагчыма капіраваць і самы апрабаваны варыянт.

Пры ўсім абагульненым, сімвалічным сэнсе паэма Чарота глыбока нацыянальная, самабытная. Перш за ўсё тым, што ў ёй ёсць пачуццё гісторыі свайго народа. Сугучная агульнаму рэвалюцыйнаму пафасу паэзіі тых гадоў, яна, аднак, магла быць створана толькі на беларускай глебе. І гэтую яе гістарычную самабытнасць зразумеў, ёю пранікся мастак.

Нацыянальную своеасаблівасць беларускай графікі часам спрабуюць падкрэсліць увядзеннем у адлюстраванне традыцыйных арнаментаў, тых або іншых этнаграфічных дэталей. Тут — толькі нацыянальнае адзенне цэнтральнай жаночай фігуры непасрэдна і прама пацвярджае беларускае паходжанне серыі. У астатнім яно даказваецца самім вобразным ладам, адэкватным паэтычнаму. У паэме не адзін раз нагадваецца аб геаграфіі дзеяння: «Пажар на Усходзе!», «Братцы! Гляньце на Усход!». З Усходу, ад прамысловых і палітычных цэнтраў краіны ідзе полымя рэвалюцыйнай барацьбы на ўскраіны царскай Расіі. Сам вобраз барацьбы асэнсоўваецца надзвычай фальклорна — ва ўзаемадзеянні з разбуджанымі і грознымі сіламі прыроды. Матыў агню як бы прыйшоў са старажытных язычаскіх культаў, каб стаць алегорыяй свабоднай і гнеўнай стыхіі. Ён пранізвае самую структуру танальнай, лінейнай будовы серыі. І нібы па волі фантазіі безыменных творцаў народных казак узнікае чараўнічы холад сцэны вяртання князя, які не пазнае былых сваіх уладанняў і трапляе ў палон да азёрных русалак. Тонкія, светлыя і трапяткія лініі іх малюнка падобны да зіхатлівых вадзяных струменяў.

Вялікую ролю ў будове паэмы мае шматзначны сімвал крыжа, які перараджаецца з цяжкага крыжа пакут і магіл у сімвал збавення. Такое пераражэнне настолькі неабходна было паэту, наколькі народу трэба было ўкласці новы змест у форму прывычных уяўленняў пачатку веку:

Раптам вецер, вецер смелы
Крыж чырвоны нам нясе.
На крыжы чытаюць «Воля»...

Для мастака гэты сімвал стаў апорным кампазіцыйным момантам. Прычым, заўважым, што ў дахрысціянскай сімволіцы роўнаканечны крыж быў сонечным знакам. У серыі багацейшыя варыяцыі менавіта роўнаканечнага крыжа чытаюцца то адкрыта, то зашыфравана, раскрываючы самыя глыбінныя пласты яе зместу.

Выяўленчая паэма Александровіча мае поўнае права на самастойнае існаванне. Яна можа ўспрымацца і без тэксту —настолькі выразная і ёмістая яе вобразная мова, настолькі красамоўная метафарычнасць. І твор гэты, несумненна, перавышае крытэрыі звычайнага дыплома (кіраўнік — В. Шаранговіч). Адбылася тая шчаслівая падзея, калі студэнцкая работа стала творчым адкрыццём, здабыткам мастацтва.

Э. ПУГАЧОВА.

НА МОВЕ МАСТАЦТВА

Вобраз роднай прыроды неаддзельны ў нашай свядомасці ад вобраза Радзімы. Гэта паняцце і шматзначнае, і агульначалавечае, і, адначасова, інтымнае, і нават не варта спрабаваць вызначыць словамі ўсе тыя пачуцці, думкі, уяўленні, якія нараджае яно ў душы кожнага.

І мо таму, што бачыць Дзмітрый Алейнік навакольны свет у невычэрпным колеравым багацці і разнастайнасці, што любіць ён чароўную сілу далячыняў, любіць лясы, вёскі, азёры, вецер, любіць зямлю родную, прысвяціў ён сваю творчасць услаўленню прыгажосці Беларусі; піша тое, што ведае, тое, чым даражыць.

Амаль у кожнага з нас засталіся ў памяці яшчэ з маленства лясныя паляны, засыпаныя лісцем, пышныя і журботныя куточкі прыроды, сінеча неба і буслі́ны клёкат. Гэтая няпростая вобразнасць, гэтыя дарагія згадкі, што ўзнікаюць у табе перад карцінамі Алейніка, перадуманы і перажыты аўтарам.

Здзіўляе здольнасць мастака дамагацца ў работах цэласнасці агульнага стану ў прыродзе пры натуральнасці і прастаце рашэнняў такімі яснымі, чыстымі фарбамі. Выказваючы асабістае разуменне свету, жыцця, знаходзіць ён тым самым у гледачы свайго субяседніка, адкрывае менавіта для яго, а не толькі для сябе гэты свет.

У вандроўках па краіне Дзмітрыю Алейніку асабліва кінулася ў вока Поўнач. Неаднойчы пабываў ён у Карэліі. Тонкія, лірычныя пейзажы чаргуюцца з эпічнымі вобразамі гэтай зямлі, і настрой лёгкага смутку пераходзіць у бадзёрыя, яркія ўспышкі святла, застаючыся на палотнах то бязмежнымі, пакрытымі лясамі, зрэзанымі вялікімі і малымі рэкамі і балотамі прасцягамі, то помнікамі старажытнасці — велічнымі манастырамі, сціплымі драўлянымі цэркаўкамі («Над возерам», «Вечар», «Каменне», «Від на Ладагу», «Востраў Валаам»).

І ўсё ж асноўнае ў творчасці аўтара — пачуццё беларускай прыроды, пачуццё таго няўлоўнага, адухоўленага жыцця яе, якое і складае «душу». Умелы і тонкі жывапісец, Д. Алейнік не менш тонкі назіральнік. Прыгажосць ён знаходзіць у самых будзённых, знешне нічым непрыкметных, але мілых сэрцу куточках і матывах. Варта змяніцца асвятленню, стану дня ці пары года, і ў старым, неаднойчы ўжо бачаным і паўтораным сюжэце ён адкрывае новыя магчымасці. Акно, быццам рама («Асенняе акно»), абрамляе асенні пейзаж і нацюрморт на падаконніку І — як расчыненыя дзверы — кліча прайсці па сцежках саду, па ўласных успамінах.

Карціна «Вясна. Порт»—дрэвы пярэдняга плана адыгрываюць у ёй ролю заслоны, праз якую праглядваецца халодная, але ўжо «рабочая» рака. Усё будуецца на сугуччы яркіх, чыстых, нягуста пакладзеных фарбаў — каляровыя дахі ў пырсках сонца, нібы прасвечаныя караблі, вясёлая сумятня гракоў... Палатно вабіць сваёй адкрытай радасцю, светлым поглядам на свет. Яно пранізана сонцам — і не толькі таму, што мастак піша мяккімі мазкамі, кожны з якіх арганічна ўваходзіць у агульную колеравую тканіну карціны, надаючы ёй тую асаблівую, мяккую жывапісную манеру, уласцівую толькі яму. Празрыстасць, звонкасць работы набываюць яшчэ і таму, што пэндзлем мастака водзіць любоў яго да зямлі, да прыроды.

Характэрна і тое, што Д. Алейнік піша не проста з натуры, а ў майстэрні, па эцюдах, прычым амаль заўсёды захоўвае ўдала знойдзеную кампазіцыю. Прыклад — і карціна «Бабіна лета», да якой было напісана шмат эцюдаў, зроблена шмат замалёвак.

Палотны яго нагадваюць некалі бачанае, перажытае і зараз адноўленае ў памяці. У іх прысутнічае тая асаблівая магія мастацтва, якая празаічным з'явам, што прывабілі ўвагу жывапісца, надае гэўны сімвалічны сэнс («Зіма», «Цвітуць сады»).

Дзмітрый Алейнік шмат ездзіць па рэспубліцы, працуе, пастаянна аналізуе, адбірае. «Белые коні»— так называецца пейзаж, напісаны на Мазыршчыне. Далёка-далёка вядзе ўяўленне кожнага, хто здзіўлена застывае перад гэтым пейзажам,— свабодна, адкрыта гучаць рамантычныя ноты. Казачнымі эстакадамі лясы імкнуцца ў неба, ствараючы фантастычнасць жывапіснага дзеяння. Але фантастычнасць незвычайная — адчуваюцца беражлівыя, любоўныя адносіны да свету маленства і юнацтва, да зямлі як да роднай, абжытай мясціны. «Белыя коні»— работа сталага майстра са сваім індывідуальным почыркам.

Пейзаж... Гэта паўсядзённая праца, эцюды, эцюды, без якіх немагчыма ўдасканальванне. Гэта зачараванасць мастака перад хараством зямлі, калі трэба ўлавіць заўсёды зменлівыя імгненні адухоўленасці, трапятлівасці прыроды.

Стрыманы і напружаны колер, шматскладаны музычны рытм, своеасаблівае пісьмо — карціна «Вясновы матыў»— ствараюць уражанне нястрымнай, пачуццёва-жывапіснай стыхіі, будзяць у душы тугу, тую беспрычынную тугу, якую адчуваеш толькі вясной; і ў той жа час выразна чытаецца, як вычарпальна і ўпэўнена «запраграмаваў» гэтыя ўражанні мастак у кампазіцыю твора, ненадакучліва даводзячы, што ўсё будзённае побач з вечнасцю прыроды, свету становіцца маленькай частачкай «вялікага быцця», часткай таго значнага і важнага ў жыцці, за якім — яго сутнасць, сэнс.

Здавалася б, нічога новага не адкрывае аўтар і ў карціне «Пара сенакосная» — аграмаднейшы квітнеючы луг і людзі, што нібы растварыліся ў травах і сонечных промнях. Аднак за простымі прыкметамі вясковага жыцця — сённяшні дзень, неабдымнасць яго сілы, спакойнага мірнага шчасця; свята, дзе разам з квітнеючай, поўнай свежасці і сіл прыродай абуджаецца і святлее вера ў перамогу дабра і працы на зямлі.

Як бы ні былі прадуманы і пабудаваны работы Дзмітрыя Алейніка, у іх заўсёды знаходзіш жывое ўспрыманне свету, за кожнай з іх — багацце назіранняў і ўражанняў, адчуванне жыццёвай сілы шчодрай беларускай зямлі, адчуванне вечнай яе маладосці («Палескі нафтагігант», «На рацэ Сож», «Вясна на Мазыршчыне»).

Жывапіс мастака пераконвае — усё, што нас акружае, можа загаварыць на мове мастацтва. Дар пейзажыста ператварае проста дрэва, проста возера, проста зямлю і неба ў «пейзаж, які сэрцу гаворыць»... Нязменнымі ў яго пейзажах застаюцца сыноўняя любоў і пяшчота да сваёй зямлі, што дае і хлеб, і сілу, і шчасце.

Жыццёвая праўда — вось аснова ўсіх работ Дзмітрыя Алейніка. Праўда, якая спасцігаецца разумным, добрым і зоркім назіральнікам. Усё, створанае ім, пазначана пячаткай высокай культуры, інтэлігентнасці і тонкага густу.

В. СІНЯКЕВІЧ.

СУСТРЭЧЫ З СУЧАСНІКАМ

— Сядайце. Разам паслухаем перадачу, — прыязна ўсміхнуўшыся, прапанаваў мне галоўны рэдактар радыёпраграм для моладзі Васіль Уладзіміравіч Слушнік. — Раніцай у Мінску адбыўся ўрачысты мітынг, прысвечаны адпраўцы ўдарнага камсамольскага атрада «Ураджай-79» на жніво, рэпартаж аб ім пойдзе ў сённяшнім выпуску радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная»...

З дынамікаў, якія ўстаноўлены ў кабінеце галоўнага рэдактара, чуецца голас байца атрада Яўгена Грыбанава, які чытае зварот да юнакоў і дзяўчат Міншчыны. Зараз шаснаццаць гадзін. А ў семнаццаць дзесяць зварот павінен гучаць у эфіры.

Аператыўнасць... Бадай, ні адна газета, ні тэлебачанне ў гэтым для радыё не канкурэнт. Кожная мінута для радыйнікаў — на вагу золата. Акрамя рэпартажу, у перадачу ўключаны расказ аб рабоце студэнцкіх будатрадаў на алімпійскіх аб'ектах Мінска і інтэрв'ю з членамі прыёмнай камісіі філфака БДУ імя У. І. Леніна. На хранометры — 29,40. Трэба скарачаць на сорак секунд.

— Убавім музыкі, — прапануе Слушнік. — Тым больш, што яна трошкі не ў тым ключы. Занадта мінорная.

Музыка. Яна не толькі робіць перадачы больш прывабнымі, стварае настрой, але — фарміруе нашы адносіны да таго, што мы чуем. Дарэчы, «Беларуская маладзёжная» — самая музычная з усіх радыёпраграм (зразумела, калі не лічыць перадачы рэдакцыі музычнага вяшчання).

І ўсё ж, радыё пачынаецца не з музыкі. З чаго?

Давайце наведаемся ў «святая святых» радыё — студыю гуказапісу. Мы звыкліся з выразам «на хвалях эфіру», і таму дазволім сабе параўнаць рэдакцыю з караблём, а студыю гуказапісу — з яе машынным аддзяленнем. Экіпаж радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная» — дзесяць чалавек, калі не лічыць замацаваных за рэдакцыяй рэжысёра, аператара, гукарэжысёра і тэхніка. Задачы ў кожнага быццам бы розныя. Але толькі да той пары, пакуль не надыходзіць час сустрэцца на запісу.

Сёння ў студыі — запіс чарговай (саракавой па ліку) перадачы з цыкла «Пульс БАМа». За гэты цыкл у верасні мінулага года Слушнік і яшчэ два супрацоўнікі рэдакцыі адзначаны прэміяй ЛКСМ Беларусі. Лепшыя з перадач гэтага цыкла гучалі на хвалях усесаюзнай радыёстанцыі «Юнацтва».

За выступленнем аўтара ўважліва сочыць рэжысёр Сяргей Канстанцінавіч Стэфановіч. У радыёперадачы ўсё мае значэнне: дыкцыя, рытм вымаўлення, змены інтанацыі, сэнсавыя паўзы, нават тэмбр голасу. Праўда, выступленне, якое запісана на «Рэпарцёр», ужо не вельмі зменіш. У дадзеным выпадку давялося б зноў ехаць на БАМ. Але справа якраз у тым, што «папраўляць» галасы герояў перадачы часам не толькі не патрэбна, але і нельга, бо знікне такая найважнейшая якасць радыёперадачы, як дакументальнасць.

Алена Гурыновіч, якая прыехала не так даўно па камсамольскай пуцёўцы з Беларусі ў Залацінку, чытае вершы пра БАМ — свае і сваіх аднагодкаў. І яе ціхі голас, мяккія, шчырыя інтанацыі дазваляюць нам убачыць субяседніцу, пранікнуцца суперажываннем.

Даносіцца гул будоўлі. Але ён зусім не перашкаджае ўспрыманню расказа аб цудоўнай прыгажосці сібірскай прыроды.

Рэжысёр імкнецца зрабіць перадачу насычанай, «бачнай» для слухача, стварыць эфект прысутнасці. Але мастацтва дакументальнае, як і ўсякае іншае, патрабуе пачуцця меры, бо інакш эфект прысутнасці ператворыцца ў сваю супраць-легласць — эфект адсутнасці ўвагі слухача.

У расказе Алены ёсць месца, дзе яна ўспамінае, як спявала з сябрамі ў кузаве грузавіка. Зусім апраўдана, што за яе словамі ў перадачы ідзе песня пра БАМ у выкананні мясцовага маладзёжнага ансамбля. Можа, даць яшчэ і гул матора? Дакументальная дэталь! Аднак пасля кароткага абмеркавання яна была адкінута, як занадта натуралістычная.

Зразумела, ніякія «натуральныя шумы» не заменяць галоўнага ў перадачы — чалавека. Гэта яго вачамі мы бачым тое, пра што ён расказвае, ад яго індывідуальнасці ў многім залежаць і нашы адносіны да расказа. Дапамагчы субяседніку раскрыць сваю індывідуальнасць, а слухачу — зразумець праз прыватнае агульнае, — задача журналіста.

Гутарка з Аленай Гурыновіч — летуценнай, сарамлівай дзяўчынай, якая асвоіла прафесію муляра, адной з тысяч, што працуюць на БАМе, дапамагае нам убачыць гіганцкую па маштабах будоўлю з зусім нечаканага боку. Аказваецца, лірызм, задуменнасць, нават пяшчотнасць — гэтыя якасці душы ўласцівы героям «будоўлі веку», галоўная рыса іх — высокая духоўнасць.

Вось дэталь у расказе Алены. У пятніцу, увечары, людзі ў Залацінцы займаюць чаргу, каб купіць новую кнігу — з тых, што прывязуць у суботу раніцай. Карціна, увогуле, знаёмая, калі не ўлічваць таго, што адбываецца гэта ў сараказградусны мароз. І такіх дэталей у перадачы шмат.

І ўсё ж, які б цікавы ні быў субяседнік, якімі б трапнымі дэталямі ні быў насычаны яго расказ, гэтага мала, каб прыцягнуць увагу слухачоў да перадачы. Рэжысёр і аўтар імкнуцца надаць ёй максімальны дынамізм, калі хочаце — вострасюжэтнасць за кошт нечаканых хадоў аўтарскай думкі.

Галоўная зброя радыёжурналіста, натуральна, слова. Прычым, слова не напісанае, а вымаўленае — значыць, яшчэ больш непадатлівае. І ў той жа час ёсць магчымасць зрабіць яго максімальна выразным і эмацыянальным.

Сёння за пультам — Людміла Зуб. У яе руках — мікшэры на рэжысёрскім пульце. Трэба ўмець усё рабіць дакладна, акуратна, а галоўнае— без страт каштоўнага часу.

Людміла працуе на радыё нядаўна, але складаная, адказная работа ёй даверана ў поўнай меры. Увогуле, у маладзёжнай рэдакцыі — на тое яна і маладзёжная — маладых большасць. Гэта і Міхаіл Расолька, і Святлана Дубоўская, і Мікалай Кузняцоў, і Жанна Залозная, і іншыя журналісты, прозвішчы якіх добра знаёмы пастаянным радыёслухачам «Беларускай маладзёжнай». Шырокае поле для творчай дзейнасці прадастаўлена і студэнтам-практыкантам БДУ. У іх ёсць магчымасць самастойна рыхтаваць і выпускаць у эфір перадачы. Можа, гэтыя перадачы не вылучаюцца асаблівымі вартасцямі, але, на думку галоўнага рэдактара, адзіны спосаб навучыцца працаваць на радыё — гэта рыхтаваць і выпускаць перадачу ў эфір самому аўтару. На радыё вучацца працаваць непасрэдна «ля станка».

Калектыў рэдакцыі адгукаецца на ўсе з'явы, якія адбываюцца ў грамадскім жыцці. Асабліва тыя, што тычацца моладзі.

Праграмы беларускага вяшчання для моладзі пастаянна ўзбагачаюцца новымі цыкламі. Можна назваць «Камсамольскі радыёсход», «Хачу запытаць», «Праца — паняцце маральнае», «Радыёўрок якасці», «Калі ў руках падзейных эстафета» — пра настаўніцтва ў мастацтве. Новы цыкл «Вартавыя пярэдняга краю» прысвечаны воінам-пагранічнікам.

Некаторыя цыклы перадач ужо даўно знаёмы радыёслухачам. Гэта «Дыялог пакаленняў», «Субяседнік», «Радыёлетапіс народнай славы», «Рабочая змена» (перадача для навучэнцаў ПТВ), «Таварыш падлетак», музычная праграма для воінаў «Служыць Радзіме салдат», а таксама перадачы, прысвечаныя маральнаму і эстэтычнаму выхаванню — «Згода ды каханне» (аб праблемах маладой сям'і), «Узлёт» (расказы пра творчую моладзь).

Асобнае месца займае дакументальная радыёповесць «Зямля нашых турбот». Аўтары гэтага цыкла паспрабавалі стварыць летапіс працоўных здзяйсненняў камсамола, які прымае ўдзел у пераўтварэнні сучаснай вёскі, зафіксаваць працоўныя справы моладзі нашай рэспублікі. Кожная перадача гэтага цыкла гучыць як самастойны твор, а ўсе разам яны павінны стварыць дынамічную, публіцыстычна-мастацкую карціну, якую разам з журналістамі пішуць самі героі.

Акрамя творчых, у супрацоўнікаў рэдакцыі шмат арганізацыйных спраў. У прыватнасці, шмат зроблена для арганізацыі спаборніцтва моладзі на вёсцы. У гэтым годзе, напрыклад, ужо ў другі раз будзе ўручаны пераходны прыз радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная» лепшаму камсамольска-маладзёжнаму экіпажу, які вылучыўся на ўборцы ўраджаю. У час пасяўной рэдакцыя праводзіць спаборніцтва маладых аратых. Сумесна з рэдакцыяй газеты «Чырвоная змена» праводзіцца рэйд-праверка пад назвай «Жніво», а разам з маладзёжнай рэдакцыяй Беларускага тэлебачання ўстаноўлены прыз для лепшай пагранзаставы рэспублікі.

Асобна варта сказаць пра аперацыю «Хвіліна» (перадачу з такой назвай вядзе журналіст Міхаіл Расолька). Па сутнасці, гэта таксама рэйд, які праводзіцца на прадпрыемствах для выяўлення з дапамогай мясцовых камсамольскіх пражэктараў страт часу, матэрыялаў, розных арганізацыйных пралікаў. Ініцыятыва гэтых рэйдаў нарадзілася пры падтрымцы ЦК камсамола рэспублікі. Вартасць перадачы не толькі ў тым, што яна аператыўна ўскрывае недахопы ў рабоце таго ці іншага прадпрыемства, але і прымае меры для іх ліквідацыі. Часам, для таго, каб адстаяць свой пункт гледжання, даводзіцца вытрымліваць малапрыемныя гутаркі з кіраўніцтвам прадпрыемстваў, але амаль заўсёды журналіст, які паспявае дасканала вывучыць праблему, з сваёй задачай спраўляецца. У адрас перадачы прыходзіць шмат пісьмаў. У іх паведамляецца, што зроблена ў адказ на крытыку.

Наогул, работа з пісьмамі займае ў рэдакцыі адно з асноўных месц. Толькі ў мінулым годзе іх прыйшло 10000. Многа заявак на выкананне музычных твораў. І рэдакцыя ідзе насустрач слухачам — праводзіць конкурсы на самую папулярную песню месяца. А нядаўна вырашана арганізаваць агляд-конкурс песень пра моладзь, які будзе праведзены сумесна з рэдакцыяй часопіса «Маладосць».

— Апошнім часам, — гаворыць В. Слушнік, — характар пісем прыкметна змяніўся. Значна больш цяпер прыпрыходзіць пісем цікавых, змястоўных, з роздумам аб праблемах, пастаўленых у нашых перадачах.

Можна шмат расказваць пра мастака, пра артыста балета, пра тэхніку, якой яны карыстаюцца, пра творчую манеру, можна пералічваць іх работы, узнагароды, але толькі жывыя галасы ў сяброўскай гутарцы, якую так эмацыянальна і з веданнем справы ўмее весці рэдактар Святлана Дубоўская, дапамагаюць зразумець, што ж за чалавек — герой перадачы.

Чалавек — галоўны герой перадач радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». Чалавек не абстрактны, а канкрэтны, са сваімі думкамі і пачуццямі. Адзін з нас. Таму, пачуўшы знаёмыя пазыўныя, мы чакаем не толькі займальнай інфармацыі — мы чакаем сустрэчы з нашым сучаснікам.

Віталь ТАРАС.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

Алесю СТАВЕРУ—50

Вядомаму беларускаму паэту Алесю Ставеру споўнілася 50 гадоў. У сувязі з гэтым праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала яму прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Аляксандр Сяргеевіч!

Шчыра вітаем Вас і шлём свае віншаванні ў дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя.

Педагог па адукацыі, выкладчык мовы і літаратуры, Вы першыя свае вершы надрукавалі ў 1949 годзе ў барысаўскай раённай газеце «Бальшавіцкая трыбуна». Праз дзесяць гадоў Вы сталі аўтарам зборніка паэзіі «Золак над Бярозай». З кожным годам Ваш паэтычны голас набіраў моцы. На Вашым творчым рахунку некалькі кніг, у прыватнасці: «Касцёр не гасне», «Ластаўкі перад дажджом», «Лірнік». Вы паспяхова працуеце і ў жанры прозы, аб чым сведчаць кнігі «Пад канвоем», «Да сваіх».

Прыемна адзначыць, што шэраг Вашых вершаў, напісаных у традыцыі вуснай народнай паэзіі, прыцягнуў увагу кампазітараў, яны сталі тэкстамі цікавых песень («Жураўлі на Палессе ляцяць», «Колас», ты мой колас», «А мне ў шчасце верыцца» і інш.), якія шырока выконваюцца па радыё, самадзейнымі і прафесійнымі харавымі калектывамі.

Актыўны ўдзел Вы прымаеце ў грамадскім жыцці пісьменніцкай арганізацыі, часта выступаеце са сваімі творамі перад працоўнымі горада і вёскі, прапагандуеце лепшыя здабыткі беларускай літаратуры.

Жадаем Вам новых творчых поспехаў, моцнага здароўя, шчасця».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і жадае юбіляру доўгіх год жыцця, плёну ў творчай дзейнасці.

У ЖЫЦЦЁВЫМ ПАХОДЗЕ

Вёсачка Маргавіца, што побач з Бягомлем, — ціхае лясное прыволле. Вакол селішчы і ўрочышчы, лясы і балоты. Недзе тут вясковы хлапчына праходзіў нялёгкую адвечную навуку перш з пугаю ў руках, пасучы каровы, а потым з сярпом, касою і цэпам. Суровая была жыццёвая навука, цяжкі быў час, калі праходзіла гартаванне юнацкага сэрца. На свеце бушавала вайна...

Хоць А. Ставеру не давялося самому ваяваць, але ён досыць рана адчуў на сваіх плячах, што такое самае пекла вайны. Немцы ў лютай злосці не раз пасылалі на славутую Бягомльскую партызанскую зону, дзе знаходзілася родная Маргавіца, бамбавозы, якія бамбілі і абстрэльвалі не толькі зямлянкі народных мсціўцаў. Перад самым вызваленнем Беларусі, калі пачалася апошняя нямецкая блакада партызанскай зоны, аднойчы ў трывозе і начной суматосе Алесь адбіўся ад бацькоў і братоў, трапіў з многімі землякамі ў нямецкі палон. Ішоў яму тады пятнаццаты год. Немцы завалаклі пасля на здзек ажно ў далёкі Рур. Вярнуўся з канцэнтрацыйнага лагера А. Ставер дахаты толькі летам 1945 года, ужо пасля Перамогі. Дома яго ўжо не чакалі. Перажытае знайшло свой праўдзівы адбітак у кнізе «Пад канвоем» (1969)...

Сёння ў А. Ставера ёсць свая паэтычная дзялянка, на якой ён працуе даўно, з сапраўдным поспехам, уменнем і майстэрствам. Маюцца на ўвазе лірычныя вершы паэта фальклорна-песеннага складу, а таксама яго вельмі трапныя апрацоўкі народных паданняў і жартаў.

Сам паэт прызнаецца, што ў дзяцінстве прайшоў добрую вывучку ў сваіх незабыўных землякоў-маргаўчан: мудрага і дасціпнага дзеда Чэчы, бабуль Макарыхі (па бацьку) і Петрачыхі (па маці), блізкай суседкі цёткі Куліны (маці паэта Юрася Свіркі). Па сваёй сціпласці А. Ставер не адзначыў, што і яго маці была заўсёды чалавекам, улюбёным у песню. (Я сам чуў, як шчыра і з нейкай асаблівай асалодай і пачуццём спявае цётка Хрысціна!)

Народная песня, чутая ў маленстве, навек зачаравала паэта, і ён сам зараз стараецца, каб жыла яна ў чалавечым сэрцы, акрыляла яго ў жыцці, дапамагала пераадольваць цяжкасці і перашкоды. На тэксты многіх паэтычных твораў А. Ставера пісалі і пішуць песні вядомыя беларускія кампазітары — І. Лучанок, Ю. Семяняка, У. Алоўнікаў і іншыя.

Багаццем задумы, умелым выкарыстаннем скарбніц народнай мудрасці, яркай і арыгінальнай формай вызначаюцца многія гумарыстычныя і сатырычныя творы паэта. Сярод іх трэба адзначыць вялікую і сапраўдную ўдачу — верш «Скрыпка і бубен». А колькі дасціпнасці ў такіх творах, як «Дзе прычына даўгалецця?», «Балада пра чорта», «Дровы», «Запавет», «Толькі ў меру!».

А. Ставер — чалавек вельмі лёгкі на пад'ём. Ён скалясіў, выступаючы перад савецкімі воінамі, Запаляр'е і Малдавію, Далёкі Усход і Закаўказзе, наведаў Польшчу і Чэхаславакію. Гэтыя паездкі ўзбагацілі яго новымі ўражаннямі і назіраннямі, якія давалі паэту новыя тэмы і вобразы.

Дарагі Алесь! Шчасця, плёну і поспеху табе ў жыццёвым паходзе!

Сцяпан АЛЕКСАНДРОВІЧ.

ГОДНАСЦЬ ЧАЛАВЕКА І ТВОРЦЫ

МЫ РАЗВІТВАЛІСЯ З ІМ у пару залатое восені, прыгожым, сонечным днём. Разам з ім адыходзіла ў нябыт так многа нашага агульнага, а больш дакладна— нашага асабістага, такая вялікая частка нашага ўласнага жыцця і лёсу, што было да нясцерпу журботна і цяжка на душы, ад жалю і смутку сціскала ў грудзях, нібы на іх узвалілі камень, а ў галаве, да балючай атупеласці, біла ў скроні адна і тая ж думка: «Вось і ўсё... Сумленны і сціплы, аўтарытэтны і найбольш паважаны сярод пакалення нашых літаратурных старэйшын пакідае нас назаўсёды...». Мабыць, таму не магу прыгадаць ні аднаго слова з таго, што гаварыў над труной ля магілы прамоўца. Затое як зараз бачу ў натоўпе ўчарнелага Івана Мележа, а непадалёк ад яго, каля дзвюх блізнят-сосен—Пімена Панчанку, які не плача, а безгалоса рыдае, і слёзы сыпяцца ў яго з вачэй бобам. І таго, і другога бачыць проста няма сілы: гарачая хваля імгненна падкатвае і перацінае горла...

Дык з чым жа сваім мы — і старэйшыя, і маладзейшыя яго сучаснікі — развіталіся, што гэтакім горкім было развітанне? Што ён нам даў, чым надарыў нас у жыцці? Што ўсяліў ён у нашы душы і сэрцы? Чым прывабіў і прывязаў да сябе—якімі нябачнымі чароўнымі паясамі? Чым акрыліў і ўзвысіў, што нам сталі лепш відны неабсяжна шырокія далягляды чалавечнасці?

На гэтыя пытанні наўрад ці можа хто-небудзь адзін адказаць старонкай або нават цэлай кнігай успамінаў. Гэта немагчыма ўжо хаця б таму, што ў кожнага адказ на іх будзе свой — у нечым, можа быць, падобны, але ўсё-такі і непадобны на іншыя. У кожнага, хто яго ведаў, каму ён быў блізкі і дарагі, ёсць свая, «аўтаномная» біяграфія любві і пашаны да гэтага слаўнага чалавека, як і свая мера ўдзячнасці, і сваё разуменне дружбы і таварыскасці. Таму і мой адказ будзе менавіта «мой»: я паспрабую вылучыць у характары, у абліччы пісьменніка і грамадзяніна Міхася Лынькова тое, што найбольш імпануе асабіста мне, што мне здаецца істотным і значным у яго чалавечай і творчай асобе.

Зразумела, я скажу далёка не ўсё, што хацеў бы і мог сказаць пра гэтага волата нашай літаратуры, не ўсё з таго, што я ведаю аб ім, аб яго чалавечым і пісьменніцкім лёсе з яго ж уласных вусных расказаў. Мне ўпершыню ў жыцці даводзіцца пісаць успаміны, і я, прызнацца, не думаў, што гэта такі цяжкі «жанр»...

Калі маё пакаленне яшчэ толькі асвойвала школьны лемантар, Міхась Ціханавіч быў ужо вядомым, прызнаным і вельмі папулярным пісьменнікам. Гэта значыць, што, як і ўсе мае аднагодкі, я не мог размінуцца і не пазнаёміцца — у аднабаковым парадку — з ім. Так, размінуцца было немагчыма, таму што Лынькоў быў усюды і скрозь: яго кнігамі літаральна зачытваліся, асабліва — дзеці, школьнікі, моладзь. Вось чаму адтуль, з тых далёкіх даваенных гадоў, і павінен я павесці свой успамін, бо менавіта тады, у маленстве, усё і пачалося.

Чамусьці мне здаецца, што сённяшнія вясковыя школьнікі ўжо не чытаюць сваіх пісьменнікаў з тым пачуццём, з якім іх чыталі калісьці мы. Можа, я памыляюся, але мне думаецца, што цяпер гэта ўжо проста немагчыма: вельмі ўсё перайначылася ў духоўным і культурным жыцці сучаснай беларускай вёскі! Вельмі лёгкім стаў доступ да прадметаў і з'яў мастацтва, да крыніц эстэтычнай інфармацыі. Кніга, на вялікі жаль, перастае быць «цудам» і святыняй для чытача ўжо ў маленстве. З намі калісьці было трохі іначай. Па-першае, кніг у вёсцы было малавата, а падругое, кніга нам замяняла ўсё: і тэатр, і кіно, і радыё, і тэлебачанне. Кніга для нас была менавіта святыняй. Цікавую кнігу — на простай і зразумелай роднай мове—я чытаў і перачытваў многа разоў, насіў яе за пазухай, пасучы карову ў полі, хаваў пад падушку, кладучыся спаць (а раптам ды прападзе ўночы!).

Адной з такіх кніг і быў для мяне ў тыя гады зборнік Міхася Лынькова «Выбраныя апавяданні», выдадзены, здаецца, ці не ў серыі «Школьная бібліятэка». Уражанне на мяне ён зрабіў незвычайнае. І не толькі так званым зместам, драматычным і трагічным лёсам герояў, але і самім пісьмом, характарам малюнкаў і вобразаў, складам і ладам мастацкай мовы.

«...І пішу табе, дарагая мая супруга Алена, не палохайся ты... І шлю табе паклон з непераможнага палка нашага... І яшчэ табе паклон ад сырой зямлі і жадаю табе шчасця і долі, а таксама і маім дарагім сынам. І яшчэ пішу табе, што я ўжо...».

Плакала Насця, не ведала, як ліст пасылаць, калі ён не дапісаны — не дачакаўся Ванька канца дыктоўкі. Плакала Насця, і каціліся слёзы на сіратлівы мяшок салдацкі. Ванькін мяшок — яго пасылала Насця ў разанскую вёску нечаканым падарункам Ванькавай жонцы...

Васька не пісаў нікому, толькі ўсміхаўся шчаслівай усмешкай сваім таварышам, ды збялелыя вусны шапталі апошнія, незразумелыя для некаторых словы:

— Эх, позна, позна, і так рана, рана...».

Гэта чыталася і перачытвалася зноў і зноў, і помню — баяўся я, каб у такі момант ніхто з хатніх не аклікнуў і не заўважыў, што ў мяне на вачах слёзы: на дзіцячы розум здавалася, што гэта можа выклікаць у старэйшых смех і кепікі...

А недзе ў самым пачатку сорак пятага, першай — пасля трох гадоў акупацыі — супакойнай зімой, я прынёс з вясковай хаты-чытальні новы зборнік ужо знаёмага і любага мне аўтара «Астап» — неявялічкі, кішэннага фармату, томік, у мяккай вокладцы, на шэрай грубаватай паперы. Было холадна і голадна, і я чытаў гэты томік на печы, пры малюпасенькай, зробленай з пэтэрэўскага патрона, газнічцы. Кніг тады амаль не было, і я трымаў «Астапа» дома тыдні два, вяртаючыся па многа разоў да кожнага апавядання. У тыя далёкія дні мне і ў сне не магло прысніцца, што прыйдзе час—і я буду з гэтым чараўніком-апавядальнікам падоўгу сядзець побач, у адным пакойчыку, і слухаць яго такія ж цікавыя былі з ягсных жа вуснаў, і буду пазнаваць яго непаўторныя, знаёмыя па кнігах, інтанацыі, і такія характэрныя выразы і слоўцы, і такі своеасаблівы, панароднаму дасціпны, дабрадушны гумар...

Міхася Ціханавіча ўбачыў я ўпершыню зблізку летам сорак дзевятага, на 2-ім з'ездзе пісьменнікаў Беларусі. Асабіста пазнаёміліся ў 1954, калі на прэзідыуме праўлення мяне прымалі ў члены Саюза пісьменнікаў. Першая ж размова з ім, справа, якая паклала пачатак нашаму збліжэнню, адбылася на тры гады пазней.

Восенню 1957-га, даведаўшыся, што ў Міхася Ціханавіча ёсць «Бюлетэнь Першага з'езда «Маладняка», я звярнуўся да яго з просьбай дазволіць мне пазнаёміцца з гэтым цікавым дакументам (тады я быў аспірантам і пісаў дысертацыю аб маладой беларускай паэзіі 20-ых гадоў). Было гэта пасля нейкага сходу ў Саюзе пісьменнікаў. Міхась Ціханавіч ад слова даў згоду і запрасіў мяне прайсціся з ім да яго на кватэру. Па дарозе ён з уласцівай яму іроніяй успамінаў гады «маладнякоўства»: «Шумелі, шумелі здорава... Чаго-чаго, а шуму было многа. Брація была неўгамонная...». На кватэры ён правёў мяне ў свой рабочы кабінет, але не спяшаўся выканаць просьбу, каб тым самым вызваліць мяне ад няёмкасці, што займаю час у такога пісьменніка. Заўважыўшы мае нераўнадушныя позіркі на забітыя кнігамі паліцы, гаспадар паказаў мне некаторыя рэдкія выданні, а затым, на маё радаснае здзіўленне, прапанаваў мне ў якасці падарунка некалькі тамоў дакументальных матэрыялаў па гісторыі Беларусі.

— Вазьмі, юнаша, можа, што-небудзь знойдзеш цікавае. Табе яшчэ дзярзаць, а мне яны ўжо наўрад ці спатрэбяцца...

Летам 1960 года я ўпершыню прыехаў з сям'ёй на Нарач адпачываць і пасяліўся на ўскраіне Купы, у хаце пуцявога абходчыка Дубінскага (тады да Нарачы хадзіў па аднакалейцы цягнік з двума вагончыкамі — пазней нечы розум дадумаўся гэты пуць разабраць: сын чыгуначніка Лынькоў дзесяткі разоў успамінаў гэту «разумную» акцыю з гневам і абурэннем). Хата, у якой я заарандаваў веранду, стаіць яшчэ і цяпер—амаль на самым беразе возера і зусім побач з дачамі пісьменнікаў — Танка, Лынькова, Куляшова. Нарач і яе ваколіцы мне вельмі спадабаліся, і з той пары я прыязджаў туды кожны год, да таго ж самага гаспадара, і здымаў пакой на ўсё лета. Праўда, падоўгу я там не бываў, але колькі разоў прыязджаў — амаль заўсёды заходзіў праведаць Міхася Ціханавіча. На пачатку не адважваўся, але пасля — рашыўся, асабліва — калі жонка пісьменніка, Соф'я Захараўна, аднойчы сказала:

— Прыходзьце да нас у госці, Міхал Ціханавіч будзе рад. На маторцы пакатае вас па возеры...

Пра маторку, ці больш дакладна — пра Міхася Ціханавіча як гаспадара маторкі, можна было б пісаць асобную навелу. Без маторкі, як і без вечаровага вогнішча, яго жыццё на Нарачы немагчыма ўявіць. Маторка была яго вялікай уцехай і гордасцю, а адзнакай яго найвышэйшай павагі да сваіх гасцей была прапанова «пракаціцца па Нарачы да касы і назад». Гэты гонар я зведаў неаднойчы і мушу сказаць, што кожная такая прагулка была для мяне сапраўдным святам. Радасны, узнёслы настрой ахопліваў не толькі ад неабсяжнай шырыні прастору, ад чароўнага хараства краявідаў, ад лёгкага, імклівага лёту маторкі па цёмна-зялёнай гладзі возера, ад прыемнаказытлівага нарачанскага ветрыку. Радасна было яшчэ бачыць каля стырна самога старога «капітана»— з абветраным і загарэлым, парэзаным глыбокімі маршчынамі, тварам, з цыгаркай у зубах, у чорным берэце, у непрамакальнай рыбацкай куртцы і гумавых ботах, — бачыць, як свецяцца няхітрым чалавечым шчасцем яго вочы, і ведаць, што ў гэтую хвіліну ён—ужо не ён, не пісьменнік-акадэмік Міхась Лынькоў, а яго несмяротны герой, стары машыніст Андрэй Лятун — адзін з самых абаяльных вобразаў простага рабочага чалавека ў беларускай літаратуры.

— І ляцім жа, браткі! Э-эх, ляцім!.. Даганяй—не дагоніш...

Каго толькі не катаў Міхась Ціханавіч на сваёй маторцы! Помню, у якім захапленні быў ягоны госць з Балгарыі, паэт Ангел Тодараў, якога я прывозіў на Нарач летам 1965 года. Пад уражаннем цудоўнай «марской» прагулкі Тодараў напісаў тады аб Нарачы прыгожы верш:

«Амаль Неапаль» —
чую голас нечы.
Але замест: «Зірні
і памірай»—
тут кажуць: «Глянь, каб жыў
на свеце вечна,
каб не спяшаўся ані
ў які рай...».

А вечарамі каля вогнішча Міхась Ціханавіч быў ужо іншы — добры, гасцінны дзед-агнявік, які раз-пораз папраўляў доўгім кіем карчы і галавешкі ў вогнішчы і не таіў свайго якогасьці язычніцкага захаплення гэтай векавечнай стыхіяй прыроды. Смалістыя пні для вогнішча Міхась Ціханавіч карчаваў у лесе сам і прывозіў на калясцы-двухколцы сам — на дрывотні іх заўсёды меўся ладны запас. Каля вогнішча збіраліся суседзі, перш-наперш дзеці, прысутнаць якіх вельмі цешыла гаспадара, адчувалася, што яму добра сярод іх звонкагалосай мітусні. Зрэдзь часу ён звяртаўся да каго-небудзь з малых з хітраватым пытаннем, пасля чаго—ужо для ўсёй грамады—выдаваўся жартоўны, але далікатны расказ пра нейкі нялепшы ўчынак прысутнага «героя дня». Ушчуваў дзед Міша так, што крыўдаваць не прыходзілася.

Як любіў Міхась Ціханавіч дзяцей, як тонка разумеў душу маленькага чалавека — гэта ведаюць усе, хто чытаў яго цудоўныя аповесці і апавяданні «Міколка-паравоз», «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў», «Янка-парашутыст» і інш. Без вялікай любві і павагі да дзіцяці, без дасканалага ведання дзіцячай псіхалогіі такія рэчы напісаць немагчыма. І вядома ж, колішні настаўнік (а быў Міхась Ціханавіч настаўнік прыродны) у гутарках з дзятвою заўсёды заставаўся педагогам.

Аднойчы мне давялося ўдзельнічаць у яго сустрэчы з атрадам піянераў-турыстаў (такія атрады — з надзеяй пабачыць і пачуць жывога славутага пісьменніка — спыняліся на беразе Нарачы часта). Заходзіць да нас Соф'я Захараўна і кажа мне:

— Міхал Ціханавіч просіць вас падысці на падмогу — там яго атакавалі школьнікі...

Я, вядома, разумеў, што нічыя падмога ў такой справе Міхасю Ціханавічу непатрэбна, але запрашэнне прыняў з ахвотай і пайшоў. Мне было цікава самому паглядзець на сустрэчу.

Непадалёк ад дарогі, у цяньку пад соснамі, сцішана сядзеў атрад і слухаў «жывога славутага пісьменніка». Міхась Ціханавіч гутарыў з піянерамі сур'ёзна, як з дарослымі, нават вельмі сур'ёзна — ніякага «забаўлення» і ў паміне не было.

— Вы сюды, да берага, праз лес ішлі, дарожкай? Бачылі, што зрабілася з гэтым калісьці цудоўным борам, на што ён стаў падобны? Амаль не пад кожным дрэвам сметнік: газеты, бляшанкі, бутэлькі... А колькі чарнеецца папялішчаў, колькі пассяканых, пакалечаных сасонак, дзе спыняліся на начлег турысты... Дзікунства ўсё гэта, варварства. З прыродай так абыходзіцца нельга. Якое ж наша жыццё будзе без гэтага багацця і красы...

Я ведаў, як хвалюе Міхася Ціханавіча праблема аховы прыроды —на гэту тэму мы гутарылі з ім неаднойчы. Пра дзікунства, якое чынілі ў нарачанскім лесе турысты — пераважна моладзь, ён гаварыў заўсёды з вялікім абурэннем. Вельмі засмучала яго, што ў школах кепска пастаўлена справа выхавання ў дзяцей беражлівых адносін да прыроды, выхавання пачуцця любасці і замілавання яе чароўным хараством.

— Яны ж — будучыя гаспадары зямлі, краю, усіх яго прыродных багаццяў. Кепска будуць гаспадарыць, калі цяпер, у дзіцячым узросце, не зразумеюць гэтага...

Каля вогнішча — спачатку на самым беразе возера, а ў апошнія гады на падворку — я бываў рэдка: там гаворка вялася з усімі прысутнымі і звычайна пра падзеі «мясцовага значэння», бытавыя, дробязныя. Куды больш падабалася мне пабыць з Міхасём Ціханавічам сам-насам і пагутарыць пра рэчы сур'ёзныя або паслухаць яго ўспаміны. А ўспамінаць яму было што — ого, колькі хавала яго моцная, жывая памяць! Шмат я даведаўся ад яго такога, чаго ні ў кнігах, ні ў архівах не вычытаць. Тут і літаратурна-грамадскае жыццё 20-ых і 30-ых гадоў, ваенная і пасляваенная пары, і эпізоды з дзейнасці вядомых дзяржаўных і партыйных людзей, з якімі яму як старшыні Саюза пісьменнікаў даводзілася сустракацца, і штрыхі і дэталі да партрэтаў Янкі Купалы, Якуба Коласа і многіх іншых беларускіх, а таксама рускіх паэтаў і пісьменнікаў. На вялікі жаль, не ўсё з яго расказаў і ўспамінаў я здагадаўся ўслед запісаць, хаця і запісаў нямала.

Дзе ў нас адбываліся гэтыя сур'ёзныя, узаемна-даверлівыя гутаркі? Часткова — каля агню таксама, толькі — каля агню асаблівага: у лазенцы. Так каля печы ў лазенцы — пакуль весела патрэсквалі дровы і цягам некалькіх гадзін грэлася ў чыгунным чане вада. Лазенка — гэта тыпу зямлянкі — была зроблена на мяжы дзвюх сядзіб — Лыньковай і Куляшовай — і належала абодвум гаспадарам, але мне не даводзілася бачыць, каб Аркадзь Аляксандравіч «качагарыў» калі-небудзь у ёй. Затое Міхась Ціханавіч рабіў гэта з асаблівым задавальненнем. Цалкам народны характар, ён любіў і вытапіць лазенку, і папарыцца ў ёй. У першыя гады, прызнацца, Міхась Ціханавіч запрашаў мяне (праз пасыльнога) ужо на ўсё гатовае— адно забірайся на палок ды хвашчыся. Пазней я пачаў памагаць яму «качагарыць» — тым больш, што ў гэтым была патрэба: хвароба яго прагрэсіравала, дыхаў ён усё цяжэй, часам заходзіўся, задыхаўся ад кашлю.

— Так, юнаша, усё дагарэла, вада гатова, будзем канчаць гэту музыку... Я эвакуіруюся наверх, а ты, пане, выграбі і вынесі жар, вымеці попел акуратненька, бо гэта дзела ўжо не па мне — магу ўдыхнуць пылу гарачага... Ды і пачнём у добры час...

Звычайна Міхась Ціханавіч прапаноўваў мне прыходзіць пазней — ужо к заключнаму этапу «качагарання», але я стараўся заявіцца ў самым пачатку, бо самае цікавае і было якраз пасядзець побач на нізенькім зэдлічку перад зыркай квадратнай зяпай мураванай печкі і паслухаць няспешны, спакойны расказ-успамін аб мінулым. Напрыклад, аб тым, як малады настаўнік Лынькоў зрабіўся журналістам, а пасля — пісьменнікам.

— Калі і як вы, Міхась Ціханавіч, упершыню сутыкнуліся з літаратурай на роднай мове? Вы ж у Рагачоўскай семінарыі

(Заканчэнне на стар. 14.).

ПРАМЕНІЛА ДАБРЫНЯ...

Да 100-годдзя з дня нараджэння Цодзіка ДАЎГАПОЛЬСКАГА

Лаўрэат Ленінскай прэміі Сяргей Селіханаў казаў, што ён выбраў прафесію, а значыць, і лёс свой, пад уплывам адной гутаркі. Да іх, дзетдомаўцаў у Оршы, аднойчы завітаў «літаратар». Невялічкага росту, звычайны на выгляд, вясёлы і знаходлівы: яго не бянтэжылі самыя смелыя воклічы з залы. І ён сказаў, што за парогам дзіцячага дома іх, гэтых зухаватых хлопцаў, чакаюць рэверсы паравозаў, штурвалы самалётаў, пісьмовыя сталы, майстэрні скульптараў... Высветлілася, што «літаратар» — гэта вельмі таленавіты і працавіты чалавек, які робіцца пісьменнікам, а «скульптар» — гэта ганчар, які развівае свае здольнасці да таго, што з-пад яго рук выходзяць партрэты і помнікі. «Я тады сказаў сабе: буду скульптарам, — прызнаваўся С. Селіханаў і дадаваў: — Дзякуй Цодзіку Львовічу Даўгапольскаму! Гэта ён прыязджаў тады да нас у Оршу...».

Пісьменнік Цодзік Даўгапольскі і па жыццёваму вопыту быў выхавацелем. Ён шмат гадоў працаваў у дзіцячых установах, быў сярод тых, хто аддаваў цяпло свайго сэрца і багацце сваіх ведаў сіротам яшчэ грамадзянскай вайны і першых паслярэвалюцыйных гадоў. Дзетдомавец — паняцце для яго вельмі ёмістае, і ён спяшаўся да падлеткаў, каб паклікаць іх, усяліць у іх душу прагу і веру ў рэальна ажыццявімую мэту. Калі ён пісаў на роднай

яўрэйскай мове фельетоны і празаічныя творы, калі потым стаў аўтарам некалькіх кніжак прозы на рускай мове, чытачы адчувалі, што да іх звяртаецца патрабавальны і чулы чалавек, у таленце якога найяскраўшая рыса — спачуванне. Чужому гору, крыўднаму лёсу, адзіноце, нястачы і прыніжанасці. Мабыць, таму так цягнуліся чытачы да яго рамана «Каля адчыненай брамы» (1931 г.), да аповесці «Агітцягнік» (1933 г.), да рамана «Шоўк» (1933 г.), да кніг «Это было давно» (1950 г.), «На берегах Сылвы» (1955 г), «На рассвете» (1957 г.). Таму так цёпла сустрэла наша грамадскасць і яго ў пэўным сэнсе кнігу-справаздачу «Пять лепестков» (1959 г.), выдадзеную да 80-годдзя пісьменніка. Яна была апошняй у творчасці гэтага добрага душой, клапатлівага сэрцам мастака, які так аддана служыў дзецям і іх інтарэсам.

Р. СТРАШНЯ.

ПРАПАГАНДЫСТ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Да 70-годдзя з дня нараджэння Паўла КАБЗАРЭЎСКАГА

Больш за сорак гадоў плённай, натхнёнай працы, дзесяткі перакладзеных твораў — такі вынік жыцця вядомага прапагандыста беларускай літаратуры Паўла Кабзарэўскага. З яго дапамогай усесаюзны чытач пазнаёміўся з вершамі Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, К. Буйло, П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова; апавяданнямі, аповесцямі і раманамі З. Бядулі, П. Галавача, М. Лынькова, І. Мележа, І. Шамякіна і іншых вядомых беларускіх пісьменнікаў, П. Кабзарэўскі перакладаў таксама п'есы Я. Купалы, Я. Коласа, Э. Самуйлёнка, уважліва сачыў за развіццём маладых талентаў, клапаціўся, каб у ленінградскіх літаратурных выданнях былі прадстаўлены творы беларускіх пісьменнікаў.

Нарадзіўшыся ў Магілёве, пастаянна жывучы ў Ленінградзе, ён ніколі не парываў сувязі з роднай зямлёй, у светлыя дні і ў дні горычы заўсёды сэрцам і думкамі быў з ёй. У гады вайны, знаходзячыся сярод абаронцаў Ленінграда, пераносячы ўсе цяжкасці фашысцкай блакады, П. Кабзарэўскі турбаваўся за лёс родных мясцін. А. Бялевіч успамінаў, што пісьменнік хваляваўся, а ці знойдзе ён сваіх родных, знаёмых, суседзяў у Магілёве.

У пасляваенныя гады П. Кабзарэўскі прымаў актыўны ўдзел ў рабоце з'ездаў беларускіх

пісьменнікаў, у абмеркаванні кніг, часопісаў, выступаў ініцыятарам, пастаянным удзельнікам і арганізатарам шматлікіх мерапрыемстваў, што праводзіліся ў горадзе на Няве, па прапагандзе беларускай літаратуры. Вядомы ён і як складальнік, рэдактар кніг, калектыўных зборнікаў. Глыбокую ўдзячнасць заслугоўвае за тое, што многім ленінградскім пісьменнікам здолеў перадаць сваю любоў да беларускай літаратуры, прыцягнуць іх да перакладчыцкай работы.

Не будзе перабольшаннем сказаць, што П. Кабзарэўскі жыў і дыхаў беларускай літаратурай. З яго перакладаў можна скласці цэлую бібліятэку беларускіх кніг.

З вялікай павагай ставіліся да П. Кабзарэўскага і беларускія пісьменнікі. Яны дасылалі яму свае творы, выказвалі ў лістах і пры сустрэчах шчырыя словы прызнанасці і ўдзячнасці. Так, І. Шамякін адрасаваў П. Кабзарэўскаму раман «Сэрца на далоні» з цёплым надпісам на рускай і беларускай мовах: «Павлу Семёновичу Кобзаревскому, моему доброму другу и переводчику, с самыми сердечными пожеланиями, в знак нашей дружбы... Прымі маё сэрца на далоні. Для цябе яно заўсёды як на далоні. 20 ліпеня 1964 г.».

З цёплымі пачуццямі дасылалі яму свае кнігі П. Глебка, А. Звонак, А. Бялевіч і многія іншыя пісьменнікі. Над пісьмовым сталом перакладчыка ў яго ленінградскай кватэры пачэснае месца займалі здымкі многіх беларускіх літаратараў, якіх ён лічыў блізкімі і роднымі людзьмі, хацеў бачыць і адчуваць заўсёды побач з сабой.

З гордасцю сачыў П. Кабзарэўскі за поспехамі нашай рэспублікі. Неяк у адным з пісем ён прызнаўся: «Любоў да сваёй роднай Беларусі я захаваю да апошняга свайго ўздыху». Асабліва ён любіў Магілёў. У апошні раз у горадзе юнацтва П. Кабзарэўскі пабываў у 1968 годзе, калі ўдзельнічаў у літаратурных вечарах, прысвечаных 50-годдзю БССР і Кампартыі рэспублікі. Ён хадзіў па знаёмых вуліцах і не пазнаваў іх. Пісьменніка радавалі гэтыя шматлікія перамены. Ён нібы скідваў груз гадоў і адчуваў сябе па-ранейшаму маладым. Добра сказаў пра гэтую непарыўную сувязь ленінградскага пісьменніка з родным краем П. Прыходзька ў вершы, прысвечаным памяці П. Кабзарэўскага:

Ад Магілёўшчыны рабочай
У пасівелыя гады
Ты ў ясным ззянні белай ночы
Ішоў праз край свой малады.
З табой гамоняць ціха дрэўцы
І над Нявой, і над Дняпром.
І адгукнецца песня сэрцу
Зямлі, дзе быў юнацтва дом.

Цімох ЛІЯКУМОВІЧ.

ГОДНАСЦЬ ЧАЛАВЕКА І ТВОРЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 13).

беларускіх кніг не чыталі? Ці здаралася чытаць што-небудзь?

— Якое там!.. Не толькі не чытаў, а наогул, нічога аб ёй не чуў і не ведаў, што ёсць такая... Ды і з мовай не так проста было. Я нарадзіўся і пачаў жыццё на Лёзненшчыне, на самай мяжы з Расіяй. А яшчэ бацька — чыгуначнік, на службе стараўся, вядома, карыстацца мовай дзяржаўнай, хоць і ў беларускім фанетычным афармленні. Калі пераехалі на Гомельшчыну, я многіх слоў проста не разумеў... У Рагачоўскай настаўніцкай семінарыі— яна была ўтворана ў 1911 годзе — нічога з беларускай літаратуры не траплялася. Гэта не Слуцкая і не Нясвіжская, дзе беларушчына чулася хоць трохі. У нашай ніводнай кнігі на беларускай мове я і ў вочы не бачыў. Пасля арміі, у 1922 годзе, стаў настаўнікам на Рагачоўшчыне, выкладаў літаратуру і гісторыю. Неўзабаве пачаў папісваць вершы — на рускай мове, канечне, пасылаць у бабруйскую акруговую газету допісы — таксама на рускай. Але ў 1924 годзе прыехаў у нашу школу з Бабруйска інспектар аддзела народнай асветы Янка Журба. Як зараз бачу: у пенснэ, у чорным шынялі з ініцыяламі на пятліцах — відаць, яшчэ дарэвалюцыйны чыноўніцкі... Я не чуў раней і пра яго, не ведаў, што ёсць такі літаратар. Але мне сказалі: «Гэта ж вядомы беларускі паэт!» Быў ён у мяне на ўроку, урок пахваліў, а пасля мы доўга з ім гутарылі. Тады я і адчуў, што ёсць беларуская літаратура, і наогул зразумеў сёе-тое, немалаважнае для свайго далейшага лёсу... Праз нейкі час мяне як прафсаюзнага актывіста і кандыдата ў члены партыі рэкамендавалі на працу ў акружны камітэт прафсаюза «шкрабаў» — школьных работнікаў. Але рэдактар бабруйскай газеты, маленькі, рухавы Саламон Праўда перахапіў мяне і назначыў сакратаром рэдакцыі. Так я зрабіўся газетчыкам. Ну, тут ужо прыйшлося паварушыцца наконт роднай мовы, проста-такі давялося падзаняцца. Выйсця не было— газета ж беларуская...

Я слухаў Міхася Ціханавіча і думаў: вось вам і Янка Журба — сціплы працаўнік асветы і сціплага таленту паэт. А калі б не ён, не яго прыезд ў Сверж-анскую школу — як бы павярнуўся лёс вясковага настаўніка Лынькова? Напэўна, ён стаў бы выдатным беларускім пісьменнікам і без той размовы з Журбою. І ўсё-такі, і ўсё-такі... Як многа можа значыць для маладога чалавека адна нечаканая сустрэча, адна размова — няхай сабе і не бог ведае з якім мудрацом ці «свяцілам»!..

З многіх успамінаў Міхася Ціханавіча, ягоных згадак пра, можа быць, не такія і значныя, нават дробныя эпізоды свайго жыцця, перада мной паўставаў вобраз Чалавека, Пісьменніка і Камуніста з вялікай літары. Здзіўленне і глыбокую павагу выклікала яго чалавечая сціпласць і сумленнасць. Але раней, чым з успамінаў, гэтыя рысы яго характару адкрыліся для мяне з аднаго эпізоду, што адбыўся на маіх вачах. Гэта было ў пачатку шасцідзесятых гадоў. У Саюзе пісьменнікаў ішло абмеркаванне перспектыўнага плана выданняў беларускай літаратуры. Тагачасны старшыня Камітэта па друку Р. В. Канавалаў паведаміў прысутным, што ў бліжэйшы час запланавана выдаць шматтомныя зборы твораў народных паэтаў і пісьменнікаў Крапівы, Лынькова, Танка, Куляшова, Броўкі. Усе прынялі гэта паведамленне станоўча, з прыхільнасцю: маўляў, канечне, пара ажыццявіць такія выданні. Запярэчыў толькі адзін з прысутных: Міхась Лынькоў. Ён падняўся і папрасіў ягоны збор твораў не ўключаць на бліжэйшыя гады. «Можа, пасля калі-небудзь, пазней...» Насуперак довадам і ўгаворам здзіўленых таварышаў, Міхась Ціханавіч катэгарычна настойваў на сваім і «перамог». Гэта быў, вядома, урок сціпласці для маладзейшых, але, здаецца, не надта да яго ўрока прыслухаліся, не надта кінуліся браць прыклад.

Трэба сказаць, што не падабаліся, вельмі не падабаліся Міхасю Ціханавічу празмерныя прэтэнзіі некаторых літаратараў на ўвагу і на месца ў сучасным літаратурным працэсе. Не падабаліся, бо ў гэтым ён бачыў несур'ёзныя, безадказныя адносіны да працы, бачыў разбурэнне творчай асобы, разбэшчанне таленту...

— На многіх зрабіла ўражанне, Міхась Ціханавіч, што вы ў нядаўнім артыкуле не толькі пахвалілі, але і трохі паўшчувалі прызнанага і папулярнага аўтара. Як гэта вы адважылі-ся?..

Міхась Ціханавіч, у хатняй «амуніцыі», сядзеў на ложку ў сваёй «галубятні» — так ён называў невялікі пакой у паддашшы, з зашклёнымі дзвярамі на балкон і відам на возера. Ён хітравата ўсміхнуўся і на маё пытанне адказаў:

— Ну, калі і я не скажу яму гэтага, дык хто яму скажа?..— Усмешка знікла, і ён працягваў ужо зусім сур'ёзна, нават з непрыхаваным незадавальненнем і дакорам. — Так жа нельга!.. Што ж ён сабе думае? Куды ён спяшаецца? Даў бог талент, дык трэба яго шанаваць, а не раскідвацца ім, не хапацца за пятае-дзесятае... Цяп-ляп тапаром — у літаратуры так не гадзіцца...

А яшчэ не любіў Міхась Ціханавіч людзей хамаватых, нахрапістых, бесцырымонных. Ненавідзячы фанабэрыстасць, надзіманасць, панскасць, Міхась Ціханавіч быў, аднак, у высокай ступені надзелены пачуццём уласнай чалавечай годнасці. Падхалімства, падлізніцтва былі для яго проста агідныя.

Многа разоў пасля вечаровых гутарак над Нараччу я думаў аб тым, што з-за гэтых рыс свайго характару Міхасю Ціханавічу даводзілася трапляць у сітуацыі цяжкія, пакутлівыя для душы. Справа ў тым, што ён, пры сваёй незвычайнай сціпласці і добрасумленнасці, быў у той жа час чалавекам і камуністам выключнай партыйнай дысцыплінаванасці. Праз гэта ён вымушаны быў нярэдка рабіць тое, што, як выдатны пісьменнік-мастак, мо і не павінен быў рабіць. Напрыклад, яго абавязалі перакладаць на беларускую мову «Капітал» Маркса. (Першы том ён, тагачасны старшыня Саюза пісьменнікаў, пераклаў у саўтарстве з будучым міністрам асветы БССР П. В. Саевічам). Уяўляю, колькі ўзяў у яго часу навуковы пераклад гэтай вялікай «бібліі палітэканоміі»!

— Ды яшчэ і шуму было, — успамінаў Міхась Ціханавіч. — Не паспеў выйсці ў свет том, а ўжо адзін адказны таварыш, па прозвішчу Ладыжын, выступіў у друку з разгромным артыкулам за мову перакладу. «Што гэта за «памылка»? Гэта што — «памыйніца»? — здзекаваўся ён. «Што гэта за «скарбы»? Ніякай «скорби» ў Маркса няма!» і г. д. Тады я даў у газеце «Літаратура і мастацтва» адказ, у якім высмеяў яго невуцтва і непісьменнасць. Ладыжын кінуўся да першага сакратара ЦК КПБ П. К. Панамарэнкі. — «Панцеляймон Кандратавіч, вы чыталі? Лынькоў абнаглеў — далей няма куды: публічна збівае кіраўнічыя партыйныя кадры! Трэба неадкладна зрабіць вывады!...». А. Панамарэнка і кажа: «Чытаў. Так, трэба зрабіць вывады — трэба вас неадкладна знімаць з работы. Вы, аказваецца, не на сваім месцы». Неўзабаве мой крытык апынуўся на іншай пасадзе — узначаліў выдавецтва «Народная асвета». Думаю, што ён і там быў не на сваім месцы...

У верасні 1971 года паехалі мы ў Мядзел на сустрэчу са школьнікамі: Васіль Быкаў, Мікола Аўрамчык і я. Пасля выступлення рашылі падскочыць у Купу—праведаць Міхася Ціханавіча: зналі, што ён яшчэ там (з Нарачы ў Мінск Лынькоў звычайна перабіраўся ўжо ў кастрычніку). Чацвёртым з намі сабраўся ехаць дырэктар школы К. А. Каратай, мой былы аднакурснік па філфаку, а таксама і яшчэ адзін слаўны хлопец — Мікола Пацкевіч, выпускнік беларускага аддзялення БДУ, настаўнік Сваткаўскай школы на Мядзельшчыне. Чалавек, бясконца закаханы ў паэзію, у літаратуру. Паэтаў і пісьменнікаў ён проста абагаўляў. Са Сватак у Мядзел ён прыязджаў спецыяльна на сустрэчу з намі. З фотаапаратам і блакнотам, куды запісваў кожнае слова гасцей. Даведаўшыся, што мы маем намер заглянуць да Лынькова, ён ажно застагнаў: так яму хацелася пабыць у славутага пісьменніка. Але «Масквіч» браў толькі чатырох пасажыраў. Мікола ўзмаліўся: «Ды я абаранкам скручуся, толькі вазьміце! Калі яшчэ змагу пабыць у гасцях у Міхася Ціханавіча!..». Быкаў сказаў: «Ну, Мікола, у выпадку чаго—з міліцыяй будзеш гаварыць сам...» Божа, да чаго ж несправядлівы бывае да людзей лёс! Праз некалькі месяцаў гэтага апантанага ў любові да роднага слова настаўніка не стала: ён памёр у трыццацігадовым узросце ад страшнай хваробы веку.

Міхась Ціханавіч не чакаў у такі некурортны сезон — восенню — гасцей і быў вельмі ўзрадаваны нашаму прыходу. Шчыра, сардэчна вітаўся з кожным, не бавячыся, дастаў з шафы бутэльку каньяку і маленькую срэбраную чарачку.

— Гэта чарачка не абы-якая, — сказаў ён, звярнуўшыся да нас. — Я знайшоў яе на папялішчы Купалавай хаты летам сорак чацвёртага, як толькі вярнуліся ў спалены Мінск. Гэта чарачка Івана Дамінікавіча. Так што прашу, таварышы, прычасціцца, асяніўшыся светлым вобразам вялікага песняра...

Успамінаю гэты візіт пашаны і любові і дужа горка мне ўсведамляць, што ўжо ніколі не ўбачу і не пачую таго, чыё праўдзівае, чарадзейнае слова і само імя так многа значылі для нас, яго ўдзячных вучняў, таго, чыя прысутнасць у роднай літаратуры не дазваляла драбнець і мізарнець ні душою, ні думкай, а прымушала з высокай годнасцю несці па жыцці званне чалавека і творцы.

Ніл ГІЛЕВІЧ.

МІНСКІ ІНСТЫТУТ КУЛЬТУРЫ

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ

СЛУХАЧОЎ НА ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

на 1979—1980 навучальны год

З АДРЫВАМ АД ВЫТВОРЧАСЦІ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

бібліятэказнаўства і бібліяграфія (спецыялізацыі: бібліятэказнаўства і бібліяграфія грамадска-палітычнай літаратуры, бібліятэказнаўства і бібліяграфія тэхнічнай літаратуры, бібліятэказнаўства і бібліяграфія дзіцячай літаратуры, бібліятэказнаўства і бібліяграфія мастацкай літаратуры і мастацтва, бібліятэказнаўства і бібліяграфія сельскагаспадарчай літаратуры);

культурна-асветная работа (спецыялізацыі: арганізацыя і методыка культурна-асветнай работы, рэжысура самадзейных тэатральных калектываў, рэжысура клубных масавых прадстаўленняў, харавое дырыжыраванне, харэаграфія, аркестравае дырыжыраванне — аркестры народных інструментаў, эстрадна-духавыя аркестры).

Тэрмін навучання — 8 месяцаў.

Прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю з ліку перадавых рабочых, калгаснікаў і звольненых з радоў Савецкай Арміі па накіраваннях прамысловых прадпрыемстваў, будоўляў, арганізацый транспарту і сувязі, геолагаразведвальных арганізацый, саўгасаў, калгасаў і камандавання воінскіх часцей.

Паступаючыя на падрыхтоўчае аддзяленне павінны мець працоўны стаж не менш чым адзін год, які павінен быць бесперапынным на працягу апошняга года работы на дадзеным прадпрыемстве (у калгасе) у якасці рабочага або калгасніка.

Для паступлення на падрыхтоўчае аддзяленне неабходна прадаставіць: заяву, накіраванне на падрыхтоўчае аддзяленне (форма № 1 або № 2), дакумент аб сярэдняй адукацыі (арыгінал), характарыстыкі (вытворчую або службовую, камсамольскую або партыйную), выпіску з працоўнай кніжкі, шэсць фотаздымкаў (3×4 см), медыцынскую даведку (форма № 286).

З паступаючымі на падрыхтоўчае аддзяленне перад залічэннем прыёмная камісія праводзіць індывідуальнае субяседаванне з мэтай выявіць веды па праграмах уступных экзаменаў у ВНУ.

Навучэнцам на падрыхтоўчым аддзяленні выплачваецца стыпендыя ў памеры, устаноўленым для студэнтаў першага курса інстытута.

Іншагароднім слухачам прадастаўляецца інтэрнат.

Слухачы падрыхтоўчага аддзялення пасля заканчэння навучання здаюць выпускныя экзамены па дысцыплінах, па якіх прадугледжана здача ўступных экзаменаў пры прыёме на адпаведныя факультэты інстытута.

Асобы, якія паспяхова здалі выпускныя экзамены, залічваюцца на першы курс дзённага адзялення адпаведнай спецыяльнасці.

Дакументы на падрыхтоўчае аддзяленне прымаюцца з 20 верасня па 31 кастрычніка.

Субяседаванне — па выкліку інстытута.

Заняткі — з 1 лістапада.

З'яўленне на субяседаванне і на заняткі—па выкліку інстытута.

Дакументы накіроўваць па адрасу: 220001, г. Мінск, Рабкораўскі завулак, 8, інстытут культуры, падрыхтоўчае аддзяленне.

Даведкі па пытаннях прыёму на падрыхтоўчае аддзяленне: інстытут культуры, пакой № 225 (2-гі паверх); тэл. 25-36-75.

РЭКТАРАТ.

Вуглавы штамп
прадпрыемства
(арганізацыі)
Дата выдачы і №

РЭКТАРУ
Мінскага інстытута культуры

Тав. _____

_____
(прозвішча, імя, імя па бацьку)
згодна рашэнню агульнага сходу _____

_____
(рабочых, калгаснікаў, ваеннаслужачых)

_____
(назва прадпрыемства, арганізацыі)

_____
(№ пратакола і дата)

_____
накіроўваецца на навучанне на падрыхтоўчае аддзяленне пры Мінскім інстытуце культуры.

Кіраўнік прадпрыемства
(арганізацыі)
Гербавая або круглая пячатка
прадпрыемства (арганізацыі)
Заўвага: дадзенае накіраванне не з'яўляецца накіраваннем на навучанне ў інстытуце.

ЗАЙМАЛЬНАЯ ПРОЗА

(Працяг. Пачатак у №№ 14—31).

Прыватны дэтэктыў Арэс упарта шукае забойцу свецкай прыгажуні Сусаны Дэіас, але пакуль што дарэмна: большая частка западозраных ім былых паклоннікаў забітай маюць алібі або іншыя доказы невінаватасці.

Загадкавае забойства гаспадара ігральнага дома Верцьентэса яшчэ больш заблытвае справу. З'яўляецца падазрэнне, што Арэс забіў Верцьентэса.

Да Арэса прыходзіць кітаянка Лю-мей. Яна шмат чаго расказвае пра антыквара Батлера, якога добра ведала, і пра каштоўную шкатулку — свяшчэнную рэліквію кітайскай секты Лонгаў, — якая трапіла да прафесійнага крымінальніка Шасціпальца. Але апошні не ведае, што знаходзіцца там, у сакрэтным аддзяленні шкатулкі.

Хуглар Арэс бачыць, што Лю-мей і, вядома, Батлер прагнуць набыць каштоўную ўрну.

— Цудоўна, — сказаў я, пазіраючы на Каіту. — Рамераль пайшоў, і прыйшоў сенатар. Што адбылося потым?

— Нічога, — адказала Каіта.

— Як — нічога?

— Нічога. Праз некаторы час сенатар выйшаў ад Сусаны і павёз мяне дадому ў вёску.

Я гучна засоп.

— Давайце па парадку, шаноўная, — прабурчаў я. — Сенатар знаходзіўся ў спальні Сусаны...

— Правільна, — сказала Каіта. — Яны аб нечым спрачаліся.

— На высокіх танах?

Каіта зірнула на сенатара.

— Так, — адказала яна, крыху павагаўшыся.

— Потым сенатар выйшаў, а Сусана засталася адна?

Старая сцвярджальна кіўнула галавой.

— Добра... так-так... я не збіраюся быць даносчыкам. Хачу толькі ведаць, ці выходзілі вы разам. Мне няважна, са спальні ці не. Але ці не здаецца вам, сенатар, крыху дзіўным, што вы пратэставалі супроць вымагання і спрачаліся не дзе-небудзь, а ў спальні?

— Як гэта не здаецца дзіўным, але было так.

— Сусану забіў чалавек, — сказаў я, — які быў з ёю ў інтымных адносінах... Больш таго, усё гаворыць за тое, што яна некага чакала... Вы не ведаеце яшчэ каго з яе палюбоўнікаў?

— У Сусаны было некалькі, — адказала Каіта. — Але дома яе наведвалі нямногія: Рамераль, Падуа, Батлер, палкоўнік па імені Салінас, які даўно не прыходзіў, бо яго перавялі ў правінцыю Арыентэ, і Верцьентэс, гаспадар рулеткі.

— Сенатар падвёз вас дадому і паехаў?

— Не. Мы наведалі некаторых з маіх аднавяскоўцаў, якія хацелі пабачыць свайго кандыдата.

— А якой гадзіне прыблізна скончыўся апошні візіт?

— Пасля дзевяці вечара.

— І ўвесь гэты час вы былі разам з сенатарам?

— Так.

— Чаму вы хлусілі паліцыі, няправільна назваўшы час, калі Рамераль пакінуў дом Сусаны?

— Я заблыталася.

Я ўзняў бровы і ўсміхнуўся:

— Вельмі дзіўна: вас не так лёгка заблытаць.

— Але так было, — рашуча пацвердзіла Каіта. — Паліцыя закідала мяне пытаннямі, і я не ведала, што гаварыць. Сенатар прасіў мяне не называць яго, бо гэта магло пашкодзіць яго палітычнай кар'еры. Паліцыя хацела ведаць, хто ў той дзень быў у Сусаны, і толькі Рамераль пабываў там перад прыходам сенатара. А чаму ён не мог забіць сеньёру? Можа, хаваўся недзе і вярнуўся пасля таго, як мы пайшлі. Чаму ж ён даў мне дзвесце песа, каб я не гаварыла, што бачыла яго ў той дзень у доме Сусаны?

— Магчыма, па той жа самай прычыне, што і сенатар: баіцца скандалу.

— Гэта ён так кажа.

— І таму, што ён не сенатар, вы яму не верыце?

— Арэс... — пачуўся голас Рамірэса.

— Так, так, сенатар, добра, я разумею. Дзякую, Каіта...

Перш чым падняцца з крэсла, Каіта вачамі папрасіла дазволу ў сенатара, потым выйшла з кабінета.

— Цяпер задаволены, Арэс?

— Не зусім, сенатар. Напрыклад: чаму яна працавала ў Сусаны?

— Сусана папрасіла мяне парэкамендаваць ёй сціплую жанчыну. Калі Каіта страціла месца, я ўзяў яе да сябе. Вельмі добрая служанка.

— У вас шмат падстаў сцвярджаць гэта. Для служанкі Каіта даволі кемная... Ну, думаю, мне час ужо ісці.

Сенатар крануўся кнопкі званка. Разам з Томасам у дзвярах з'явіліся малойчыкі, якія суправаджалі нас у лімузіне.

— Вы не зможаце выйсці адсюль, Арэс, пакуль мы не будзем ведаць вашых намераў. Як я ўжо сказаў, не магу дапусціць, каб імя маё было ўблытана ў гэтае скандальнае забойства. Я не збіраюся ўжываць супраць вас сілу... калі вы толькі, вядома, не пакінеце мне іншай альтэрнатывы.

Я зноў сеў і скрыжаваў рукі на грудзях.

— Гэтага рабіць я вам не раю, — сказаў я.

Вочкі Рамірэса зрабіліся зусім маленькія.

— Таму не прымушайце мяне, Арэс, — працадзіў ён скрозь зубы. — Што вам да гэтай Сусаны? Нічога! Я думаю, вам няважна, якая рука дае вам грошы, абы яны не былі фальшывыя. Давайце заключым дагавор. Вы шукаеце забойцу, і мне на гэта напляваць. Толькі не ўмешвайце маё імя. Вось, трымайце.

— Вы, здаецца, забылі, — сказаў я, засоўваючы грошы ў кішэню, — што прэса змясціла пэўны каментарый, які датычыцца вас.

— Якраз гэтым мы цяпер займаемся, — сенатар ашчэрыўся цынічнай усмешкай.

— Ясна, — прамармытаў я, — у нас усё прадаецца... Хай мне аддадуць пісталет. Мне час ісці.

— І... я веру вашаму слову.

— Калі не вы забілі яе, я слова стрымаю, але запомніце: трупамі я не гандлюю.

Сенатар задаволена пацёр рукі.

— Вярніце яму пісталет, Томас, — загадаў ён.

Томас аддаў мне мой люгер, і я праверыў патроны.

— Падвязіце мяне ў вёску — там мая машына, — папрасіў я.

— Яна ўжо тут, — сказаў Томас.

— Вось гэта абслугоўванне! — пахваліў я. — Цудоўнейшае!

Праз гадзіну я спыніў машыну каля асабняка сенатара на Пятай Авенідзе. Маладая служанка папрасіла мяне пачакаць у прасторнай гасцінай і пайшла клікаць сеньярыту. Праз некалькі мінут пачуўся звонкі, вясёлы голас Гленды:

— Ах, Арэс! — Яе простае ўбранне падкрэслівала чароўнасць стройнай постаці.

Я падняўся з крэсла і таксама радасна ёй усміхнуўся.

— Які злы дух прывёў вас сюды? — Твар Гленды смешна скрывіўся.

— Чаму абавязкова злы?

— Не ведаю. У вас такая слава... Сядайце.

— Справа ясная: я прыйшоў таму, што тут можна пацешыць вока самай чароўнай дзяўчынай у Гаване...

— Проста вы згараеце ад нецярплівасці даведацца пра вынікі маёй праверкі.

— Прабачце, я зусім забыўся на тое, што вы вывучаеце псіхалогію... ці нешта накшталт гэтага. Спадзяюся, у вас не было непрыемнасцей?

— Ніякіх. Расказ Падуа праўдзівы. За выключэннем адной дэталі, якую я не змагла праверыць, усё астатняе — чыстая праўда. Вядома, я не ведаю, ці даваў ён грошы Сусане для ўдзелу ва аўкцыёне. Але карціну ён сапраўды купіў у Францыі ў якасці вясельнага падарунка жонцы, а яна ахвяравала яе потым царкве. Айцец Ісмаэль, адзін з арганізатараў аўкцыёну, цвёрда запэўніў мяне ў гэтым.

— А што вы мелі на ўвазе, калі сказалі: «за выключэннем адной дэталі»? Якой?

— Ні ў кога з тых, з кім я размаўляла, не ўзнікала нават і ценю падазрэння, што карціна несапраўдная.

— Значыць, расказу Падуа можна паверыць?

— Я, напрыклад, веру!

— Вялікае дзякуй. Вы аказалі мне вялікую паслугу.

Гленда праводзіла мяне да дзвярэй, і там задала пытанне, якое, напэўна, увесь час было ў яе на языку:

— Арэс, не вы ўкралі карціну, не?

— Што вы! Вядома, не! — усклікнуў я. — Няўжо ў мяне твар злодзея?

Каб канчаткова праверыць алібі сенатара, я зноў паехаў у вёску Каіты. Гаварыў шмат з кім з яе аднавяскоўцаў. Усе пацвердзілі: прыблізна ў той час, калі забілі Сусану, сенатар Рамірэс агітаваў іх галасаваць за яго на выбарах у сенат. Значыць, трэба выкрасліць сенатара са спісу магчымых забойцаў.

Каля дзесяці вечара я прыйшоў да сябе ў кантору. Неўзабаве зазваніў тэлефон. Я ўзяў трубку і пачуў скажоны, глухі голас — відаць, гаварылі праз класічную хустачку: «Калі не пакінеце займацца справай Сусаны, вам — смерць. Тэрмін канчаецца заўтра». Паклаўшы трубку, я разваліўся ў крэсле і глыбока задумаўся. Раптам ніць маіх думак перарваў грымотны стрэл. Не паспеў я апамятацца, як у калідоры грымнулі яшчэ два стрэлы. Я схапіў люгер і выскачыў у пакой для чакання якраз у той момант, калі спружынныя дзверы з сілай расчыніліся і туды ўляцеў Верцьентэс. Ён хацеў нешта сказаць, але з рота хлынула кроў, і ён, як мёртвы, паваліўся на падлогу.

Я пераскочыў цераз цела і кінуўся ў калідор—там нікога не было, але лямпачка на кабіне ліфта, які апускаўся, падказала мне, дзе забойца. Я панёсся ўніз па лесвіцы і праз імгненне апынуўся на першым паверсе. Аднак кабіна апусцілася ў цокальны паверх. Я зразумеў намеры забойцы: выйсці праз галоўны пад'езд было небяспечна, і ён, напэўна, зрабіў тое ж, што і я той ноччу, калі хацеў захапіць знянацку карліка, які цікаваў за вокнамі майго кабінета. Шанцы былі супраць мяне, але можна было паспрабаваць адрэзаць яму шлях, калі ён выйдзе з суседняга будынка. З пісталетам у руцэ я пабег па тратуары, не зважаючы на прахожых, якія спалохана шарахаліся ў бакі. Але я спазніўся: маленькі чалавечак збіў з ног нейкую жанчыну і памчаўся да машыны, якая стаяла на 25-ай вуліцы. Калі ён дабег да яе, гнацца за ім не было ўжо сэнсу.

(Працяг у наступным нумары).

ТУДЭМА—СЮДЭМА...

АЗБУКА ЖЫЦЦЯ

Часам, каб зразумець сябе, дастаткова глытка вады.

●

Баяць байкі — гэта не значыць сцвярджаць, што сапраўды быў вялікі патоп.

●

Калі б смяяліся толькі са смешнага, то як бы збяднеў смех!

●

Памерці—гэта неабавязкова, каб цябе пахавалі на могілках.

●

«У мне сабачае жыццё», — скардзіўся кот, каб мець выгляд арыгінала.

●

Воўк часта проста прыкідваецца, што не разумее зайца.

●

Есць жа такія: баяцца навальніцы больш за ўсё зімой.

М. МІНЧАНКА.

ДЗІВАК-ЧАЛАВЕК...



Мал. Н. ДОРАШ.

КАРОТКАЙ ЧАРГОЙ

— Чаму вы хочаце быць артысткай? — запыталі абітурыентку. — У вас жа няма таленту.

— Нічога, — супакоіла яна. — Будзе дыплом — з талентам знойдзецца муж.

●

На пытанне, чаму яна хоча працаваць менавіта ў судзе, адказала: — Я тут чатыры разы разводзілася.

●

У Драздоў вакансія: няма выхавацельніцы ў дзіцячы сад. Раілі Дзятліху: дзелавая, прыгожая, клапатлівая.

Прызначылі Зязюлю. Варона рэкамендавала.

●

— У мяне трэці муж, але мы з ім жывём душа ў душу.

— І даўно жывяце?

— Але. Трэці дзень.

А. ПЕРАГУД.

Георгій ЮРЧАНКА

БЯСШКОДНАЕ ПЕРАЎТВАРЭННЕ

Я — кола.
Пятрусь МАКАЛЬ.

Я быў Макалём і паэтам.
— Пятру-у-усь! — мяне клікала жонка.
А сёння качуся па свету —
Мільгаюць асінкі, сасонкі.
Прыемна, калі па асфальту.
А там, дзе выбоінам цесна,
Такое вырабіш сальта —
Шышак насядзе балесных.
Калі качуся па бруку,
Па выбітай камяніцы,
На ўсю аколіцу грукат,
Дранцвеюць вобад і спіцы.
Качуся. Хачу ці нехаць.
І шмат хто — бачу — цаляе,
Каб без чаргі пад'ехаць
Шпарчэй да зямнога раю.
Уссесці гатовы ўсякі,
Праркацца да большай місы —
Хто ў мастакі, хто ў пісакі,
А хто да гары.
Да Лысай!
Я — кола. Грымлю, кручуся.
Ды помніце: тую мінуту,
Калі я ў паэты вярнуся,
Вам стане і пеша, і крута.

ПРАГА

І толькі змеціш ноччу:
У белай паласе —
Наводліў крэўны почырк
Па шыбе паласне.

Юрка ГОЛУБ.

Алыча успамінаў,
Развагі баабаб.
Кляновыя галіны
Як перысты усхрап.

Забуду нешанцунак
У оне лімонных мук.
Мне стаў нібы ратунак
Вяровак важкі пук.

Я словы як дзічыну
У крушынавай нудзе
Разбэрсанай ляйчынай
Кілзаю дзень у дзень.

Індычыць ранак волле
Праз сорак галасоў.
Не выпушчу на волю
Ніводнага са слоў.

У празе сэрца млее.
Не кідаю склімець,
Бо хочацца хоць неяк
Сябе паразумець.

ВОЖЫК У ТУМАНЕ

Сёння я — у тумане. Карчом прасядзеў за сталом увесь дзень, у скронях коліць ад думак, у страўніку, як у пустой бочцы, — гудзе і вурчыць ад галадухі. Абедаць так і не сабраўся. Нават гэта свісцёлка Верабейкіна, баба ў джынсах, кпіць уздумала: «Ціха, Вожык думае (Вожык — маё прозвішча). Быць новаму вынаходніцтву!»

Абы языком мянціць. Што вынаходніцтва! Сеў і думай. Вынаходзь. У нас усе нешта малююць, нешта шукаюць...

У мяне — туман. І напусціў яго новы шэф. Ён яшчэ, канечне, не прыцёрся — мо з тыдзень працуе, таму многага не ведае. Ён думае, што ў нас, як усюды. Так, ды не так.

Але па парадачку. Толькі, значыцца, прыйшоў я на работу, па звычцы недзе а палове дзесятай (мы, праўда, пачынаем працаваць у дзевяць), як Дзядкоў — худы, з голым чэрапам суб'ект, адразу ашчэрыўся і гэтак здзекліва гаворыць:

— Цябе, Вожык, новы шэф выклікаў. Хоча, відаць, параіцца.

Успомніў жа. Сапраўды, былы начальнік аддзела Іван Іванавіч заўсёды так гаварыў: «Зайдзі, Вожык, параіцца трэба». Ну і што? Раіліся, рашалі — адна галава добра...

Ну, значыцца, заходжу. Сядзіць новы, нават галавы не павярнуў у мой бок — зачытаўся, паперкі нейкія вывучае.

Адклаў ён паперы і пытаецца:

— Над чым працуеце?

Аб гэтым я магу паўдня гаварыць, толькі слухай.

Слухаў ён, слухаў, спыніў.

— Напішыце мне на паперы, што зроблена, што трэба зрабіць, калі думаеце закончыць. На паўтары, дзвюх старонках.

Нічога сабе. Справаздачы мы ўмелі пісаць. І на трыццаці, і на пяцідзесяці старонках. Так маглі закруціць, што і самі потым канцы з канцамі не звядзілі. Але на дзвюх... Усё-такі ківаю галавой — разумею, будзе зроблена. Асцярожна пытаюся: — Прыжыліся на новым месцы, Пётр Пятровіч? Можа, што перашкаджае? Ці якія цяжкасці ўзніклі?

Паглядзеў ён на мяне — позірк цяжкі, учэпісты, падалося, што трапіў у клешчы васьміногa, — адказаў, не адводзячы вачэй:

— Прыжыўся, — і працягвае мне нейкую паперку.

Я адразу пазнаў сваю заяву наконт санаторыя. Падаваў яшчэ Івану Іванавічу. Не паспеў, відаць, бедалага, даць ёй ход. Вельмі хуценька яго...

Бяру сваю заяву, а ў галаве думкі карагодам. Крымінальнага нічога ў гэтым няма. Не хворы? Дык хіба ж туды хворыя едуць? Хворым трэба па бальніцах бегаць, а не ў санаторыях гуляць.

— Чытайце, — гаворыць шэф.

Быццам ніколі сам чужых заяў не чытаў.

«Заява! — гучна пачаў я. — Начальніку аддзела Івану Іванавічу Пяцелькіну. Улічваючы Ваш штодзённы бацькоўскі клопат аб сваіх падначаленых, я прашу Вашага дазволу ў ліпені месяцы выехаць мне ў санаторый»...

Кінуў позірк на шэфа — сядзіць, маўчыць. Як статуя. Ну і сядзі, думаю, набірайся кіраўнічага вопыту. Чытаю далей:

— Апошнім часам адчуваецца ў аддзеле вытворчы і маральны разлад. Вельмі крыўдна, калі бачыш, як Дзядкоў працоўны дзень пачынае з таго, што абзывае вас самымі апошнімі словамі. Нават анекдоты складае. Напрыклад, пра асла, якога паставілі кіраваць салаўіным хорам. Знайшоўся мне салавей!.. Канапелька, гэты непрызнаны геній, як нітка цягнецца за Дзядковым. Той гаўкае, а гэты разносіць па ўсіх закутках інстытута... У Верабейкінай свае клопаты — толькі і ведае, што на Піваварава зіркае. Зіх-зіх, зіх-зіх, ян бліскавіца, і ўсё праз мой стол. У аддзеле — шэпчуцца, у калідоры — за ручкі трымаюцца, у сталоўцы — сядзяць радком. А ў Піваварава ж другая жонка. Яны збіраюцца разам махнуць на поўдзень і таксама ў ліпені... Кашальноў або дрэмле, або дэтэктывы чытае. Гаворыць, што калі шэф на пуп не бярэ, дык яму і сам бог даруе... У Мяцёлкінай сын разводзіцца. Гавораць, што сама Мяцёлкіна нявестку поедам есць... Сыраежкіна пагульвае тайком ад мужа... Ціханюк маўчыць да адзінаццаці, потым бяжыць у гастраном, вяртаецца і пачынае гаварыць доўга і з кожным. І заікаецца... Як жа тут працаваць? Якая тут можа быць аддача? Адзін б'ешся, як рыба аб лёд... Зыходзячы з вышэй сказанага, я, паважаны Іван Іванавіч, вельмі спадзяюся на Вашу дабрату. Дата. Подпіс».

Я асцярожна і вельмі ветліва паклаў паперку на край стала, паглядзеў на шэфа. Той сумна спытаўся:

— Значыць, заява? А чаму такая доўгая?

— Дадатковая інфармацыя, Пётр Пятровіч.

Ах, наіўная душа, не зразумеў! Іван Іванавіч усё на ляту хапаў, нават не гледзячы, як кажаны ноччу матылькоў розных там хапаюць. Бывала, выкліча і гаворыць: «Пішы, Вожык, заяву на дапамогу». Я і пісаў, таксама з дадатковай інфармацыяй, і замест дваццаці атрымліваў пяцьдзесят рублёў.

А вось гэты не зразумеў. Гаворыць, што так справа не пойдзе. А як? Яно, канечне, у кожнага кіраўніка свой стыль, які трэба зразумець, асэнсаваць. Я і запэўніў яго, што паспрабую знайсці іншую форму, толькі трэба падумаць, прыгледзецца.

— Ідзі думай, — сказаў шэф. Памаўчаў і дадаў. — А заяву, увогуле, вы напішыце. Так лепш будзе...

Быццам я сам не ведаю, што так лепш будзе. Толькі ж трэба неяк, ну хоць бы намякнуць, а то... Напусціў туману і адправіў.

Хведар ПЕУНІК.

ДЗІВАК-ЧАЛАВЕК...

Мал. М. САЎЧАНКІ.

ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

ШТУРМАЎШЧЫНА — атака на прэміяльны фонд.
СПІРЫТУС ВІНІ — універсальны растваральнік рэпутацыі.
ПАДХАЛІМАЖ — маральны хабар.
ЭПІГРАФ — лыжка мёду ў бочцы дзёгцю.
КРЫТЫК — чалавек, які прыпісвае ўсім свае акуляры.
МАЎЧАННЕ — самая кароткая фраза.

Р. РУМКО.

МАСЛЯК — бутэрброд.
БРЫЧКА — жарабя.
СІВУХА — карова.
ПАДАНЕЦ — нявопытны фігурыст.
АФІЦЫЯНТ — чалавек, які размаўляе афіцыйным тонам.
ШПАКЛЕЎКА — кармушка.
СОСКА — сігнал небяспекі.
ЦЫРАТА — атэлье па рамонце адзення.

М. АТАЕВА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 / 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 АТ 14708.

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела грамадска-палітычнага жыцця — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-19-65, аддзела інфармацыі, пісем і масавай работы — 33-22-04, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь АСІПЕНКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (адказны сакратар), Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Юлія ЧУРКО.